Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

1 ВЕРАСНЯ 2009 г.
АЎТОРАК
№ 163
(26521)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Віншаванне Прэзідэнта Беларусі з Днём ведаў

Навучэнцам, студэнтам, аспірантам, настаўнікам, навукова-педагагічным работнікам

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з Днём ведаў.

Першае верасня напаўняе цудоўным адчуваннем свята сэрцы соцень тысяч людзей — ад школьніка да сівога прафесара, аб'яднаных няўтольнай прагай пазнання і радасцю творчасці. Перад вамі раскрываецца асаблівы свет, напоўнены скарбамі мудрасці, які дае невычэрпныя магчымасці для новых адкрыццяў і духоўнага росту.

Беларусь па праве ганарыцца высокай якасцю айчыннай адукацыі, якая з'яўляецца найвялікшым народным здабыткам. Палітыка, што праводзіцца ў нашай краіне, гарантуе ўсім юным грамадзянам роўныя ўмовы для авалодання ведамі, рэалізацыі здольнасцяў і грамадзянскага станаўлення.

Дарагія навучэнцы, студэнты і аспіранты! Настойліва заваёўвайце вышыні навукі, цаніце дружбу і ўзаемавыручку. Няхай гэты навучальны год прынясе вам удачу і наблізіць да ажыццяўлення запаветнай мары.

Паважаныя настаўнікі і выкладчыкі! Захоўвайце вернасць свайму святому прызванню. Няхай у вашых сэрцах заўсёды гарыць агонь любві да вучняў, служэння ідэалам асветы і дабра.

Жадаю вам моцнага здароўя, поспехаў у вучобе і працы, шчасця і дабрабыту.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Аляксандр Лукашэнка даручыў распрацаваць праграму па развіцці Прыпяцкага рэгіёну

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў распрацаваць у найбліжэйшы час праграму па развіцці Прыпяцкага рэгіёну. Такую задачу паставіў кіраўнік дзяржавы, наведваючы з рабочай паездкай Гомельскую вобласць.

«Душа баліць, што самы прыгожы край мала што дае людзям», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Увагу неабходна ўдзяліць не толькі развіццю турызму, але і аграрнага сектара. «Тут павінен быць задзейнічаны кожны метр, мы павінны ўзяць ад гэтай зямлі максімальна, але пры гэтым не нанесці ўрону навакольнаму асяроддзю», — лічыць Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэты рэгіён па-свойму ўнікальны, аднак яго трэба акультурыць. «Узяць хоць раку Прыпяць. 575 км — такога цуда ў свеце больш няма. Гэта своеасаблівая беларуская Амазонка. У свеце рэдка знойдзеш такі кавалак зямлі, дзе такое чыстае паветра, дзе можна так свабодна дыхаць», — адзначыў Прэзідэнт.

«Давайце возьмем з гэтай зямлі ўсё магчымае. Мы павінны ва ўсім харастве прадставіць свету палешукоў», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Тут на кожным кавалачку гаворыць або гісторыя, або прырода».

У Гомельскай вобласці ўжо 40 гадоў функцыянуе Прыпяцкі запаведнік. Мэтай яго стварэння было захаванне ў некранутым стане тыповага для беларускага Палесся ландшафтна-гідралагічнага комплексу, захаванне і аднаўленне рэдкіх і знікаючых відаў жывёл і раслін, вывучэнне змяненняў у прыродзе, звязаных з шырокім вядзеннем меліярацыі і выяўленне наступстваў актыўнага ўмяшання чалавека ў прыроду. У 1996 годзе запаведнік быў рэарганізаваны ў нацыянальны парк «Прыпяцкі». Штогод яго наведваюць больш як 10 тыс. турыстаў. За 7 месяцаў 2009 года тут аказана турысцка-экскурсійных паслуг на Br1204,5 млн, што ў 1,7 раза больш, чым за аналагічны перыяд 2008 года. Цяпер тут завяршаецца стварэнне ўнікальнага не толькі ў Беларусі, але і ў Еўропе экалагічнага турыстычнага аб'екта — «Прыпяцкае сафары», дзе на плошчы 4 тыс. га створаны ўнікальныя ўмовы для ўтрымання і дэманстрацыі жывёл у прыродных умовах. Тут таксама створана ўся інфраструктура для развіцця воднага турызму.

У Гомельскай вобласці паспяхова працуе турыстычны маршрут «Залатое кальцо Гомельшчыны». Працягласць маршруту складае 820 км і ахоплівае 9 населеных пунктаў. Турыстам прапануецца 16 экскурсійных праграм. Як было даложана кіраўніку дзяржавы, сёння вядуцца работы па ўключэнні ў гэты маршрут Юравічаў — першай стаянкі чалавека на тэрыторыі Беларусі. У мінулым годзе на гэтым маршруце было абслужана 20 тыс. чалавек, у тым ліку 2 тыс. замежных турыстаў.

Вялікая ўвага ў вобласці ўдзяляецца таксама развіццю аграэкатурызму. Так, за тры гады колькасць аграэкасядзібаў выросла ў 10 разоў. На іх узвядзенне на льготных умовах выдаюцца крэдыты «Белагропрамбанка». Да 2010 года плануецца пабудаваць яшчэ 43. У 2008-2009 гадах такі від адпачынку прыцягнуў 3,5 тыс. турыстаў.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў КДК і Адміністрацыі Прэзідэнта жорстка пракантраляваць і разабрацца з пытаннямі закупак зернесушылак для гаспадарак у рэгіёнах краіны.

Кіраўнік дзяржавы выказаў рынцыповае нездавальненне тым фактам, што рэгіянальныя ўлады замест таго, каб закупляць зернесушыльную тэхніку, выраблену з максімальнай доляй айчынных камплектуючых, купляюць зернесушылкі са значна большай удзельнай вагой замежнага абсталявання, і такім чынам траціцца валюта. «Я даручаю КДК вывернуць навыварат гэта пытанне», — сказаў Прэзідэнт.

Даручэнне прагучала, калі старшыня Савета дырэктараў ААТ «Амкадор» Аляксандр Шакуцін далажыў Прэзідэнту аб не зусім правільных з яго пункту гледжання ўмовах тэндэраў на закупку зернесушылак. «Амкадор» вырабляе зернесушылкі з 95 працэнтаў айчынных камплектуючых, з больш высокімі паказчыкамі якасці, чым у іншых прадпрыемстваў Беларусі, якія займаюцца аналагічнай вытворчасцю, але тэндар дзеляць на дзве часткі, аддаючы пэўную квоту закупак тым прадпрыемствам, зернесушылкі якіх маюць значна большую ўдзельную вагу замежных камплектуючых, растлумачыў ён.

«Трэба пільна паглядзець на ўсе гэтыя дзяржзаказы па тэхніцы, па сушылках і па іншым», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Што мы заахвочваем? — абурыўся беларускі лідар. — Неразумная канкурэнцыя: аднолькавая цана, а мы бяром імпартнае і змагаемся. Забаранілі на запраўках гандляваць палівам за валюту... Ды вось жа, мы яе вывозім на вачах!» Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што цалкам абсурдна траціць сродкі на закупку імпартнага абсталявання, калі ўжо сёння «Амкадор» гатоў з большай беларускай лакалізацыяй вырабляць тэхніку, якая не ўступае замежным аналагам. Звярнуўшыся да віцэ-прэм'ера Івана Бамбізы Аляксандр Лукашэнка заявіў: «Вы прымусьце працаваць іншыя прадпрыемствы так, як «Амкадор» працуе».

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы запатрабаваў у тэрміновым парадку вырашаць пытанні з вытворчасцю якасных камбайнаў для ўборкі рапсу. «Едзьце на «Гомсельмаш» і рабіце нармальныя камбайны для ўборкі рапсу. А то рапс убіраць няма чым. Не дай бог, я ў будучым годзе ўбачу такую карціну з уборкай рапсу, як цяпер», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас сваёй рабочай паездкі па Гомельскай вобласці даручыў правесці комплексную меліярацыю зямель Беларускага Палесся за будучую пяцігодку.

«За будучую пяцігодку нам трэба аднавіць забалочаныя землі, за выключэннем, бадай, толькі самых непраходных», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым беларускі лідар падкрэсліў, што меліярацыю трэба ажыццяўляць правільна, а не так, як у савецкія часы, калі меліяраваныя землі засявалі прапашнымі культурамі і такім чынам разбуралі глебу. «Гэта будзе добры, даходны праект, — адзначыў Прэзідэнт. — Не будзем забываць, што попыт на прадукты харчавання ў свеце сёння захоўваецца. Больш як мільярд людзей галадаюць».

Звяртаючыся да губернатара Гомельскай вобласці Аляксандра Якабсона, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што «1 млн тон збожжа — гэта не ваш узровень, трэба збіраць 1,5 млн тон збожжавых і плюс паўмільёна кукурузы». А гаворачы аб уладкаванні аграгарадкоў і прыводзячы як прыклад наведваемы аграгарадок Ляскавічы, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «У нас засталася адна пяцігодка, каб усю краіну зрабіць у асноўным такой, гэта значыць аграгарадкі па ўсёй Беларусі павінны быць менавіта такімі, зручнымі для людзей».

«Палешукі — цывілізаваныя, працаздольныя людзі, ядро нашай нацыі, і мы павінны іх дастойна прадставіць усяму свету, яны гэтага заслугоўваюць», — адзначыў Прэзідэнт. Ён нагадаў, як на заранку свайго прэзідэнцтва, наведваючы гэтыя раёны, сутыкнуўся з каласальнай беднасцю насельніцтва, а сёння гэты край дэманструе вельмі ўпэўненыя сацыяльна-эканамічныя паказчыкі. «Тут прыклад таго, як павінны развіваць Прыпяцкі рэгіён», — яшчэ раз падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым беларускі лідар перасцярог ад штучнага ўзбуйнення гаспадарак. «Не трэба штучна ствараць буйныя гаспадаркі, аб'ядноўваючы больш дробныя, такая неабходнасць не наспела. А то мы паўторым памылку савецкіх часоў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

БЕЛТА.

Беларусь спадзяецца на хутчэйшую рэалізацыю пагаднення з Кітаем па здзелцы панв

Беларусь спадзяецца на хутчэйшую практычную рэалізацыю пагаднення з Кітаем па абмене нацыянальнымі валютамі (панв). Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы з віцэ-прэм'ерам Дзяржаўнага савета КНР, членам Палітбюро ЦК КПК Хуэй Лян'юем, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Сумесна з Кітаем Беларусь працуе над праектам мадэрнізацыі цэментнай і энергетычнай галін. Створана сумеснае прадпрыемства па зборцы электрабытавой тэхнікі «Гарызонт-Мідэа». У Кітаі дзейнічае сумеснае прадпрыемства па зборцы колавых цягачоў «Санцзян-Волат». Рэалізуюцца ў Кітаі новыя праекты па стварэнні СП па зборцы кар'ерных самазвалаў «БелАЗ», трактароў «Беларус», камбайнаў «Гомсельмаш». У сваю чаргу віцэ-прэм'ер Дзяржсавета Хуэй Лян'юй падкрэсліў вялікі інтарэс Кітая да супрацоўніцтва з Беларуссю.

У «АДУКАЦЫІ» ЖАНОЧЫ ТВАР

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Друкаваная прадукцыя Мінскай крамы «Адукацыя» нацыянальнага інстытута адукацыі на пачатку навучальнага года асабліва запатрабаваная сярод выкладчыкаў гарадскіх і вясковых школ.

Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні родным і блізкім беларускіх лётчыкаў, якія загінулі на авіясалоне ў Польшчы

На авіясалоне ў польскім горадзе Радам у ходзе паказальных палётаў пацярпеў крушэнне самалёт беларускіх ВПС і ППА Су-27УБ. Ім кіравалі пілоты вышэйшай катэгорыі прафесійнай падрыхтоўкі лётчыкі-снайперы палкоўнікі Аляксандр Марфіцкі і Аляксандр Жураўлевіч.

Паводле папярэдняй версіі, прычынай катастрофы стала пападанне птушкі ў паветразаборнік рухавіка знішчальніка. Самалёт пачаў падаць на населены пункт і наведвальнікаў авіясалона. Разумеючы небяспеку страшнай трагедыі, беларускія лётчыкі змаглі адвесці падаючы знішчальнік убок. Аднак з-за вельмі малой вышыні манеўру часу для таго, каб катапультавацца і выратавацца самім, ім не хапіла.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні родным і блізкім пілотаў, якія цаной свайго жыцця прадухілілі шматлікія чалавечыя ахвяры. Аб гэтым **БЕЛТА** паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Для расследавання катастрофы створана сумесная беларуска-польская камісія.

Кіраўнік дзяржавы даручыў Міністэрству абароны Беларусі аказаць усю неабходную дапамогу сем'ям Аляксандра Марфіцкага і Аляксандра Жураўлевіча.

Беларуская ваенная пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу па факце крушэння Су-27 у Польшчы

Аб гэтым паведамілі ў пракуратуры.

Справа ўзбуджана па ч. 2 арт. 465 КК «Парушэнне правілаў палётаў або падрыхтоўкі да іх, што прывяло да смерці дзвюх або больш асобаў».

Беларускай ваеннай пракуратурай створана следчая група, якую ўзначаліў намеснік Беларускага ваеннага пракурора палкоўнік юстыцыі Сяргей Шчома.

«Справа расследуецца. Ёсць версіі, якія правяраюцца. У складзе беларускай часткі сумеснай беларуска-польскай камісіі выязджае ў Польшчу наш работнік. Ужо адабраны дакументы па абслугоўванні самалёта ў Беларусі, яго рамонце, дапытваюцца службовыя асобы», — адзначылі ў пракуратуры.

У пракуратуры таксама паведамілі, што паводле інфармацыі польскага боку, абедзве чорныя скрыні і целы загінулых лётчыкаў знойдзены.

БЕЛТА.

ТРАГЕДЫЯ Ў НЕБЕ ПОЛЬШЧЫ

У польскім горадзе Радам праходзіла авіяшоу, у якім узяў удзел і беларускі экіпаж знішчальніка СУ-27: намеснік камандуючага Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання Ваенна-паветраных Сілаў і войскаў ППА палкоўнік Аляксандр Марфіцкі, а таксама намеснік камандзіра 61-й знішчальнай авіябазы палкоўнік Аляксандр Жураўлевіч.

Аварыя здарылася ў нядзелю а 15-й гадзіне падчас паказальнага выступлення. Праз дзве хвіліны пасля старту наш знішчальнік паспрабаваў выканаць адну з фігур вышэйшага пілатажу, але нечакана пачаў падаць. Самалёт упаў паміж населенымі пунктамі Маковым і Маленчынам — за 100 метраў ад будынкаў. Пілоты стараліся адвесці самалёт ад жылля і, не паспеўшы катапультавацца, загінулі.

Па інфармацыі Міністэрства абароны Беларусі, у паветразаборнік самалёта, магчыма, трапіла птушка.

Я наведаў ваенную часць, у якой служылі пілоты, і пагаварыў з некаторымі афіцэрамі. Палкоўнікі А. Марфіцкі і А. Жураўлевіч былі ваеннымі лётчыкамі-снайперамі. Абодва мелі сем'і, дзяцей. Адным словам, загінулі адны з лепшых ваенных лётчыкаў 61-й авіябазы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Фота прадастаўлена ў воінскай часці.

Колькасць школьнікаў змяншаецца, а колькасць студэнтаў — расце

«Зямля бацькоў — мая зямля» — менавіта гэтай тэме будзе прысвечаны першы ўрок, які пройдзе 1 верасня ва ўсіх беларускіх школах і стане сімвалічным працягам святкавання Года роднай зямлі. У сталіцы пляцоўкамі для правядзення першых урокаў стануць Нацыянальная бібліятэка, спартыўна-культурны комплекс «Мінск-Арэна», Школа прыгажосці, Музей ледавіковых валуноў, дыягнастычны цэнтр 9-й гарадской клінічнай бальніцы, Вышэйшы гаспадарчы суд, цэнтр акеанаграфіі «Адкрыты акіян», мінскі метрапалітэн, а іх гасцямі стануць славутыя пісьменнікі і паэты, мастакі, спартсмены, прадстаўнікі заканадаўчай, выканаўчай і судовай уладаў.

Дарэчы, 1 верасня за парты беларускіх школ сядуць каля аднаго мільёна дзяцей. У першы раз парог школы пераступяць 89 тысяч маленькіх беларусаў — гэта крыху менш, чым у 2008 годзе. Ды і ўвогуле ў параўнанні з папярэднім навучальным годам кантынгент беларускіх школьнікаў скарачэцца на 50 тысяч чалавек. Усяго ў новым навучальным годзе ў краіне будуць функцыянаваць больш як 9 тысяч устаноў адукацыі. Дзякуючы развіццю інтэграванага навучання ў нашай краіне закрыліся 4 спецыяльныя школы-інтэрнаты, а таксама былі ліквідаваныя 5 дзіцячых дамоў і школ-інтэрнатаў — у сувязі з развіццём сямейных формаў выхавання. Яшчэ 7 школ-інтэрнатаў для дзяцей-сірот былі рэарганізаваныя ў дзіцячыя дамы і дзіцячыя вёскі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У ПЕРШЫ ТЫДЗЕНЬ ВЕРАСНЯ ЗАХАВАЕЦЦА ЛЕТНЯЕ НАДВОР'Е

Да выхадных у Беларусі ўсталюецца цёплае і сонечнае надвор'е, калі тэмпература ў гэтыя дні будзе ажно на 2—4 градусы вышэй за кліматычную норму першай дэкады верасня, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

Надвор'е з аўторка да пятніцы будзе вызначацца антыцыклонам з поўдня Еўропы, таму ападкаў не будзе. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Уначы ў аўторак і сераду 6—12, у аўторак удзень 19—25 градусаў. Ужо ў сераду стане яшчэ цяплей — удзень 21—27. Уначы ў чацвер 9—15, удзень 23—28. У пятніцу прыгрэе яшчэ мацней, калі ўдзень чакаецца 22—28, па поўдні краіны ажно да 30, уначы — 10—17. У суботу—нядзелю амаль паўсюдна па краіне пройдуць дажджы, месцамі навальніцы. Уначы ў суботу 10—17, удзень 18—25, па паўднёвым усходзе — да 28; уначы ў нядзелю — 8—15, удзень толькі 17—24 цяпла. Паводле доўгатэрміновых прагнозаў, тэмпературны фон верасня будзе прыкладна ў межах нормы, калі сярэднясутачная тэмпература складзе 11—13 градусаў. Ападкаў прагназуецца менш за норму, якая складае 50—71 мм. Дарэчы, 1 верасня ў Мінску будзе сонечна і 23—25. Цудоўнае надвор'е.

Сяргей КУРКАЧ.

РАНЕЙ. АДНАК З НАДБАЎКАЙ

Нарыхтоўка цукровых буракоў сёлета пачалася раней, чым звычайна. Як адзначыла ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» прэс-сакратар канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Ірына Гусева, падобная акалічнасць звязана з меркаваным значным перавышэннем валавога збору гэтай культуры над штодзённай магутнасцю перапрацоўчых прадпрыемстваў.

З улікам нарыхтоўкі ў больш раннія тэрміны і, адпаведна, меншым працэнтам утрымання цукру ў бураках для сельгаспрадпрыемстваў вызначаны надбаўкі да закупачных цэнаў. З 1 па 10 верасня памер такой надбаўкі складзе 20, з 11 па 20 верасня — 10, з 21 па 30 верасня — 5 працэнтаў. Пры гэтым «базавую» закупачную цану вырашана захаваць на ўзроўні мінулага года — 75 тыс. рублёў за тону. Не зменіцца цана і на такую «спадарожную» прадукцыю, як мелес і жамерыны — 69.420 і 2945 рублёў за тону адпаведна. Дарэчы, заўважыла Ірына Гусева, дзякуючы рэканструкцыі і тэхнічнаму пераўзбраенню перапрацоўчых прадпрыемстваў іх агульная магутнасць узрасла. У выніку чакаецца, што на працягу новага сезона 2009—2010 гадоў аб'ём вытворчасці бураковага цукру будзе прынамсі не меншым, чым у сезон папярэдні — 515 тыс. тон. Гэта дазволіць цалкам задаволіць патрэбы ўнутранага рынку, а таксама працаваць на экспарт.

Сяргей ГРЫБ.

Фотафакт

Фота Вольгі ЛАСКІ.

У нядзелю салютнымі росквітамі начнога неба над Лагойшчынай завяршыўся міжнародны фестываль феерверкаў «Навальніца-2009». За тры вечары гэтага грандыёзнага фаершоу ў паветра ўзляцелі болей за 30 тысяч зарадаў. Кожная з сямі піратэхнічных камандаў, якія бралі ўдзел у незвычайным спаборніцтве, запусцілі амаль па пяць тысяч зарадаў.

ГАРЭЎ БЕНЗАВОЗ НА ТРАСЕ

На трасе Полацк — Вільнюс у другой палове дня ў мінулую пятніцу загарэўся бензавоз, які перавазіў 15 тон растваральніку талуол.

Бензавоз «Сканія-143» ехаў з Наваполацка ў Маладзечна. Машына належыць вядомаму наваполацкаму таварыству «Блок». Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным упраўленні МНС, кіроўца спрабаваў зняць акумулятарную батарэю, калі ўспыхнула кабіна, у выніку чаго атрымаў 40 % апёкаў цела і быў дастаўлены ў рэанімацыйнае аддзяленне Глыбоцкай раённай бальніцы. Выратавальнікі здолелі не дапусціць разгерметызацыі цыстэрны. Арыентавана кошт растваральніку складае 40 мільёнаў рублёў.

Фота Віцебскага абласнога упраўлення МНС.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«ТЫ БУДЗЕШ ЖЫЦЬ!»

Дзіцячы анколаг Вольга Алейнікава не стамляецца паўтараць гэта сваім пацыентам

Размаўляць з Вольгай Алейнікавай лёгка і... адначасова надзвычай цяжка. Як чалавек, якому скарыліся нябачныя «механізмы» і найскладанейшыя працэсы жыцця, яна можа дазволіць сабе не прыхарошваць рэальнасць і называць рэчы сваімі імёнамі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як жанчына, якая ўвабрала ў сябе гігабайты чужога болю, яна вельмі эмацыянальна рэагуе на журналісцкія пытанні, якія падаюцца ёй не зусім карэктнымі.

Прафесар Вольга Алейнікава лечыць дзіцячы рак. Лечыць даўно і паспяхова. Настолькі паспяхова, што яе імя афіцыйна прызнана далёка за межамі нашай краіны, а Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай анкалогіі і гематалогіі, які яна ўзначальвае, называюць «цэнтрам Алейнікавай».

...У канцы 80-х уся рэспубліканская дзіцячая анкалогія і гематалогія месцілася ў адным аддзяленні 1-й клінічнай бальніцы, куды і прыйшла на працу пасля заканчэння медінстытута малады спецыяліст Алейнікава. Аддзяленне яе... уразіла. Гэта быў сапраўдны «філіял» морга — там выжывала толькі 10—12 працэнтаў дзяцей, і нават менш.

У Алейнікавай хапіла смеласці выступіць у звышпапулярнай на той час расійскай перадачы «Погляд» і сказаць пра гэта ўслых. Яна не магла больш бачыць, як гінуць дзеці, не хацела мірыцца са станам уласнай бездапаможнасці...

Яе пачулі не толькі ў былым Саюзе, але і ў Франкфурце-на-Майне, куды доктар Алейнікава ў хуткім часе трапіла на стажыроўку. У Германіі выжывала 8 хворых на анкалогію дзяцей з 10, у той час як у нас столькі ж і нават больш паміралі.

Праз тры месяцы яна вярнулася дадому, а яшчэ праз тыдзень узялася лячыць першага маленькага пацыента па новым пратаколе... Ёй не спатрэбілася ніякіх спецыяльных дазволаў, і парогі яна не абівала. «Мы проста ўкаранілі еўрапейскі пратакол лячэння — і ўсё. І дзеці пачалі выжываць».

Яны і цяпер жывуць, у іх падрастаюць свае дзеці...

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Рэпартаж з колаў

ТЭЛЕВІЗАР ДЛЯ МАШКІ І МІКАЛАЯ НІКІФАРАВІЧА

«Звязда» працягвае раздаваць фірмавыя прызы

Што больш прыемна — рабіць падарункі альбо атрымліваць іх? Ва ўсіх па-рознаму. «Звяздоўцы», узяўшы за добрую традыцыю асабіста дастаўляць адрасатам прызы, якія газета рэгулярна разыгрывае па выніках падпісной кампаніі, даўно для сябе вызначыліся: больш прыемна дарыць. А ў працэсе знаёміцца з такімі рознымі, але аднолькава цікавымі і душэўнымі людзьмі: з сябрамі-паштальёнамі, даўнімі падпісчыкамі, старымі і новымі чытачамі... Таму ў чарговую «прызавую» паездку мы збіраліся з добрым настроем і надзеяй на гэтыя знаёмствы. І не памыліліся!

— Падпісчыкаў «Звязды» ў нашым раёне, можа, і нямнога, але затое гэта лічба стабільная: верныя ў вас чытачы, — адзначыла кіраўнік аддзела ідэалагічнай работы Слуцкага райвыканкама Ларыса Дабравольская. — Тым больш прыемна, што аднаму з іх, нашаму земляку **Мікалаю ГАНЧАРЭВІЧУ,** пашчасціла выйграць у падпісной латарэі каляровы тэлевізар.

Папярэдне супрацоўнікі райвыканкама дамовіліся: Мікалай Нікіфаравіч прыедзе з **вёскі Міхейкі,** што амаль у мяжы горада, і атрымае тэлевізар ва ўрачыстай абстаноўцы, на чарговай канферэнцыі педагагічных работнікаў Слуцкага раёна. Аднак напярэдадні, даведаўшыся, перад якой шаноўнай аўдыторыяй давядзецца трымаць слова, наш 79-гадовы прызёр расхваляваўся — ды так, што ў яго моцна прыхапіла спіну і пра паездку не магло быць і гаворкі.

(Заканчэнне на 7-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.09.2009 г. (для б/н разлікаў)	
▲ 1 долар ЗША	2 837,00
▲ 1 еўра	4 051,52
1 латвійскі лат	5 756,90
1 літоўскі літ	1 173,67
1 чэшская крона	159,53
1 польскі злоты	987,92
▼ 1 расійскі рубель	89,10
1 украінская грыўня	335,94

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
Цэнтрабанк РФ	
USD	31,8397
UAH	37,6578
1000 BYR	11,2667
EUR	45,4321

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

«СКУРАНЫ МЯЧ» ПАКАЦІЎСЯ

У апошні дзень лета ў Гомелі прайшло ўрачыстае адкрыццё спаборніцтваў па футболе сярод дзяцей і падлеткаў «Скураны мяч».

Сёлета на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба папярэдне змагаліся ў раённых і абласных этапах 1695 дваровых футбольных камандаў. За перамогу ў фінале ў сярэдняй групе ў Гомелі будуць змагацца 8 камандаў-пераможцаў абласных спаборніцтваў: «Мухавец» (Пружанскі раён), «ПМЦ» (г. Паставы), «Вымпел» (Чыгуначны раён Гомеля), ФОЦ «Прынёманскі» (Акцябрскі раён Гродна), «Агеньчык» (г. Маладзечна), «Азёрны» (Акцябрскі раён Магілёва) і каманды Савецкага раёна і «Партызанскі ФОЦ» Партызанскага раёна Мінска.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Жывёлагадоўчую галіну Беларусі па эфектыўнасці і якасці неабходна вывесці на ўзровень лепшых узораў

На працягу бліжэйшых пяці гадоў жывёлагадоўчая галіна беларускага аграпрама павінна быць выведзена на ўзровень лепшых узораў, якія адпавядаць еўрапейскім стандартам эфектыўнасці і якасці. Такую задачу паставіў 30 жніўня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час рабочай паездкі ў Мінскую вобласць.

На прыкладзе Лагойска і Лагойскага раёна Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з тым, як выконваюцца асноўныя напрамкі дзяржпраграмы развіцця малых і сярэдніх гарадоў, а таксама яго даручэнні па будаўніцтве найноўшых малочнатаварных фермаў.

Кіраўнік дзяржавы наведаў комплекс па вытворчасці малака «Зазер'е» СК «Лагойскі». У 2006 годзе па распараджэнні кіраўніка дзяржавы некалькі адсталых гаспадарак былі аб'яднаны ў сельскагаспадарчы комплекс «Лагойскі», а на працягу наступных двух гадоў былі ажыццёўлены будаўніцтва і рэканструкцыя аб'ектаў вытворчай і сацыяльнай сферыў комплексу. Сёння гэта гаспадарка, якая паспяхова працуе, мае малочнатаварную ферму на 1 тыс. галоў, модульна-блочны цэх па перапрацоўцы малака да 15 тон у суткі, зернесушыльны комплекс з ёмістасцю сховішчаў для збожжа да 9 тыс. тон, ферму па гадоўлі і адкорме 2,5 тыс. свіней у год, кацельню, машынныя двары, аўтазаправачную станцыю, аб'екты сацыяльнай інфраструктуры. У першым паўгоддзі ў СК «Лагойскі» адзначаўся найбольш высокі тэмп росту вытворчасці валавой прадукцыі да адпаведнага перыяду 2008 года.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з работай малочнатаварнага комплексу, дзе прымяняюцца найноўшыя тэхналогіі і абсталяванне пры вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі.

Прэзідэнту было даложана, як выконваюцца раней дадзеныя ім даручэнні па развіцці жывёлагадоўлі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што асноўнай задачай у жывёлагадоўлі сёння з'яўляецца не толькі нарошчванне, але і якаснае паляпшэнне пагалоўя жывёлы. Ён нагадаў, што ў свой час гэтаму было ўдзелена дастаткова ўвагі, цяпер жа, калі няма праблем з рэалізацыяй мяса-малочнай прадукцыі, неабходна павялічваць пагалоўе, не збаўляючы ранейшых тэмпаў. «Спыняцца на дасягнутым нельга. Прадукцыя сельскай гаспадаркі будзе запатрабавана ў свеце. І мы можам атрымаць на гэтым добрыя грошы», — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама дадаў, што паступова неабходна замяшчаць менш прадукцыйныя пароды жывёлы на высокапрадукцыйныя.

Кіраўнік дзяржавы, наведваючы ферму, звярнуў увагу на неабходнасць больш хуткага запаўнення такіх аб'ектаў пагалоўем буйной рагатай жывёлы, каб магутнасці іх выкарыстоўваліся з максімальнай аддачай.

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Сямён Шапіра праінфармаваў Прэзідэнта аб тым, што беларуская сельгаспрадукцыя карыстаецца ўсё большым попытам у свеце. Толькі за апошні тыдзень, напрыклад, у міністэрства паступілі прапановы ад трох фірмаў адносна буйных закупак сухога малака. Размова ідзе аб дзясятках тысяч тон прадукцыі. Акрамя таго, ідуць заяўкі з Расіі, Украіны, Казахстана на набыццё беларускага цукру.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што трэба тэрмінова ўкладваць грошы ў рамонт і рэканструкцыю існуючых памяшканняў, атрымліваць высакаякасную прадукцыю і прадаваць яе.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы даручыў на працягу пяці гадоў вывесці на высокі ўзровень усе малочнатаварныя фермы Беларусі. У кожным раёне неабходна вызначыць прадукцыйныя плошчы, дзе магчыма пабудаваць новыя МТФ. Для іх будаўніцтва таксама трэба вызначыць 3—5 найбольш танных тыпавых праектаў.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «кан'юнктура на сусветным рынку для беларускай сельгаспрадукцыі складваецца добрая, а значыць, і сродкі ў сельскую гаспадарку дзяржавай укладаліся не дарма».

Закранаючы сёлетнюю ўборачную кампанію, Прэзідэнт адзначыў, што ён у цэлым задаволены яе ходам. Уборка ў гаспадарках краіны практычна завершана. Кіраўнік дзяржавы ўказаў на неабходнасць у максімальна сціслыя тэрміны правесці сяўбу азімых, пакуль гэтаму спрыяе надвор'е.

Акрамя таго, надзвычайна важна аказаць дапамогу сялянам у малацьбе збожжа на асабістых падворках. Не засталася без увагі кіраўніка дзяржавы і ўборка з палёў кукурузы і буракоў. У прыватнасці, у гэтым годзе ў Беларусі плануецца атрымаць больш за 4 млн тон цукровых буракоў.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, беларуская сельгаспрадукцыя можа прадавацца не толькі ў Расіі, але і ў іншых краінах постсавецкай прасторы, ва Усходняй Еўропе. «Галоўная цяпер задача — не прадаць танна. Павялічваецца попыт, павінна расці і цана», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што «і ў Англіі, і ў Ізраілі, і ў Польшчы людзі хочуць паспытаць натуральны прадукт без кансервантаў і дабавак, не гаворачы ўжо аб расіянах і ўкраінцах». «Мы можам даць ім гэтыя прадукты», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка закрануў таксама нядаўнюю праблемную сітуацыю з пастаўкамі беларускай малочнай прадукцыі ў Расію. Ён паведаміў, што ў час размовы з Прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым у Сочы кіраўнікі дзяржаў прыйшлі да высновы, што «малочная праблема» ў большай ступені была штучнай. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, прэзідэнты таксама згадзіліся, што абвінавачанні Беларусі ў залішняй дзяржпадтрымцы сельгаспрадпрыемстваў беспадстаўныя.

Агледзеўшы малочнатаварны комплекс, Аляксандр Лукашэнка пабываў у Лагойску. Там ён наведаў гандлёвыя плошчы «Лагойскага пасажа» — самага буйнога і сучаснага комплексу сістэмы спажывакааперацыі ў рэгіёнах. Тут размешчаны прадуктовы супермаркет плошчай 1000 кв.м і магазін «Будмаркет» плошчай 350 кв.м. У гандлёвым комплексе ў шырокім асартыменце прадстаўлена прадукцыя ўсіх айчынных таваравытворцаў. Пры гэтым іх доля ад агульнай колькасці тавараў складае больш за 90 працэнтаў. Тут таксама ўведзена сістэма дысконтных скідак для пакупнікоў. Як было даложана Прэзідэнту, да 2010 года плануецца пабудаваць яшчэ 20 такіх аб'ектаў гандлю ў малых і сярэдніх гарадах.

Асаблівая ўвага была ўдзелена праблеме забеспячэння якасным гандлёвым абслугоўваннем жыхароў вёскі. Прэзідэнт запатрабаваў, каб спажыўкааперацыя забяспечыла якаснымі паслугамі гандлю ўсе без выключэння сельскія населеныя пункты.

Гаворачы ж у цэлым аб развіцці Лагойскага раёна, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што за апошнія гады гэты рэгіён з адсталага стаў паспяховым. За апошнія 4 гады бюджэт раёна вырас у тры разы, пры гэтым значна скараціліся датацыі дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама пагутарыў з жыхарамі Лагойска. Адно з пытанняў, заданых Прэзідэнту, датычылася негатыўнага ўплыву сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу. «Што датычыцца цэнаў, зарплат і іншага, то на нас, вядома ж, аказвае ўплыў крызіс. Зменшыўся попыт на нашу прадукцыю, больш цяжка даводзіцца прадпрыемствам-гігантам, — сказаў Прэзідэнт. — Але, думаю, мы выберамся». Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў цяперашніх умовах трэба ўмець зарабляць грошы. У прыватнасці, неабходна ствараць і развіваць інфраструктуру для прыцягнення ў краіну большай колькасці турыстаў, забяспечваць лепшую якасць і эфектыўнасць аказання транзітных паслуг.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЧАМУ СТАЛІЧНЫЯ ШКОЛЬНІКІ З ПАГАРДАЙ СТАВЯЦЦА ДА РАБОЧЫХ ПРАФЕСІЙ?

Сёлета студэнтамі ВНУ сталі 75 працэнтаў выпускнікоў сталічных школ. Поўная колькасць учарашніх адзінаццацікласнікаў паступілі ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. І тут заканамерна паўстае пытанне, а хто пайшоў атрымліваць рабочыя прафесіі? Не сакрэт, што ў апошнія гады сталічныя прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы камплектуюцца ў многім дзякуючы прыцягненню навучэнцаў з іншых рэгіёнаў краіны. Летась сярод залічаных на першы год навучання колькасць іншагародніх перавысіла 36 працэнтаў. Праблемы прафарыентацыі сталічнай моладзі сталі лейтматывам форуму педагагічных работнікаў сталіцы, які прайшоў у Палацы Рэспублікі напярэдадні новага навучальнага года.

Як сведчыць праведзенае сярод бацькоў мінскіх школьнікаў апытанне, ніхто з іх не хоча, каб іх дзіця паступала ў прафесійна-тэхнічную навучальную ўстанову ці працавала на дзяржаўным прадпрыемстве. Нават сярод выпускнікоў такое жаданне ёсць толькі ў 1 працэнта.

— Прызнаюся, што вынікі апытання мяне моцна ўразілі, паколькі мы ўкладаем у развіццё сістэмы прафтэхадукацыі вялізныя сродкі з разлікам, што атрымаем для нашых прадпрыемстваў і будоўляў працоўныя рэсурсы, — звярнуўся да ўдзельнікаў педагагічнага форуму выканаўца абавязкаў старшыні Мінгарвыканкама Аляксандр ЛАДУЦЬКА. — Мяркую, што бацькі нашых школьнікаў не маюць ніякага ўяўлення пра сучаснае вучылішча ці каледж. І яны, напэўна, не задумваюцца над тым, што чакае іх дзіця пасля заканчэння ВНУ. Сёння ў Мінску пры наяўнасці дзясяткаў тысяч рабочых вакансій далёка не ўсе спецыялісты з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй могуць працаўладкавацца. Мы не без падстаў ганарымся нашай сістэмай прафтэхадукацыі, якую прыязджаюць вывучаць калегі з краін СНД і Еўропы, але мы яе слаба папулярызуем сярод моладзі. Трэба тэрмінова змяняць сітуацыю, каб сацыяльнае становішча ў горадзе заставалася стабільным і рынак працы быў насычаны кадрамі ўсіх спецыяльнасцяў. Неабходна змяняць псіхалогію бацькоў. Вы толькі задумайцеся: амаль 500 (!) выпускнікоў школ мінулага года знаходзяцца на ўліку службы занятасці як беспрацоўныя. І, на жаль, гэтыя лічбы паўтараюцца кожны год. Толькі за апошні навучальны год з прафтэхустаноў былі адлічаны 400 чалавек. Маладыя людзі правялі два-тры месяцы ў сценах вучылішча і пакінулі яго. Чаму мы не змаглі іх там утрымаць, чаму не зацікавілі, не стварылі адпаведную атмасферу? У нас ёсць шмат пытанняў і да кіраўнікоў прадпрыемстваў, якія не ўсё робяць, каб замацаваць у сябе маладых рабочых. Дынаміка замацавання выпускнікоў на першых працоўных месцах таксама несуцяшальная, і з гэтым нельга далей мірыцца.

Старшыня Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Уладзімір ШЧЭРБА паведаміў, што з першага працоўнага месца звальняюцца 300 чалавек.

— У студзені-ліпені гэтага года на ўлік па беспрацоўі былі пастаўлены 785 выпускнікоў школ, прафтэхустаноў, ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Нашы дзеці не ведаюць, што такое сучасная вытворчасць, навуковыя ўстановы, як арганізавана работа дзяржаўнага апарату. Я ўпэўнены, што ні адно прадпрыемства не павінна быць закрытае для наведвання дзяцей.

Закрануў Уладзімір Шчэрба і яшчэ адну важную праблему — попыт на павышаны ўзровень адукацыі. Да таго ж па даручэнні Адміністрацыі Прэзідэнта ў 20 установах у два этапы быў праведзены маніторынг эфектыўнасці работы па рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 15. І вынікі дазваляюць зрабіць высновы, што паказчыкі ахопу навучэнцаў усімі відамі дыферэнцыяванага навучання знізіліся. Звузіўся і спектр прадметнай накіраванасці факультатываў. Мала было факультатываў агульнакультурнага і агульнаразвіццёвага зместу, практычна адсутнічалі факультатывы прафарыентацыйнага і тэхналагічнага профіляў. Многія настаўнікі нават пры масіраванай арганізацыйна-метадычнай падтрымцы не вельмі імкнуліся браца за вядзенне факультатываў, таму былі выпадкі, калі гадзіны заставаліся вакантныя, а напаўняльнасць груп была грамадзяніна Грузіі пры спробе нелегальна перасячы мяжу Беларусі з краінамі ЕС. Узрост нелегалаў — ад 12 да 36 гадоў. Яны затрыманыя на розных напрамках. Парушальнікі будуць дэпартаваныя ў Грузію рэйсам Мінск—Тбілісі.

◢ **Міліцыя шукае зламысніка, які скраў з дачнага дома мінскага бізнэсоўца грошы, ноўтбук і золата з брыльянтамі. Пацярпелы паведаміў, што з яго дачы паблізу Крыжоўкі зламыснік вынес Br38 млн, 1650 еўра, 1 долар ЗША, ноўтбук, набор біжутэрыі, шкатулку са зліткам золата 999-й пробы, інкруставаным брыльянтам. Злодзей залез у дом, адціснуўшы створку шклопакета.**

◢ Службовы аўтобус перавярнуўся ў выніку ДТЗ на Мінскай кальцавой дарозе ў раёне выезду на Віцебскую шашу. Аўтобус не змог размінуцца з грузавіком-бетонамяшалкай, урэзаўся ў агароджу і перакуліўся. Ніхто сур'ёзна не пацярпеў. Вядзецца праверка ўсіх абставінаў.

◢ **У дачыненні да былога судовага выканаўцы суда Шумілінскага раёна распачата крымінальная справа па падазрэнні ў крадзяжы ў асабліва буйным памеры. Ён падазраецца ў тым, што на працягу двух гадоў скраў Br190 млн. Праваахоўнікамі было вызначана, што даўжнікі прыносілі супрацоўніку суда грошы, але ён, прыняўшы штраф, квітанцыі выпісваў не ўсім, у мясцовы бюджэт грошы не здаваў, а ў мясцовыя органы ўлады прыносіў падробленыя дакументы. Падазроны арыштаваны.**

◢ У ходзе правядзення спецмерапрыемстваў у Быхаўскім раёне супрацоўнікі УКДБ па Магілёўскай вобласці сумесна з РАУС выявілі і знішчылі больш за тону канопляў. З гэтай колькасці зелля можна было вырабіць да 50 кг наркатычных рэчываў — марыхуаны, якая рэалізуецца на чорным рынку па кошце Br40-50 тыс. за адзін запалкавы пачак.

Поўны абзац

◢ **У амерыканскай Вірджыніі жанчына пакарала мужа за здраду, прымусіўшы яго стаяць на ўсеагульным аглядзе з плакатам, дзе паведамлялася пра яго ўчынак. Такое пакаранне было накладзена на мужчыну пасля таго, як жонка знайшла на яго мабільным тэлефоне доказы здрады. Ён выйшаў на шматлюдную вуліцу з плакатам «Я здрадзіў. Гэта маё пакаранне». Вадзіцелі, што праязджалі міма, сігналілі яму. Жанчына меркавала, што муж прастаіць так тыдзень, аднак ужо праз некалькі гадзін яна патэлефанавала яму і сказала, што ўсё даравала.**

◢ **ХОДЗЯЦЬ УСЯЛЯКІЯ, А ПОТЫМ КАЛГОТКІ ЗНІКАЮЦЬ**

36-гадовая непрацуючая жанчына спакусілася адразу на 7 пар калготак. Іх яна прыхапіла з гандлёвага ралета цэнтра «Сакрэт» па вуліцы Гагарына ў Гомелі, але была затрымана. Крымінальная справа заведзена і па заяве 50-гадовага грамадзяніна, які ў стане алкагольнага ап'янення спаў ля крамы ў вёсцы Плясовіцкая Слабодка Жлобінскага раёна. Невядомы выкраў у мужчыны 46 тысяч рублёў і... чатыры ліпучкі ад мух.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

«ТЫ БУДЗЕШ ЖЫЦЬ!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вольга Алейнікава, доктар медыцынскіх навук, прафесар, дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук, і сёння ўпэўнена: калі ставіш перад сабою мэту і неадступна ідзеш да яе, усё павінна атрымацца.

— Пяць гадоў таму, Вольга Вітальеўна, узровень вылячэння дзіцячага раку складаў у нас 69 працэнтаў...

— Сёння гэта 72 працэнты... Па ўзроўні вылячэння мы ўваходзім у першую дзясятку еўрапейскіх краін. Для параўнання, працэнт вылячэння ў Польшчы — 69.

— Мы жывём у час суцэльных стрэсаў, ужываем сінтэтычныя прадукты, дыхаем забруджаным паветрам... Менавіта па гэтых прычынах клеткі нашага арганізма не вытрымліваюць нагрузкі, «ламаюцца», пачынаецца іх мутацыя, змяненне ў бок злаякаснасці?

— Амаль што так... Рэчывы, якія выклікаюць мутацыю клетак, знаходзяцца ў навакольным асяроддзі. У ежы, у паветры, у вадзе... Іх дзясяткі і сотні тысяч. Акрамя таго, існуе генетычны фактар — у дзіцячага арганізма ёсць схільнасць да злаякасных новаўтварэнняў, калі ў некага з членаў сям'і быў выяўлены рак. Нельга не прызнаць, што наша насельніцтва становіцца больш хваравітым. Калі ўзяць, скажам, акушэрства, сёння сярод нарадзіх толькі 30 працэнтаў здаровых жанчын — усе астатнія маюць нейкія адхіленні... А рак — гэта генетыка, генетычныя «паломкі». Інакш кажучы, дзеці ў такіх бацькоў ужо нараджаюцца з нейкімі асаблівасцямі, мутацыямі клетак. Але сама па сабе, без негатыўных уплываў знешніх фактараў, генетычная спадчыннасць не абавязкова азначае хваробу. Рак — не нейкая аднамомантная «паломка» ў арганізме. Павінна адбыцца некалькі дадатковых негатыўных уздзеянняў на гэту клетку, каб з цягам часу развілася злаякаснае новаўтварэнне.

— Дыягназ «рак» заўсёды ўспрымаецца як прыгавор — у любым узросце. Што ўжо казаць пра дзяцей...

— Змяніць ментальнасць насельніцтва крайне складана, таму што злаякаснае новаўтварэнне — гэта заўсёды страшна для чалавека. Шчыра кажучы, калі б людзі дажывалі да таго ўзросту, на які яны «закладзеныя» — а гэта 150 і больш гадоў — то паміралі б выключна ад раку, ад напазапашаных у працэсе жыцця клеткавых мутацый. Увогуле рак — гэта хвароба старых. Нонсенс, калі хварэюць дзеці. Вось дзіцячая анкалогія на сто працэнтаў генетычная, інакш кажучы, хвароба была закладзена ў дзіцяці яшчэ да яго з'яўлення на свет і «разрашылася» рана. Мала таго, існуюць і прыроджаныя пухліны. Сёлета нам давялося займацца немаўляткам, якое нарадзілася з велізарным злаякасным новаўтварэннем — нейрабластомай.

— Раней гэта здаралася?

— Было. Увогуле, узровень дзіцячай захваральнасці злаякаснымі новаўтварэннямі — а мы пільна адсочваем гэтыя лічбы з 1989 года — застаецца на дзіва стабільным. Няма ні рэзкіх усплёскаў, ні зніжэнняў. Дзеці хварэюць, як хварэлі 20 гадоў таму... Затое ёсць значныя змяненні ва ўзроўні смяротнасці — у бок яе зніжэння.

— Лячэнне па-ранейшаму засноўваецца на трох «кітах» — хіміятэрапіі, радыетэрапіі і аператыўным умяшанні?

— На першым месцы ідзе хіміятэрапія, прычым, высакадозная. Яна «забірае» прыкладна 75 працэнтаў усіх нашых намаганняў па лячэнні раку... Калі не дапамагаюць ні хіміятэрапія, ні радыяцыйная тэрапія, ні аперацыйнае ўмяшанне, мы ідзём далей, аж да трансплантацыі коснага мозга... Перасадка коснага мозга азначае поўную замену імуннай сістэмы дзіцяці. Груба кажучы, мы забіваем яго ўласныя ствалавыя клеткі, якія «адказваюць» за імунітэт, і перасаджваем яму іншыя, чужыя... І дзіця з гэтым жыве — з чужым косным мозгам. І будзе жыць доўга, да самай старасці. І памрэ зусім ад іншых прычын.

— Гэта калі ўсё паспяхова прайшло...

— Так, калі ўсё прайшло паспяхова. Але што такое ў гэтым выпадку паспяховасць? Непасрэдна сама аперацыя па перасадцы — гэта не складана, чыстая тэхналогія, там ствалавыя клеткі праз кропельніцу ўводзяцца ў вену. Мы першую такую аперацыю зрабілі яшчэ ў 98-м годзе... Але для арганізма, якому ўводзяцца чужыя клеткі, гэта шок. Арганізм ім супраціўляецца, ён з імі змагаецца, ён спрабуе іх адрынуць... А нам трэба, каб узнікла так званая талерантнасць у адносінах да чужых клетак, каб дзіцячы арганізм прыняў іх, як свае, каб яны ў ім прыжыліся. З аднаго боку, прыжыліся, але разам з тым — пачалі змагацца з яго ўласнай! Уяўляеце? Гэта такія высокія — высачэзныя! — тэхналогіі, такі пілатаж... Часам нават чыста інтуітыўна ідзеш, па ходу шукаеш рашэнне...

Зразумела, клетачная трансплантацыя рэкамендавана толькі ў тых выпадках, калі ўсе іншыя метады вычарпаныя. Інакш кажучы, без трансплантацыі ўсе гэтыя дзеці абавязкова загінулі б. А так 60 працэнтаў з іх мы выратоўваем.

Да ўсяго іншага, гэта неверагодна шмат каштуе. Сёння на адну такую аперацыю дзяржава затрачвае 150 тысяч долараў. Але бацькі не аплачваюць нічога, для іх гэта цалкам бясплатна.

— Колькі такіх аперацый вы робіце?

— Пачыналі з 5 у год. А летась зрабілі ўжо 32.

— А дзе бяруцца ствалавыя клеткі для перасадкі?

— Крыніц некалькі. У першую чаргу гэта браты і сёстры хворага дзіцяці — верагоднасць знаходжання сярод іх «сумяшчальнага» донара складае працэнтаў 15. Калі брат ці сястра не падыходзяць, звяртаемся па дапамогу ў Еўрапейскі банк донараў. Тут верагоднасць удачы значна вышэйшая — 76 працэнтаў. Па клеткі адпраўляецца наш кур'ер, прывозіць іх сюды — для нашай краіны гэта каштуе ад 10 да 15 тысяч еўра.

Існуе яшчэ такая магчымасць, як Еўрапейскі банк пупочнай крыві... Дарэчы, у нас да гэтага часу такі біялагічны матэрыял, як плацэнта, падчас нараджэння дзіцяці, папросту кажучы, выкідваецца ў сметніцу. Гэта, я лічу, сапраўднае злачынства, таму што плацэнта літаральна «нафаршыраваная» ствалавымі клеткамі. Да таго ж, яны вельмі маладыя і вельмі жывучыя, пры іх перасадцы не патрабуецца поўнай сумяшчальнасці...

Ну і апошняя крыніца — бацькі. Але гэта вельмі «стрёмная» трансплантацыя, тут мы ўжо загадзя ідзём на 50 працэнтаў несумяшчальнасці. Рызыка каласальная... Дзіцячы арганізм будзе імкнуцца любымі шляхамі адштурхнуць чужародных «гасцей». Гэта такое балансаванне!.. Мы зрабілі 6 перасадак клетак ад бацькоў. Чатыры закончыліся паспяхова, дзве — не... Інакш кажучы, размова пра такую трансплантацыю заходзіць толькі тады, калі ніякага іншага выйсця ўжо няма. Або дзіця павінна загінуць, або мы ідзём на рызыку і прымяняем метад перасадкі, што злаякаснае новаўтварэнне — гэта заўсёды страшна для чалавека. Шчыра кажучы, калі б людзі дажывалі да таго ўзросту, на які яны «закладзеныя» — а гэта 150 і больш гадоў — то паміралі б выключна ад раку, ад напазапашаных у працэсе жыцця клеткавых мутацый. Увогуле рак — гэта хвароба старых. Нонсенс, калі хварэюць дзеці. Вось дзіцячая анкалогія на сто працэнтаў генетычная, інакш кажучы, хвароба была закладзена ў дзіцяці яшчэ да яго з'яўлення на свет і «разрашылася» рана. Мала таго, існуюць і прыроджаныя пухліны. Сёлета нам давялося займацца немаўляткам, якое нарадзілася з велізарным злаякасным новаўтварэннем — нейрабластомай.

— Раней гэта здаралася?

— Было. Увогуле, узровень дзіцячай захваральнасці злаякаснымі новаўтварэннямі — а мы пільна адсочваем гэтыя лічбы з 1989 года — застаецца на дзіва стабільным. Няма ні рэзкіх усплёскаў, ні зніжэнняў. Дзеці хварэюць, як хварэлі 20 гадоў таму... Затое ёсць значныя змяненні ва ўзроўні смяротнасці — у бок яе зніжэння.

— Лячэнне па-ранейшаму засноўваецца на трох «кітах» — хіміятэрапіі, радыетэрапіі і аператыўным умяшанні?

— На першым месцы ідзе хіміятэрапія, прычым, высакадозная. Яна «забірае» прыкладна 75 працэнтаў усіх нашых намаганняў па лячэнні раку... Калі не дапамагаюць ні хіміятэрапія, ні радыяцыйная тэрапія, ні аперацыйнае ўмяшанне, мы ідзём далей, аж да трансплантацыі коснага мозга... Перасадка коснага мозга азначае поўную замену імуннай сістэмы дзіцяці. Груба кажучы, мы забіваем яго ўласныя ствалавыя клеткі, якія «адказваюць» за імунітэт, і перасаджваем яму іншыя, чужыя... І дзіця з гэтым жыве — з чужым косным мозгам. І будзе жыць доўга, да самай старасці. І памрэ зусім ад іншых прычын.

— Гэта калі ўсё паспяхова прайшло...

— Так, калі ўсё прайшло паспяхова. Але што такое ў гэтым выпадку паспяховасць? Непасрэдна сама аперацыя па перасадцы — гэта не складана, чыстая тэхналогія, там ствалавыя клеткі праз кропельніцу ўводзяцца ў вену. Мы першую такую аперацыю зрабілі яшчэ ў 98-м годзе... Але для арганізма, якому ўводзяцца чужыя клеткі, гэта шок. Арганізм ім супраціўляецца, ён з імі змагаецца, ён спрабуе іх адрынуць... А нам трэба, каб узнікла так званая талерантнасць у адносінах да чужых клетак, каб дзіцячы арганізм прыняў іх, як свае, каб яны ў ім прыжыліся. З аднаго боку, прыжыліся, але разам з тым — пачалі змагацца з яго ўласнай! Уяўляеце? Гэта такія высокія — высачэзныя! — тэхналогіі, такі пілатаж... Часам нават чыста інтуітыўна ідзеш, па ходу шукаеш рашэнне...

Зразумела, клетачная трансплантацыя рэкамендавана толькі ў тых выпадках, калі ўсе іншыя метады вычарпаныя. Інакш кажучы, без трансплантацыі ўсе гэтыя дзеці абавязкова загінулі б. А так 60 працэнтаў з іх мы выратоўваем.

Да ўсяго іншага, гэта неверагодна шмат каштуе. Сёння на адну такую аперацыю дзяржава затрачвае 150 тысяч долараў. Але бацькі не аплачваюць нічога, для іх гэта цалкам бясплатна.

— Колькі такіх аперацый вы робіце?

— Пачыналі з 5 у год. А летась зрабілі ўжо 32.

— А дзе бяруцца ствалавыя клеткі для перасадкі?

— Крыніц некалькі. У першую чаргу гэта браты і сёстры хворага дзіцяці — верагоднасць знаходжання сярод іх «сумяшчальнага» донара складае працэнтаў 15. Калі брат ці сястра не падыходзяць, звяртаемся па дапамогу ў Еўрапейскі банк донараў. Тут верагоднасць удачы значна вышэйшая — 76 працэнтаў. Па клеткі адпраўляецца наш кур'ер, прывозіць іх сюды — для нашай краіны гэта каштуе ад 10 да 15 тысяч еўра.

Існуе яшчэ такая магчымасць, як Еўрапейскі банк пупочнай крыві... Дарэчы, у нас да гэтага часу такі біялагічны матэрыял, як плацэнта, падчас нараджэння дзіцяці, папросту кажучы, выкідваецца ў сметніцу. Гэта, я лічу, сапраўднае злачынства, таму што плацэнта літаральна «нафаршыраваная» ствалавымі клеткамі. Да таго ж, яны вельмі маладыя і вельмі жывучыя, пры іх перасадцы не патрабуецца поўнай сумяшчальнасці...

Ну і апошняя крыніца — бацькі. Але гэта вельмі «стрёмная» трансплантацыя, тут мы ўжо загадзя ідзём на 50 працэнтаў несумяшчальнасці. Рызыка каласальная... Дзіцячы арганізм будзе імкнуцца любымі шляхамі адштурхнуць чужародных «гасцей». Гэта такое балансаванне!.. Мы зрабілі 6 перасадак клетак ад бацькоў. Чатыры закончыліся паспяхова, дзве — не... Інакш кажучы, размова пра такую трансплантацыю заходзіць толькі тады, калі ніякага іншага выйсця ўжо няма. Або дзіця павінна загінуць, або мы ідзём на рызыку і прымяняем метад перасадкі, што

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

пры якім ужо першапачаткова ёсць 50-працэнтнае «непападданне»...

— Скажыце, а дзеці і бацькі пра гэта ведаюць?

— Безумоўна. Безумоўна! Я прыхільнік таго — і гэты прынцып прыняты за аснову ва ўсім свеце — што хаваць ад чалавека яго дыягназ і ўсё, што з ім звязанае, негуманна і няправільна. Пацыент павінен ведаць праўду (за выключэннем самых маленькіх, зразумела). Гэта ж не азначае, што сёння мы яго паставілі перад фактам, а заўтра ён загінуў. У чалавека, у нашым выпадку — дзіцяці — ёсць час. Ён пачынае жыць у гэтай новай псіхалагічнай сітуацыі, звыкаецца з ёю, мабілізуецца на барацьбу за ўласнае жыццё. І бацькі мабілізуюцца. Людзі заўсёды канцэнтруюцца, калі адчуваюць небяспеку — гэта нам і патрэбна. Мы расказваем — у даступнай форме, зразумела — пра ўсе магчымыя метады лячэння, пра ўсе наступствы, ускладненні... Пра ўсе каласальныя выпрабаванні, праз якія давядзецца прайсці дзіцяці і яго бацькам... Але заканчваем размову заўсёды адным: у цябе ўсё абавязкова будзе добра, сёння ўрачы могуць вылечыць рак, толькі ты павінен ім дапамагчы.

— Рэакцыя ў бацькоў якая?

— Ну якая можа быць рэакцыя?! Шокавая! Але яе неабходна перажыць. Увогуле, чалавек — гэта істота, якая можа перанесці ўсё. За час свайго доўгага жыцця ў медыцыне я гэта зразумела дакладна.

— Колькі часу патрабуецца на лячэнне?

— Наўрад ці можна так ставіць пытанне... Кожны спецыяльны від злаякаснага ўтварэння мае свой пратакол, сваю «тэхналогію» і сваю працягласць лячэння. З адным мы можам справіцца за паўгода, для іншага не хапае і двух, і трох гадоў... Скажам, лімфабластны лейкоз лечыцца 2,5 года, хоць інтэнсіўная фаза лячэння складае ўсяго 6 месяцаў... Увогуле, лячэнне працягваецца да таго часу, пакуль існуе хоць якая-небудзь, хоць мінімальная магчымасць дапамагчы дзіцячаму арганізму... Ведаеце, у чым заключаецца асноўнае каварства раку? Не ў самім пратаколе лячэння, дзе ўся схема распісаная да дробязяў, а менавіта ў непрадбачаных ускладненнях, пабочных з'явах. У выніку жорсткага лячэння, хіміятэрапіі арганізм пазбаўляецца імунітэту, у яго няма ніякай абароны, ён не можа супрацьстаяць інфекцыям, якія ў дачыненні да здаровага чалавека з'яўляюцца бяскрыўднымі... Вельмі цяжкае грыбковае ўскладненне — аспарагелёз і напрамую звязанае з ім запаленне лёгкіх. З-за аспарагелёзу лёгкія дзіцяці «спальваюцца» за лічаныя тыдні, і яно гіне.

Выхадзіць дзіця пасля інтэнсіўнага лячэння — найвялікшае майстэрства... А далей — зноў інтэнсіўная тэрапія, зноў «хімія»...

— Вы фінансуецеся з рэспубліканскага бюджэту і як дзіцячы цэнтр маеце ў гэтым сэнсе пэўныя прыярытэты. Узровень фінансавання вас задавальняе?

— Ну як задавальняе?.. Пакажыце мне чалавека, кіраўніка ўстановы, які сказаў бы, што яму хапае грошай. Я такога і ў лепшыя часы не сустракала. А цяпер для фінансаў не самы лепшы час.

На медыкаменты і рэагенты — а гэта самы вялікі артыкул расходаў — грошай, можна сказаць, дастаткова. А вось на медтэхніку нам хранічна не хапае. Сёлета ж і ўвогуле катастрофа, фінансуюцца толькі абароненыя артыкулы: медыкаменты, харчаванне, зарплата. Фінансаванне капітальнага рамонту і медтэхнікі перанесена на чацвёрты квартал. Мы фактычна не абнаўляемся сёлета тэхнічна, і гэта вельмі дрэнна... У канцы мінулага года пачалі капітальны рамонт аддзялення рэанімацыі, і там ужо 70 працэнтаў работы было зроблена. Але грашовыя паступленні спыніліся, і цяперашняя сітуацыя мяне вельмі напружвае.

Рэч у тым, што на час рамонту мы перавялі аддзяленне рэанімацыі ў памяшканні дзённага стацыянара, а дзяцей з дзённага стацыянара размясцілі ў некалькіх пакоях нашай паліклінікі — такім чынам пагоршыўшы ўмовы і ім, і паліклініцы. І цэлы год жывём у гэтым рэжыме. Год! Ні адзін заходні доктар не пагадзіўся б працаваць у такіх умовах. Мы ж працавалі і будзем працягваць... Але я вельмі хацела б, каб да канца года гэта праблема вырашылася і рэанімацыя «пераехала» на сваё месца. Гэта не нейкая мая прыхамаць, гэта жыццёвая необходнасць.

З-за пастаяннай незакончанасці рамонтных работ і, як вынік, скучанасці ў нас пачала распаўсюджвацца грыбковая інфекцыя. А аспарагелёз — гэта не бактэрыі. Змагацца з грыбковай інфекцыяй архісклада. У нас ужо дастаткова вялікі працэнт пасляаперацыйных дзяцей «падхапілі» аспарагелёз. Яго лячэнне каштуе столькі, што за гэтыя грошы можна было б адрамантаваць ужо пяць рэанімацый. Адна ампула новага супрацьгрыбковага прэпарату на дзень каштуе 1 мільён 300 тысяч. Працягласць лячэння — мінімум 14 дзён. Вось і падлічыце, колькі атрымліваецца. Тым больш, што лячым мы не адным прэпаратам, а двума... Калі б рамонт своечасова скончыўся, гэтага можна было б пазбегнуць...

— Праблема ранняга выяўлення дзіцячага раку па-ранейшаму існуе?

— На жаль, праблема засталася. Гэтаму якраз было прысвечана чарговае пасяджэнне лячэбна-кансультацыйнага савета Міністэ

ЗЯМЛЯ
СТАРАЖЫТНАГА КРЭВА

На гасцінна-хлебадарную зямлю Смаргоншчыны ступае рэспубліканскае свята беларускага пісьменства. Адшумеўшы пад старажытнымі сценамі Міра, глыбінна зачэрпнуўшы з жыццядайных тураўскіх крыніц, зірнуўшы абсяжна на свет з Камянецкае белае вежы, прайшоўшы гістарычнымі мясцінамі Паставаў, Шклова і Барысава, яно гучна ступае на зямлю старажытнага Крэва, каб спаўна наталіцца родавай спадчынай тае зямлі, якая стала ў свой час лёсавызначальнай для беларускага і ўсіх суседніх народаў.

Калі глядзіш на звалунелыя сцены — астанне суровых байніц Крэўскага замка — праз стагоддзі чуеш роструб і скрыгат тэўтонскіх няспынных наступаў-штурмаў, згадваеш Гедыміна, Кейстута, Вітаўта, Ягайлу, уяўляеш, як далёка адсюль сягалі Альгердавы коннікі, п'ючы шаломамі з Дона і звоначы коп'ямі ля сцен Мажайска. Гісторыя закручвалася тут у тугі вузел, і голасам Крэўскае уніі 1385 года павярнула свой ход у тое знанае рэчышча, што праз гады і стагоддзі вылілася ў дзяржаўную незалежнасць супольна жывучых народаў.

Для нас, беларусаў, перш-наперш паўстае Смаргоншчына сваімі Кушлянамі, голасам Францішка Багушэвіча, яго «Дудкі беларускай». Просты і шчыры верш на роднай мове будзіў нацыянальную свядомасць, сказаў вакольнаму свету, хто мы такія і чаго прагнем пад небам Айчыны. А прагнем, здавалася б, нямногага: быць роўнымі сярод роўных, збыцца нацыянальнага прыніжэння і ўціску, мець усё тое, што маем сягоння як суверэнная Краіна Беларусь, што годна і бачна месціцца ў цэнтры цывілізаванай Еўропы.

Гэта на Багушэвічавай дудцы поўнагалоса зайграе Свята нашай беларускай пісьменнасці ў Смаргоні.

Хлебароб, кім у нялёгкіх умовах надвор'я гэтага года здабыты важкі ўраджай, выцершы пот, возьме ў рукі кнігу. У шалясценні яе старонак пачуе даўнішні грук Скарынаўскіх першадрукаў. Ацэніць і ўзважыць, як на суседняй з ягонай, культуралагічнай ніве, папрацавалі пісьменнікі і друкары, з якімі набыткамі прыйшлі да Свята пісьменства. Ён парадуецца, безумоўна, убачыўшы ў руках і дзяцей сваіх вартую ўвагу і прыстойна выдадзеную кнігу-чытанку. З духоўных глыбінных крыніц чэрпае наша слова, каб даносіць да сэрцаў мільёнаў усю чалавечую сутнасць жыцця, спаталяць духоўную прагу народа, які і праз яе, літаратуру, шле свой пасыл цэламу свету.

Па-свойму своеасабліва і клопатна рыхтавалася на працягу года да гэтага свята і рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва», у склад якой уваходзяць такія літаратурныя выданні, як адзін са старэйшых часопісаў «Полымя», часопісы «Нёман» і «Маладосць», газета творчай інтэлігенцыі краіны «Літаратура і мастацтва», а зусім з нядаўняга часу часопіс гумару і сатыры «Вожык», «Бярозка», адрасаванае школьнай моладзі выданне. Багата расказана пра гістарычную і сучасную Беларусь на старонках згаданых выданняў. Не толькі новыя літаратурныя творы прыйшлі да чытача — у жанрах прозы, паэзіі, драматургіі, аднак апавядалася і пра сам сучасны літаратурны працэс, пра адлюстраванне на старонках мастацкіх твораў сягонняшняга жыцця нашых суайчыннікаў, пра нястомныя духоўныя намаганні дзеля росквіту Бацькаўшчыны, якая клапатліва і беражліва ставіцца да сваёй спадчыны, ушаноўваючы імёны лепшых сваіх сыноў і дачок, робячы ўсё дзеля таго, каб сучаснае жыццё было духоўна здаровым, вартасным, стваральным.

Сягоння выданне кніг і часопісаў адчувае рэальную дзяржаўную падтрымку. У рэдакцыях мы задумваемся пра тое, што толькі сацыяльна значнае мастацкае слова агучвае ўсе струны душы, што яно здатнае — а гэта засведчыла айчынная літаратурная класіка — будзіць свежыя чалавечыя сілы, сталюе ў душы дабрыню і хараство, прымнажае інтэлектуальны патэнцыял, ратуе ад гістарычнага бяспамяцтва.

У год 65-годдзя вызвалення нашай Айчыны ад фашысцкай навалачы яшчэ раз усур'ёз мы задумваемся аб самой сутнасці патрыятызму і тых чалавечых каштоўнасцях, якія і сёлкуюць яе. Ужо сям-там вакол нас гарачлівыя галовы імкнуцца пераасэнсаваць сутнасць Перамогі ў кровапралітнай вайне, чуецца пагалоска знявагі салдацкага подзвігу, адмаўляецца або замоўчваецца роля брацкага яднання народаў, якія паклалі на алтар Перамогі мільёны чалавечых жыццяў. А мы, беларусы, па макуліне-драбінцы і сягоння нястомна збіраем гістарычныя звесткі пра гады ліхалецця, робім усё належнае, каб мужная памяць не выстыла, бо ведаем: толькі яна, гістарычная праўда, абароніць нашых заўтрашніх суайчыннікаў ад забыцця і многіх ніцавокіх спакусаў. Таму Саюз пісьменнікаў Беларусі, Рэспубліканскі савет Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, рэдакцыі часопісаў «Полымя» і «Нёман» калектыльна прыняліся за стварэнне кнігі-запавету «Вечны агонь Перамогі». Аўтарскім клопатам нашых лепшых публіцыстаў сталася стварэнне нарысаў пра Герояў Савецкага Саюза, якія, на шчасце, яшчэ сярод нас. Нарысы на працягу года друкаваліся на старонках згаданых часопісаў. У іх не толькі суровае дыханне праўды вайны. У іх і запаветнае, тое, чаго жадаюць героі вайны наступным пакаленням.

«Хацелася б, каб з малых гадоў у нас ведалі ўсе сапраўдную цану нашай Перамогі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. І каб гэтую цану ніколі не заніжалі сваімі аднасінамі не толькі да подзвігу старэйшага пакалення, аднак і да сучаснай рэчаіснасці, сваёй Бацькаўшчыны, сваёй дзяржавы і сваіх суайчыннікаў», — звяртаецца да сучаснікаў і нашчадкаў пехацінец-салдат, Герой Савецкага Саюза Іван Ільіч Кустаў. Выданне кнігі «Вечны агонь Перамогі» прыўрочаны да 65-годдзя Вялікай Перамогі. Кніга стане настольнай для маладых суайчыннікаў, як добры трывалы мост злучыць два берагі вечнай ракі жыцця.

Годна і хвалюючa расказваюць па наш родны край ужо выдадзеныя ў РВУ «Літаратура і Мастацтва» кнігі, якія зоймуць пачэснае месца на кніжных паліцах святочнай Смаргоні. Сярод іх «Радзіма мая дарагая» і «Палескія элегіі» незабыўных Алеся Бачылы і Міколы Купрэева, «Знічкі Айчыны» Алеся Карлюкевіча, «Тапонімы распавядаюць» Валянціны Лемцюговай, «Сто асоб беларускай гісторыі» Анатоля Мяснікова, «Горад у нябёсах» Анатоля Казлова. Праз больш як трыццаць гадоў выйшла ў свет, як працяг традыцыі, выданне аўтабіяграфій пісьменнікаў сучаснай генерацыі — кніга «З росных сцяжын».

Вабнай аздобай і насычаным зместам парадуюць чытача свежыя нумары часопісаў «Полымя», «Маладосць» і «Нёман», спецыяльны святочны выпуск газеты «Літаратура і мастацтва».

Жыхары Смаргоні і госці горада ў дзень беларускага пісьменства сустрэнуцца з лепшымі айчыннымі творцамі і кнігавыдаўцамі, стануць удзельнікамі не толькі хвалюючага адкрыцця свята, аднак і многіх кніжных прэзентацый і літаратурных імпрэз, якія пройдуць па ўсім горадзе і раёне. А мы, творцы, спадзяёмся і верым, што зямля старажытнага Крэва зачаруе і запаланіць сваім харством настолькі, што падаруе творчае натхненне многім.

Мікола МЯТЛІЦКІ,
галоўны рэдактар часопіса «Полымя», лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Янкі Купалы.

Рыштаванні Бацькаўшчыны

Сноўскі палац дасюль выглядае ўнушальна

Сноў ва ўсіх на слыху. Яно і не дзіўна — тутэйшы агракамбінат справядліва з'яўляецца арыенцірам для айчынных сельгаспрадпрыемстваў. Нездарма сюды часта прыязджаюць розныя дэлегацыі, каб павучыцца таму, як і вытворчасць развіваць, і пра «сацыялку» не забываць. Гэтыя тэмы, безумоўна, надзвычай важныя, але ёсць у Снова яшчэ адна адметнасць, пра якую, на жаль, рэдка хто ўзгадвае. Тут дасюль захавалася шмат гістарычных аб'ектаў — два сядзібна-паркавыя комплексы, царква, касцёл...

Ад Кішкаў да Гартынгаў

Упершыню Сноў узгадваецца ў гістарычных крыніцах у 1533 годзе. Але магчыма, што паселішча было тут заснавана значна раней. Першыя гаспадары Снова — магнаты Кішкі, пасля якіх мястэчка было ва ўласнасці Радзівілаў. Праз колькі часу ім валодалі Гарабурды, а з 1639 года — Рлдултоўскія. Апошнія тут надоўга ўладкаваліся. Акрамя Снова, Рлдултоўскім належалі яшчэ некалькі маёнткаў у колішнім Наваградскім павеце.

— Сноўскую сядзібу стварыў Казімір Рлдултоўскі, — заўважае кіраўнік музея Сноўскай СШ Валянціна Богдан. — Гэта быў неардынарны чалавек: меў філасофскую адукацыю, займаў пасаду маршалка (кіраўніка шляхты) Наваградскага павета. Паспяхова займаўся сельскай гаспадаркай, пры ім непадалёку ўзводзіцца суконная фабрыка.

— З вясны 1907 па лістапад 1908 года на бровары ў Дольным Снове працаваў Янка Купала, — кажа Валянціна Богдан. — У свой час ён вучыўся ў Мінску. Сярод аднакурснікаў Купалы быў ураджэнец Снова Быкоўскі. Спачатку паэт працаваў на бровары на Маладзечаншчыне, але адтуль па аб'ектыўных прычынах давялося з'ехаць. Вось Быкоўскі і запрасіў яго ў Сноў, дзе было вакантнае месца памочніка вінакура. Праца вельмі цяжкая. Паэт пасля ўзгадваў, што спазнаў жа ён гора на тым бровары.

Але ж у вольны час Купала пісаў вершы, частка з якіх пасля ўвайшла ў вядомы зборнік «Жалейка». Так што Сноў можна лічыць сапраўдным прытулкам паэтаў, дзе дзіўным чынам сышліся лёсы Міцкевіча, Пушкіна і Купалы. І ўсё гэта нездарма, таму што такія супадзенні проста так не здараюцца — у чым я абсалютна перакананы.

Яшчэ ў 1827 годзе (па іншых меркаваннях — яшчэ раней) Казімір Рлдултоўскі задумаў на першы погляд немагчымае: узвесці ў Снове палац, які б не саступаў рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы. Месца для будоўлі было выбрана вельмі ўдалае — на адкрытай тэрасе каля рэчкі Сноўкі. Гэты велічны палац калісьці налічваў больш за сто пакояў, ён выцягнуты ў даўжыню на 140 метраў. Але будынак зусім не выглядае маналітным «вялікім кавалкам», пакольк разбіты на розныя аб'ёмы. Двухпавярховы цэнтральны корпус крыламі злучаецца з рызалітамі, ад якіх да павільёнаў цягнуцца галерэі.

Цікава, што з аднаго боку калоны прыціснутыя ўшчыльную да сцяны, а з другога — утвараюць адкрытую каланаду, па якой прыемна прайсціся. У палаца вельмі прыгожае аздабленне: ляпніна, іанічныя порцікі, праз якія госці траплялі ў вестыбюлі, а пасля — у гасцёўні, залы, кабінеты. Парадная зала таксама была размешчана на першым паверсе. З высокіх вокнаў адкрываўся

маляўнічы пейзаж. Упрыгажэннем памяшкання былі адметныя скульптуры ў нішах. Пра колішні, кажучы сучаснымі словамі, дызайн пакояў звестак амаль не захавалася. Вядома, што ў бакавых крылах і павільёнах размяшчаліся жылыя, а таксама гаспадарчыя памяшканні.

— Тут сыходзіцца шэраг дарог, і гасцей заўсёды было шмат, — адзначае Валянціна Богдан. — Таму ў сядзібе заўжды трымалі вялікі штат прыслугі. Не забывайцеся і пра тое, якія тут былі лясы, зразумела, ладзіліся паляванні, якія многіх паноў прываблівалі. Цікава, што па паданнях менавіта пасля аднаго з паляванняў і з'явілася назва ў мястэчка. Калі ў аднаго пана спыталі, дзе ён адпачываў, дык ён узгадаў, што ў гэтым месцы ўбачыў шмат сноў і з усмешкай адказаў: «Ва ўрочышчы сноў». Адтуль і назва. Але ж існуюць і іншыя версіі. Магчыма, што паселішча калісьці спалілі ўшчэнт і яно адрадзілася зноў. Ці ад таго, чый тут быў пасад, — «сыноў». Альбо назва пайшла ад рэчкі Сноўкі.

«Белы арол» у палацы

Плошча палацава-паркавага комплексу ў Снове, які быў закладзены Казімірам Рлдултоўскім, каля паўсотні гектараў. Побач з шыкоўнай рэзідэнцыяй размяшчаўся вялікі пейзажны парк. Сярод дрэваў — ясені, клёны, ліпы. Частка алей захавалася і дасюль. Агульную кампазіцыю ўпрыгожвае сістэма вадаёмаў, якія напаўняюцца за кошт падземных крыніц і вялікага ручая. Дно сажалак было выкладзена бутавым каменем. Дадайце да гэтага масткі, альтанкі, каналы — і атрымаеце ўяўленне аб цудоўнай сядзібе, якая многіх прываблівала і прываблівае.

— Падчас Першай сусветнай вайны ў палацы размяшчаўся шпіталь, — узгадвае Валянціна Богдан. — А ў 1925-м Гартынгі прадалі сядзібу польскаму корпусу аховы мяжы. Рамонт палаца працягваўся чатыры гады, будынак быў часткова перапланаваны. Пасля тут была канцылярыя і жылыя пакоі для польскіх афіцэраў. Таксама працавала і казіно.

Цяпер сюды трапіць няпроста, паколькі ў будынку размешчаны... ваенны шпіталь памежнікаў (такія аб'екты тут былі пачынаючы з Першай сусветнай — зноў супадзенне?). Але ж я атрымаў дазвол і праз прахадную прайшоў на тэрыторыю старажытнай сядзібы. На ўспамін пра слыннае мінулае — валун, які ўстанавілі ў 2007-м, калі адзначалі 180-годдзе ўзвядзення палаца. Панскі маёнтак выглядае ўнушальна, захаваўся колішні колер — вохрысты ў спалучэнні з белым (дарэчы, характэрныя фарбы для гамы архітэктуры класіцызму).

Будынак яшчэ даволі моцны, але з цягам часу ўзнікаюць пэўныя праблемы. Як заўважыў камандзір узвода матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння Валерый Жук, патрабуюць замены дах (у некалькіх месцах ён падцякае), вокны, неабходна рамантаваць фасад. Аднак трэба ўлічваць тое, што будынак мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, таму правядзенне работ тут строга рэгламентавана. Вайскоўцы імкнуцца падтрымліваць палацава-паркавы комплекс у належным стане: правялі рамонт унутры, даглядаюць парк, змайстравалі альтанкі, на сажалцы нават хатку для лебедзяў зрабілі, усталявалі масткі.

— У сярэдзіне 1990-х гадоў тут нават здымалі кліп гурта «Белы арол», — кажа старшыня Сноўскага сельсавета Галіна Карпей. — Памятаеце: «Как упоительны в России вечера»? Вось тут, дзе цяпер актавая зала, усё прыбралі і баль ладзілі. Калі герой на кані едзе, дык гэта па той алеі, што побач. Так што ніякая ў тым кліпе не Расія, а самая што ні ёсць Беларусь, а больш дакладна — Сноў. І гэта такія чароўныя менавіта ў нас вечары.

У чаканні аднаўлення

Ад палаца, пабудаванага Рлдултоўскімі, накіроўваемся да Горнага Снова (раней існаваў такі населены пункт, які зараз увайшоў у склад Снова). Па дарозе мінаем касцёл Іаана Хрысціцеля, які быў узведзены яшчэ ў 1760 годзе Янам Крыштофам Рлдултоўскім. Пэўны час храм выкарыстоўвалі і як царкву, колькі гадоў тут праводзілі службы адразу два святары — каталіцкі і праваслаўны. Пасля Вялікай Айчыннай вайны касцёл выкарыстоўвалі пад сховішча, аднавілі яго ў 1991-м. Непасрэдна ў Горным Снове Рлдултоўскія ў 1836 годзе ўзвялі каменную царкву. Спачатку яна была Петрапаўлаўскай, а пасля пажару храм перабудаваны Гартынгамі і асвечаны ў імя святых Касмы і Дамяна.

Царква стаіць на высокім пагорку (усё ж такі Горны Сноў!), адкуль добра відаць касцёл, а таксама баронскую сядзібу. Туды пасля і падыходзім. Гэта даволі арыгінальны двухпавярховы будынак, які ўзведзены ў сярэдзіне XIX стагоддзя Густавам Гартынгам. У 1913 годзе да яго дадалі аднапавярховае крыло з верандай (спачатку яна была адкрытай). Цікавы тут калісьці заклалі парк — дрэвы на схіле раслі быццам на вялікай прыродным тэрасе. Зараз у колішняй сядзібе размешчана бальніца. У свой час спецыялісты праводзілі абследаванне будынка і прызналі яго стан досыць добрым.

Цудоўна, што гістарычныя аб'екты ўдалося захаваць, але відавочна, што абедзве сядзібы патрабуюць прафесійнага аднаўлення. Зразумела, правядзенне комплексу адпаведных работ патрабуе значных сродкаў. Аднак укладанні таго вартыя: пагадзіцеся, няшмат знойдзецца такіх унікальных куткоў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота аўтара.

Нясвіжскі раён.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 22 (68)

Матусевічавы сКРЫЖАванні
Жыццёвыя пуцявіны адраджэнца беларускай школы

...Вясковая пакручастая сонечная дарога хуткім ветрам прывяла старэнькі рабочы «газік» да звычайнай сядзібы. Кіроўца жвава скокнуў з аўто і накіраваўся да дома, ля якога шчыраваў гаспадар.

Рабочы паглядзеў на ладную сядзібу, перавёў позірк на велічны драўляны крыж, які ўжо не першы год ахоўваў жыхароў ад шатана, бядотаў і балячак, і павітаўся:

— Здароў, Іван. Як жыццё-быццё сялянскае?

— Дык як можам, так і жывём, — усміхнуўся гаспадар нечаканаму госцю. — Вось і на ферму трэба ісці працаваць.

— Слухай, я вось па якім пытанні, Матусевіч, — пачаў кіроўца. — Ты ж як і мы, сур'ёзны чалавек, дык давай знімі крыж, каб не муляў, не псаваў карціны. А мы ўзамен шыферу табе на дах дадзім. Глядзі, колькі прывезлі.

Гаспадар паглядзеў на крыж, што ўзносіўся ў блакітнае неба, паглядзеў на машыну, на ўжо згорбленага жыццём рабочага і не без усмешкі адказаў:

— Не трэба мне вашага шыферу. Я і жалезам дах абкладу. А крыж няхай стаіць. Нікому ж ён не перашкаджае.

Пагаптаўся госць ля гаспадара, прамармытаў нешта сабе пад нос і пайшоў да машыны. Партыйнае заданне было завалена.

Магчыма, у кагосьці з нас падобная гісторыя не выклікае ніякай зацікаўленасці, маўляў, колькі такіх людзей было, якія і абразы хавалі, і крыжы адстойвалі. Але ж для вялікай сям'і Матусевічаў гэты крыж быў не толькі верай, але і надзеяй на лепшае чалавечае жыццё. Тым больш пасля таго, як пайшоў у лепшы свет бацька Іван... Тады ўсю працу на ферме і клопат на свае плечы ўзваліла маці, Ніна Аляксандраўна. Цяжка было жанчыне, але ж як інакш можна было пракарміць шматдзетную сям'ю? Толькі адданай працай... Аднак пры гэтым і на вучобу дзяцей яна не забывалася. І вось пад аховай гэтага крыжа вучыла іх добразычлівасці, павазе да мудрай кнігі... У такіх умовах, з Янкам Маўрам у заплечніку і пугай у руках на полі, і рос будучы настаўнік, кіраўнік аддзела адукацыі Дзяржынскага раёна і таленавіты тэарэтык педагогікі Вацлаў Матусевіч.

Вучоба ў дзвюх школках, універсітэт, у які трапіў з адной чацвёркай, але здолеў атрымаць Ленінскую стыпендыю! 90 рублёў былі на той час не абы якія грошы, да таго ж трэба было падтрымаць маці, якая здолела даць усім дзецям вышэйшую адукацыю. А калі ўлічыць, што ў сям'і Матусевічаў раслі восем заўжды цікавых галовак, то... То подзвіг гэта, і неацэнны.

Школа — «камітэт» маралі

Я нечакана пачуў, што сярод сваіх духоўных настаўнікаў-педагогаў Вацлаў Іванавіч вылучае Ілью Ульянава, які амаль усё жыццё будаваў школкі, і відаць «таму вырас Ленін рэвалюцыянерам, што бацька няшмат часу яму удзяляў». Але як быць, каб дзіця рупліва працавала, атрымлівала веды ў школе, нармальна развівалася і пры гэтым разумела выкладчыка? — пытанне сёння больш істотнае.

«Настаўнік павінен працаваць з вучням у звязцы. Толькі пры такіх абставінах будзе развівацца вучань, будзе развівацца настаўнік. Педагог вучыцца ўсё жыццё». Акрамя таго, «трэба, каб настаўнік любіў дзіця, бо калі ён будзе і разумным, інтэлектуальна адораным, але не здолее палюбіць вучня, то ніякай карысці яму як прафесіяналу не будзе». «Сваёй непаслухмянасцю вучні правяраюць

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»: Вацлаў МАТУСЕВІЧ — настаўнік фізікі, начальнік аддзела адукацыі Дзяржынскага раёна. Аўтар праграмы развіцця «Канцэптуальныя арыенціры: сістэмы адукацыі Дзяржынскага раёна». Узнагароджаны медалём імя Васіля Віткі.

педагагічныя бастыёны. Сёння іншае пакаленне дзяцей. Зусім не такое, як раней, — працягвае кіраўнік раённага аддзела адукацыі. — Дзеці выхоўваюцца на іншых каштоўнасцях і маюць права не разумець нас. Таму трэба ўмець ладзіць этыку ўзаемаадносінаў».

Уласныя думкі, прынцыпы развіцця сістэмы адукацыі Дзяржыншчыны Матусевіч выдаў асобнай брашурай. Збіраўся крыху змяніць адукацыйную працу, а ствараў арыенціры, якія будуць карысныя не толькі ў яго раёне, але і ва ўсёй рэспубліцы. Адзін з настаўніцкіх часопісаў за плённую працу назваў спадара Матусевіча «патрыярхам адукацыі».

— Галоўныя прыярытэты — гэта духоўнае адраджэнне асобы, каб з самага дзяцінства вучыліся любіць родную зямлю, культуру, — разважае Вацлаў Іванавіч. — Але ж дзяцей трэба і вучыць на пэўным узроўні. Дарэчы, а вось хто ў нас у краіне адказвае за мараль? У Польшчы — касцёл, у Злучаным Каралеўстве — каралева. А ў Беларусі гэтае месца можа заняць школа. Тым больш, калі мы імкнёмся выхоўваць дзяцей маральнымі».

Без «абавязалаўкі»

Цікава, што кожная школка на Дзяржыншчыне мае спецыяльны профіль. Згодна з ім, дзеці вывучаюць народныя традыцыі, родны край, экалогію, гісторыю. І ўсё гэта робіцца па індывідуальна створаных праграмах. Для папулярызацыі мастацтва ўжо не першы год у Дзяржынску праводзяць «Літаратурны баль», дзе вучні пераапранаюцца і ператвараюцца ў знаёмых нам герояў роднай і замежнай літаратуры. Усё тут дыхае шчырым беларускім адраджэннем і няма той прымусовай і недарэчнай «абавязалаўкі», якую з кіслым тварамі выконваюць падлеткі ў іншых школах Беларусі.

І галоўнае, школа абыходзіцца без так папулярных цяпер еўрарамонтаў, але своеасаблівы шарм гімназіі стварае сад, у прыгажосці якога яна хаваецца.

— Мы не выбіралі спецыяльна экалагічны профіль дзейнасці, каб вучыць дзяцей экалогіі. Рыхтаваць да іспытаў у ВНУ, — кажа дырэктар гімназіі № 1 Лілія Іванаўна Сакалоўская. — Жывём мы ў краіне, дзе прывыклі працаваць на зямлі...

P.S. Стары крыж Матусевічаў крыху схіліўся да зямлі. Каля яго калісьці жагнаўся яшчэ маленькі Вацлаў Матусевіч. Прайшло колькі часу і ўжо сталым ён дзеліцца з усімі сваёй духоўнай, разумнай і моцнай думкай, адраджаючы нашу школу, нашых дзетак. Няхай стаіць стары крыж, што перажыў усе цяжкасці мінулых гадоў, няхай і светлыя ідэі Матусевіча перажывуць саміх нас...

Тарас ШЧЫРЫ.

БЫЦЬ ВІДУШЧЫМ

Распрацаваны Матусевічам дакумент па сваім значэнні перарос рамкі адукацыйнай прасторы раёна. Гэта дарога пошукаў і здзяйсненняў, глыбокага роздуму над тым, якой павінна быць беларуская школа. Канцэптуальныя арыенціры развіцця сістэмы адукацыі Дзяржынскага раёна заснаваныя на прынцыпах народнай педагогікі, адвечных духоўных каштоўнасцях беларусаў.

Каштоўнаснае ядро дакумента — ***педагогіка падтрымкі асобы дзіцяці,*** раскрыццё яго прыроднай адоранасці.

Маецца на мэце такая арганізацыя працы, якая дазволіць дайсці да кожнага дзіцяці, дакрануцца да яго ўнутранага свету, заручыцца яго даверам, дамагчыся своеасаблівай сацыяльнай роднасці, духоўнай блізкасці, якімі заўсёды вызначалася традыцыйная народная побытавая культура, каб адукацыя стала сапраўды сумеснай справай настаўніка і вучня.

Атланты і карыятыды любой сістэмы працы — традыцыі. За папулярызацыю беларускай культуры, мовы, беларускіх дзіцячых выданняў начальнік аддзела адукацыі В.І. Матусевіч узнагароджаны медалём Васіля Віткі.

Прыгожая рамантычная традыцыя ў раёне — ладзіць вясною баль літаратурных герояў. Ён засведчыў, што ў беларускай літаратуры нямала твораў, вартых увагі, драматызацыі, увасаблення праз успрыманне сучаснікаў, твораў, што дазваляюць вучням пачуць сябе нашчадкамі сваіх вялікіх прашчураў, спадчыннікамі слаўнай гісторыі. Так нараджаецца і выспявае сапраўдная ***нацыянальная самасвядомасць,*** гонар за прыналежнасць да свайго роду, без якога не можа быць гаворкі пра сапраўдную чалавечую годнасць і сцвярджэнне сябе як асобы, грамадзяніна і сем'яніна, бо чалавечае станаўленне і ўсведамленне сваёй унікальнасці адбываецца ва ўлонні роднай культуры. 26-ы год у раёне праводзіўся і раённы баль выпускнікоў. Ён даўно ўжо стаў агульнагарадскім святам — на яго збіраюцца гараджане, запрашаюцца прадстаўнікі муніцыпальных уладных структур, святары праваслаўнай і каталіцкай канфесій, дзеячы культуры і мастацтва, навукі, шматлікія госці з ліку ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, педагагічнай працы, знакамітыя выпускнікі ўстаноў адукацыі Дзяржыншчыны. І 20-ы раз з прывітальным словам да выпускнікоў звярнуўся начальнік аддзела адукацыі Вацлаў Матусевіч.

Восенню на Дзяржыншчыне ладзяць Настаўніцкі баль — на свята працы педагогаў.

«Багацце духоўнае — злата дзяржавы», — вуснамі вялікага Вітаўта сцвярджаў Мікола Гусоўскі, называючы час праўлення мудрага князя залатым векам беларускай дзяржаўнасці. Адсюль вынікае і значнасць настаўніцкай працы, і значнасць свята працы работнікаў адукацыі Дзяржыншчыны. «Ідзе па зямлі Настаўнік... Каб не згасала сонца чалавечага сумлення, каб шчырыя пачуцці не ператвараліся ў танныя бранзалеткі, а словы — у звон медзякоў... *Ідзе па зямлі Настаўнік... Каб збыцца ў сваіх вучнях... Ідзе па зямлі Настаўнік... Асветар... Той, хто нясе свет...»*, — так пра значэнне настаўніка ў адукацыйнай прасторы сучаснага грамадства і значнасць яго працы сказаў на адным з апошніх святаў Вацлаў Іванавіч Матусевіч.

У кожнай з 25 устаноў адукацыі Дзяржыншчыны працуе школьны музей — 9 гісторыка-краязнаўчых музеяў, 5 краязнаўчых, 5 этнаграфічных, 1 экалагічны, 1 музей баявой славы, 1 музей гісторыі і працоўнай славы чыгуначнай станцыі «Негарэлае» і іншыя. Ва ўсіх музеях выстаўленыя экспазіцыі, прысвечаныя гісторыі школы, горада (вёскі), ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і працы, знакамітым землякам — Міколу Ермаловічу, Карусю Каганцу, Ніне Жыбрык, Мікалаю Улашчыку, Святой Валянціне Мінскай, Каралю Чапскаму, Алесю Рыбаку і іншым. Адкрыты і віртуальны музей на сайце аддзела адукацыі. Навасёлкаўскі вучэбна-педагагічны комплекс стаў рэспубліканскай пляцоўкай па рэалізацыі інавацыйнага праекта «Выхаванне вучняў сродкамі музейнай педагогікі».

У красавіку—маі 2008-2009 навучальнага года праведзены фестываль педагагічных ідэй «Каб адной чы адбыцца. І збыцца...», у якім прыняло ўдзел 13 устаноў адукацыі. Вынікі фестывалю былі падведзены на навукова-практычнай канферэнцыі «Развіццё асобы дзіцяці ў сістэме інавацыйнай адукацыі». Па матэрыялах форуму рыхтуецца да выхаду ў свет метадычны зборнік. Начальнік аддзела адукацыі клапоціцца пра выданне кніг з серыі «Гісторыя адукацыі Дзяржыншчыны», паэтычных зборнікаў педагогаў-аўтараў, знаходзіць сродкі для таго, каб адукацыйныя ўстановы былі падключаныя да інтэрнэту, ён зацікаўлены ў творчых сустрэчах з дзеячамі культуры і мастацтва, навукі...

Сёння сістэма адукацыі Дзяржыншчыны — гэта школа прафесіяналізму і творчасці, метадычная прастора, адкрытая для знаёмства з эфектыўнай педагагічнай практыкай, для супрацоўніцтва ў інтарэсах развіцця асобы дзіцяці.

Бо дзіця — гэта сонца, дзіця — абраз, дзіця — найвялікшая каштоўнасць і сэнс усякай педагагічнай дзейнасці. Любоў да дзяцей — свайго роду рэлігія.

Фаіна КАЧАНОВІЧ.

ШКОЛА —
ГЭТА НАЙПЕРШ НАСТАЎНІКІ

Не стану крывіць душой: цяпер, у сталым узросце, не з такім душэўным хваляваннем сустракаю 1 верасня, як гэта было калісьці, у школьныя гады. Але і зараз, калі ва ўніверсітэцкай аўдыторыі ў гэты дзень бачу цікаўныя і зацікаўленыя вочы першакурснікаў, учарашніх школьнікаў, цёплая хваля прыхлынае да сэрца, галава поўніцца ўспамінамі больш чым паўвекавой даўнасці.

...Ракаўская сярэдняя школа, што ў Валожынскім раёне. Стары, яшчэ царскіх часоў будынак былога рамесніка вучылішча, з тоўстымі цаглянымі сценамі, высокімі венскімі вокнамі, вялікім, на ўвесь дом, глыбокім падвалам. Летнія канікулы мільгалі вакамгненна, жадалася іх падоўжыць, надтачыць, але ж і хацелася ў школу. Там — знаёмы клас, сябры з капой навін, новыя падручнікі з невядомымі яшчэ ведамі і — любімыя настаўнікі, якіх не бачылі цэлае лета. Відаць, сустрэча з імі, настаўнікамі, найбольш вабіла ў школу кожнае Першае верасня.

На настаўніка мне пашанцавала. Гонар школы высока трымаў яе дырэктар Васіль Пятровіч Налецкі. Чарнявы прыгажун, красамоўца з добра пастаўленым голасам (да вайны ён адзін час працаваў на Беларускім радыё), былы партызанскі сувязны (яго родны брат Міша быў камісарам мясцовага партызанскага атрада), Васіль Пятровіч выкладаў гісторыю. Разам з тым ён актыўна займаўся краязнаўствам: выступаў перад насельніцтвам з дакладамі па гісторыі і культуры Валожыншчыны, часта друкаваўся ў раённай газеце. Ён не толькі выдатна ведаў свой прадмет, але і любіў яго (што не менш важна!), зараджаў гэтай любоўю нас, школьнікаў. І не толькі на ўроках гісторыі, але і ў пазакласны час. Пад яго кіраўніцтвам мы вялі раскопкі, збіралі экспанаты для школьнага краязнаўчага музея, што размясціўся ў адрамантаваным і дагледжаным падвале. Па сутнасці, як я цяпер разумею, з нас Васіль Пятровіч гадаваў радзімазнаўцаў і радзімалюбаў. І зусім слушна, што цяперашні краязнаўчы музей у новым будынку школы носіць імя В.П. Налецкага.

Другой знакавай асобай школы быў настаўнік матэматыкі Мікалай Уладзіміравіч Мяцельскі. Здаецца, «сухі» прадмет, але як умела і даходліва «размочваў» ён тэарэмы, задачы, формулы на сакавітай беларускай мове, нарэдка з дапамогай трапнага народнага выслоўя, вобразнага параўнання! Мікалай Уладзіміравіч пастаянна арганізоўваў у школе матэматычныя алімпіяды, «тэставыя» спаборніцтвы паміж паралельнымі класамі, вазіў нас на раённыя і абласныя алімпіяды. Прызнаюся: з мяне як лепшага вучня класа ён гадаваў матэматыка. Не ведаю, што з гэтага выйшла б, ды я не толькі стараўся рашаць самыя складаныя задачы, але папісваў вершы, пачаў друкавацца — перамагло прыгожае пісьменства, паступіў на філфак. Дарэчы, у БДУ з Мікалаем Уладзіміравічам мы сустрэліся ўжо як калегі: з часам ён стаў доктарам фізіка-матэматычных навук, прафесарам універсітэта...

Калі я вучыўся ў старэйшых класах, у школу працаваць прыехалі таленавітыя маладыя педагогі. Гэта выпускнікі БДУ сужэнцы Зінаіда Аляксееўна і Аляксей Лук'янавіч Зяневічы. Зінаіда Аляксееўна, аднакашніца Ніла Гілевіча па ўніверсітэце, стала выкладаць рускую мову і літаратуру, Аляксей Лук'янавіч — геаграфію (яго, дарэчы, прызначылі і завучам школы). Мы, школьнікі, адразу іх палюбілі — за глыбокія веды, жаданне і ўменне данесці іх да самага лянівага вучня, за шчыры беларускі патрыятызм, які прамяніўся праз, здавалася б, далекаватыя ад беларушчыны прадметы. Пра тое, што людзі гэтыя былі таксама неардынарныя, сведчаць хаця б такія факты: з часам Аляксей Лук'янавіч стаў кандыдатам эканамічных навук, да сваёй заўчаснай смерці працаваў у Беларускім навукова-даследчым інстытуце эканомікі, а Зінаіда Аляксееўна, кандыдат філалагічных навук, працуе ў БДУ на пасадзе дацэнта і зараз...

Я назваў толькі некалькі настаўнікаў, асобаў з вялікай літары, якія вызначалі воблік Ракаўскай СШ. Часам дастаткова адной такой асобы, каб вучні пасля маглі ганарыцца і школай, і цэлым настаўніцкім калектывам. А тут — цэлае суквецце. Прычым,

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Краіна здароўя

Выпуск № 32 (146)

Хадзі — і будзеш здаровы!

У выніку шматгадовых даследаванняў і назіранняў урачы даказалі: хада ў дастаткова энергічным тэмпе на працягу 30 хвілін 5—6 разоў на тыдзень можа выратаваць вас ад цэлага «букета» захворванняў! Ну, а калі вам цяжка выдзеліць на гэта паўгадзіны «адным кавалкам», ёсць другі варыянт: хуткая хада 3—4 разы на дзень па 10 хвілін такая ж карысная, як і бесперапынная хада на працягу паўгадзіны.

Хваробы сэрца. Сэрца — гэта мышца. І паколькі хада прымушае кроў бегчы праз сардэчную мышцу хутчэй, то тым самым сэрца «трэніруецца». Хада паніжае крывяны ціск, дзякуючы чаму змяншаецца нагрузка на артэрыі. Кроў становіцца менш «цягучай» і «ліпкай», а гэта змяншае верагоднасць утварэння ў ёй тромбаў. У выніку рызыка сардэчных прыступаў скарачаецца на 50 працэнтаў.

Інсульт. Выяўлена: той, хто ходзіць пешшу 6 і больш гадзін на тыдзень, зніжае для сябе рызыку інсульту на 40 працэнтаў.

Артрыт. Хада змяншае артрытныя болі ў каленях дзякуючы ўмацаванню мышцаў, якія ахопліваюць сустаў. А хада ў вадзе (басейне, рацэ, возеры) і практыкаванні з гантэлямі (праз дзень!) могуць увогуле зрабіць цуд і пазбавіць вас ад боляў назаўсёды.

Лішняя вага. Энергічная хада на працягу 30 хвілін спальвае 200 калорый і павышае інтэнсіўнасць абмену рэчываў у астатні час сутак, актыўна дапамагаючы вам захаваць або набыць стройнасць фігуры.

Дэпрэсія. Безумоўна, антыдэпрэсанты дзейнічаюць хутчэй, але вучоныя выявілі і такую цікавую рэч: праз 9 месяцаў для дэпрэсіўных пацыентаў, якія не прымалі медыкаментаў, а займаліся аздараўляльнай фізкультурай, рызыка рэцыдыву значна змяншалася ў параўнанні з тымі, хто абмяжоўваўся толькі медыкаментамі.

КАЛІ ВЫ ВЫРАШЫЛІ ПАЧАЦЬ

- Правільна падбірайце абутак для хады. Аптымальны варыянт — зручныя і свабодныя туфлі або красоўкі.
- Каб не балелі мышцы, пачынайце хаду не спяшаючыся і пасля 5-хвіліннай размінкі (нахілы ў бакі, прысяданні, пацягванні).
- Уключайце хаду ў свой распарадак дня (напрыклад, паркуйце машыну не каля працы або крамы, а на некалькі кварталаў далей; падымайцеся не на ліфце, а пешшу, па лесвіцы і г.д.).
- Вядзіце дзённік: запісвайце, якую адлегласць і за які час вы прайшлі на працягу дня. Калі праз пэўны час вашы вынікі стануць паляпшацца, гэта створыць дадатковы стымул для заняткаў.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Прафілактыка

КАЛІ МАЎЧАННЕ — ЗОЛАТА...

Чалавечы голас — гэта інструмент самавыяўлення. Па ім можна вызначыць пол чалавека, настрой, на голасе адбіваюцца захворванні розных сістэм арганізма. Для многіх ён яшчэ і рабочы інструмент. Спевакі, артысты, дыктары, выкладчыкі, менеджары, палітыкі эксплуатуюць свае галасавыя звязкі практычна з пачатку і да канца працоўнага дня. Як захаваць галасавыя здольнасці, якія фактычна кормяць, як зрабіць так, каб голас заўсёды гучаў роўна і прыгожа? Аб гэтым нам расказала загадчыца фаніятрычнага аддзялення РНПЦ «Оториноларингология», урач-фаніятр Наталля КАНОЙКА.

— Спачатку крыху анатоміі. Сам па сабе гук, з якога потым фарміруецца голас чалавека, утвараецца ў гартані. Але, калі б ён утвараўся толькі вібрацыяй галасавых складак, то гэта быў бы манатонны, бясформенны, непрыгожы гул. Індывідуальны ж голас чалавека фарміруецца з дапамогай галасавога апарату, у які, акрамя гартані, уваходзяць яшчэ рэзанатарныя поласці: нос, прыдатачныя пазухі, трахея, бронхі. Таму ад стану артыкуляцыйнага апарату залежыць якасць, прыгажосць, трываласць голасу, а гэта вельмі важна для прафесіяналаў маўлення.

— Чаго ім трэба апасацца, выкарыстоўваючы свой галасавы апарат у рабоце?

— У першую чаргу, «вораг» галасавых складак — гэта запаленчыя захворванні слізістай верхніх дыхальных шляхоў, вострыя і хранічныя. Калі галасавы апарат пастаянна знаходзіцца ў разгарачаным стане, ён больш падвергнуты запаленчым працэсам, што можа прывесці да хранічных рынітаў, сінусітаў, ларынгітаў і г.д. А гэта адлюстроўваецца на гучнасці, палёце, моцы голасу. У спевакоў, якія маюць хранічныя захворванні носа і яго пазух, губляецца аб'ём гуку, ім цяжка ўзяць высокія ноткі. Пры хваробах глоткі, вялікіх адэноідах, скрыўленні насавой перагародкі голас становіцца гамзатым.

Акрамя таго да розных галасавых праблем прыводзяць расстройствы нервовай сістэмы, гарманальныя парушэнні, паталогія шчытападобнай залозы.

Вядома, напрыклад, што падчас «крытычных дзён» у жанчын голас можа змяняцца, бо гарманальны статус і голас вельмі цесна ўзаемазвязаныя. Таму на першыя тры дні гэтага перыяду прафесіянальным спявачкам дазволена браць адгул.

— Якія практычныя рэкамендацыі дапамогуць зберагчы голас людзям маўленчых прафесій, ды і не толькі ім?

— Як я ўжо сказала, асноўны фактар, які адмоўна адбіваецца на голасе, — гэта прастудныя захворванні. А самае галоўнае — работа ў прастуджаным стане. Часта па дапамогу да нас звяртаюцца педагогі з вельмі запушчанай сітуацыяй. Яны па розных прычынах не маглі зменшыць маўленчыя нагрузкі ці ўвогуле на нейкі час адмовіцца ад іх. А з-за сіпаты прастуджаны педагог імкнецца гаварыць гучней і гучней, каб завалодаць увагай класа, зрывае голас і потым вымушаны працягла і сур'ёзна лячыцца. Празмерныя маўленчыя нагрузкі могуць прывадзіць да арганічных і функцыйных парушэнняў голасу. Напрыклад, на галасавых складках з'яўляюцца вузельчыкі ці «галасавыя мазалі». Таксама магчымае з'яўленне ў гартані і іншых дабраякасных новаўтварэнняў: паліпаў, фібраміёмаў. А яны ўжо патрабуюць хірургічнага лячэння. Таму правіла першае: падчас прастуды, пры дыскамфорце ў горле — замаўчаць. Гэта той выпадак, калі маўчанне — золата.

Па-другое. Вельмі важна захоўваць галасавы рэжым. Нагрузка на голас павінна быць рацыянальна размеркаваная. Напрыклад, спевакі-пачаткоўцы могуць спяваць не больш за гадзіну з двума перапынкамі па 5 хвілін, а прафесіяналам можна спяваць бесперапынна 45—60 хвілін.

Педагогі, каб іх голас выкарыстоўваўся без шкоды для якасці працы, павінны працаваць не больш за 4 акадэмічныя гадзіны ў дзень, з перапынкамі па 15 хвілін паміж імі.

У рэальнасці часта бывае інакш. Скажам, выкладчык ВНУ першую палову тыдня вядзе лекцыйную работу, а другую — адпачывае. Такая нерацыянальная галасавая нагрузка можа прывесці да функцыйных парушэнняў голасу, калі няма зменаў з боку галасавых складак, а ёсць толькі парушэнні тонусу. Калі ж у гэты перыяд чалавек не звернецца да спецыялістаў, то ўзнікае незваротная сіпатасць. Такую паталогію цяжка лячыць. Пры ёй трэба захоўваць рэжым маўчання, выключыць шыпучыя напоі, алкаголь, вострыя стравы, чыпсы, салёныя, перчаныя арэшкі. У гэты ж перыяд пацыентам прызначаюць фізіяпрацэдуры, таксама праводзяцца заняткі з педагогам па пастаноўцы голасу для таго, каб змяніць манеру гаварыць. Але працэс рэабілітацыі дастаткова працяглы.

Абавязкова трэба адмовіцца ад курэння, якое шкодзіць голасу. Ацякае слізістая гартані, галасавыя складкі становяцца набухлымі, узнікаюць застойныя з'явы ў слізістай гартані, часам незваротныя. Ёсць нават такі дыягназ — «ларынгіт курца».

Трэба пазбягаць рэзкай змены тэмператур. Пасля нейкага выступлення, курсу лекцый нельга адразу выходзіць на вуліцу. Неабходна пачакаць 20—30 хвілін, каб галасавы апарат крыху астудзіўся. А калі вам трэба выступаць у цёплым памяшканні пасля халоднага, то трэба прыйсці раней і не пачынаць адразу працаваць голасам.

Хачу падкрэсліць і наступнае. Пачынаць клапаціцца аб галасавых здольнасцях трэба ў раннія гады. Вядома, што ў сем'ях, дзе стасункі ідуць на павышаных тонах, дзіця хутка прывыкае крычаць само. А ў выніку ў дзяцей часта ўтвараюцца вузельчыкі галасавых складак, т. зв. «вузельчыкі крыкуна».

— Дапусцім, у чалавека прыгожы голас, ён не адчувае дыскамфорту ў галасавым апараце. З дапамогай чаго вы параіце яму падтрымліваць гэты стан?

— Перад тым, як трымаць доўгую прамову, не трэба перагружаць страўнік — інакш цяжка будзе захаваць рытмічнае дыханне. Перад выступленнем рэкамендавана выпіць цёплы чай з цукрам, або цёплае малако, някіслы яблычны сок ці свежавыціснуты сок з морквы.

Не захапляйцеся ментолавымі пасцілкамі, бо ментол раздражняе і высушвае слізістую. Лепш выкарыстоўваць пасцілкі з эўкаліптам, шалфеем, адвар рамонку. Калі няма паталогіі шчытападобнай залозы, пасля вялікай галасавой нагрузкі вечарам можна зрабіць кампрэс з падагрэтага алею на пярэднюю паверхню шыі. Такі кампрэс добра танізуе і расслабляе галасавы апарат.

— У якіх выпадках голас «падказвае», што трэба звярнуцца да спецыяліста?

— Да оталарынголага абавязкова трэба звяртацца, калі вы заўважылі нейкія змены ў голасе: ён іншы па тэмбры, вам здаецца, што ён стаў непрыгожым, пры размове з'яўляюцца адчуванне камяка ў горле, жаданне адкашляцца, сіпатасць.

— Як можна трапіць на кансультацыю ў РНПЦ «Оториноларингология»?

— Для гэтага трэба ўзяць накіраванне ў лор-урача па месцы жыхарства або ва ўчастковага тэрапеўта. Без накіравання можна скарыстацца платнымі паслугамі і запісацца на кансультацыю. Мы знаходзімся па адрасе: г. Мінск, вул. Сухая, 8.

Вольга ШАЎКО.

ЗА ДВА ГАДЫ — У ДВА РАЗЫ

Фотафакт

У мяне скончыліся таблеткі «Тэрапіну» (амерыканскі аспірын), якія я ўжываю звычайна пры прастудзе. І прастудзіўся якраз.

Пайшоў у аптэку, набыў новую ўпакоўку — аддаў 6300 рублёў. Вярнуўся дадому, дапіў апошнюю таблетку са старой — і раптам заўважыў цэтлік з коштам. У 2007 годзе «Тэрапін» каштаваў 3460 рублёў, цяпер — 6300. Даражэй амаль у два разы (а калі дакладна — на 82 працэнты!) А, помніцца, нядаўна хто-ніхто казаў, што за згаданы перыяд лекі падаражэлі ўсяго на 20 працэнтаў...

Глеб ЛАБАДЗЕНКА. Фота аўтара.

Каментарыі спецыяліста:

Алена ДАШКЕВІЧ, намеснік начальніка аддзела цэнаў і тарыфаў у невытворчай галіне Дэпартамента цэнаснай палітыкі Міністэрства эканомікі:

— Міністэрства эканомікі рэгулюе адпускныя цэны на лекавыя сродкі айчыннай вытворчасці па пераліку, вызначанаму Саветам Міністраў. У гэты пералік уключаны асноўныя сродкі для лячэння сардэчна-сасудзістых захворванняў, супрацьмікробныя сродкі — антыбіётыкі, асобныя супрацьпухлінныя, імунабіялагічныя і іншыя сродкі. Рэгуляванне адпускных цэнаў міністэрства ажыццяўляе шляхам зацвярджэння фіксаваных цэнаў, якія павінны прымяняцца прадпрыемствамі для разліку з усімі спажыўцамі рэспублікі.

Цэны на лекавыя сродкі і медыцынскія тавары ў галіне аптоўага і рознічнага гандлю фарміруюцца згодна з адпаведным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Указам вызначаны адзіны парадак фарміравання цэнаў на лекавыя сродкі як айчыннай, так і замежнай вытворчасці. Цэны на лекавыя сродкі айчыннай вытворчасці ў аптовым звяне фарміруюцца шляхам складання адпускной цаны вытворцы (на лекавыя сродкі замежнай вытворчасці — разліковай адпускной цаны) і аптовай надбаўкі. У рознічным звяне цэны вызначаюцца шляхам складання адпускной цаны (на лекавыя сродкі замежнай вытворчасці — разліковай адпускной цаны), аптовай надбаўкі (пры набыцці тавару ў пасярэдніка) і гандлёвай надбаўкі. Гранічныя памеры аптовых і гандлёвых надбавак для лекавых сродкаў айчыннай і замежнай вытворчасці вызначаны на адзіным узроўні. Пры гэтым памеры гранічных аптовых і гандлёвых надбавак дыферэнцыяваныя ў залежнасці ад кошту лекавых сродкаў у доларавым эквіваленце такім чынам, што чым таннейшыя прэпараты, тым вышэйшы памер надбавак у працэнтах.

Дзеючы парадак цэнаўтварэння забяспечвае роўныя ўмовы канкурэнцыі на рынку айчынным і замежным лекавым сродкам, дазваляе забяспечыць суб'ектам гаспадарання прыкладна аднолькава выгадныя ўмовы для гандлю лекамі рознага кошту і не прыводзіць да «вымывання» з аптэк танных лекавых сродкаў.

ПАДАЙ РУКУ ДАПАМОГІ!

Дабрачынная акцыя «Малюем веды!» адбылася напярэдадні новага навучальнага года ў Гродзенскім гарадскім парку імя Жана Эмануэля Жылібера з мэтай прыцягнуць увагу грамадскасці да дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі і асаблівасцямі фізічнага і псіхічнага стану здароўя.

Акцыю наладзілі грамадская дабрачынная арганізацыя «Гродзенскі дзіцячы хоспіс», сацыяльны аддзел Гродзенскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы і Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі. Спачатку праваслаўны і каталіцкі святары адслужылі малебен блаславення дзяцей на новы навучальны год. А потым дзеці, у тым ліку і на інвалідных калясках, удзельнічалі ў танцавальнай і гульнявых праграмах — караоке-клуб, малюнак на мальберце, лепка з салёнага цеста... І ўсё гэта — у сяброўскай кампаніі з валанцёрамі хоспіса і мімамі.

«Гродзенскі дзіцячы хоспіс» аказвае комплексную медыка-сацыяльную, псіхалагічную, духоўную дапамогу цяжка і невылечна хворым дзецям, а таксама іх сем'ям. Гэта грамадская дабрачынная арганізацыя будзе ўдзячная за любую падтрымку і матэрыяльную дапамогу для набыцця сродкаў гігіены, адзення, абсталявання, цацак для хворых дзяцей. *Кантактныя тэл.: (0152) 48 59 05, (029) 7 844 887.*

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

РЫБІН ТЛУШЧ папярэдзіць інфаркт

Рыбін тлушч... Для многіх з нас гэта словазлучэнне ператварылася ў сінонім «нясмачнага, але вельмі карыснага». Так, рыбін тлушч лічыцца адным з лепшых сродкаў для аднаўлення сілаў пасля хваробы, а нядаўна адкрытыя яшчэ некалькі новых вартасцяў гэтага прадукту.

Што ж такое рыбін тлушч?

Дзесяцігоддзямі яго атрымлівалі з печані рыб, у першую чаргу траскі. А складаецца ён у асноўным з поліненасычаных тлустых кіслот групы амега-3. Гэтыя кіслоты вельмі актыўныя і, трапіўшы ў наш арганізм, нейтралізуюць і выводзяць шкодныя злучэнні, якія паступаюць з ежай або ўтвараюцца ў выніку абмену рэчываў. Да іх можна аднесці так званыя перадракавыя клеткі, з якіх з часам можа развіцца пухліна.

Рыбін тлушч па-ранейшаму з'яўляецца выдатнай натуральнай крыніцай вітамінаў A і D. Першы падтрымлівае імунітэт, дапамагае змагацца з інфекцыямі, захоўвае вастрыню зроку і гладкасць скуры; другі ўмацоўвае косці і зубы, змяншае верагоднасць сутаргаў ікраножных мышцаў.

А кардыёлагі адзначаюць: рэгулярны прыём рыбінага тлушчу змяншае рызыку інфаркту міякарда на 15 працэнтаў. Амега-3-тлустыя кіслоты, якія змяшчаюцца ў тлустых гатунках рыбы, паляпшаюць кровазабеспячэнне сэрца, галаўнога мозга і не даюць халестэрыну замацоўвацца на сценках сасудаў. Рыбін тлушч аказвае супрацьатэрасклератычнае дзеянне.

Акрамя таго, рыбін тлушч павышае ўтрыманне ў арганізме гармону добрага настрою — сератаніну, які здольны зніжаць агрэсіўнасць, ліквідаваць наступствы стрэсу.

Рыбін тлушч істотна змяншае шкоду, якая наносіцца мозгу алкаголем, а таксама выконвае ахоўную ролю пры хваробах мозга, што вядуць да страты памяці. Так, выяўлена, што мозг людзей, якія пакутуюць ад хваробы Альцгеймера, бедны на тлустыя кіслоты амега-3.

Няма плюсоў без мінусаў

Як гаварылася вышэй, доўгі час асноўнай крыніцай рыбінага тлушчу была печань, у якой накопліваліся не толькі вітаміны, але і розныя атрутныя рэчывы з марской вады. Таму цяпер прадукт усё часцей атрымліваюць з мышцаў рыбы. Гэты рыбін тлушч таксама багаты на амега-3-кіслоты і добра падыходзіць для працяглага прафілактычнага прыёму.

Галоўным мінусам рыбінага тлушчу заўсёды былі непрыемныя смак і пах. Па гэтай прычыне сучасныя вытворцы «хаваюць» яго ў капсулы — праглынуў і не зморшчыўся. Або ўдасканальваюць рознымі смакавымі дабаўкамі і пахкімі рэчывамі, што на лекавых вартасцях ніяк не адбіваецца.

У аптэках прадаецца «абагачаны» рыбін тлушч, у які дадаткова дадаюць чысты вітамін A або D. Прымаць яго варта толькі па назначэнні ўрача: ён, у адрозненне ад натуральнага, у вялікай колькасці прыводзіць да ўскладненняў.

Не варта блытаць «абагачаны» вітамінамі і камбінаваны рыбін тлушч. У апошні ўводзяць розныя алеі натуральнага паходжання: абляпіхі, шыпшыны, зародкаў пшаніцы і інш. Такім чынам вытворцы стараюцца дапоўніць свой прадукт вітамінамі або мінеральнымі рэчывамі.

Медыкі не рэкамендуюць захапляцца рыбіным тлушчам пры захворваннях печані, жоўцевых шляхоў, падстраўнікавай залозы, а таксама з асцярожнасцю ўжываць яго пры астме і хранічных гастрытах. Паколькі ён крыху разрэджвае кроў, яго нельга спалучаць з аспірынам, які аказвае такое ж дзеянне: часам пачынаюць кроватачыць дзясны, доўга не загойваюцца ранкі і драпіны.

Памятайце! Рыбін тлушч — гэта лекавы прэпарат, таму перад тым, як пачаць прымаць яго, абавязкова парайцеся з урачом.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

БЫВАЙ, ЛЕТА! або Як пазбегнуць восеньскай дэпрэсіі

Апошнія летнія дзянькі папесцілі нас цяплом, прынеслі пазітыўныя эмоцыі і проста ўзнялі настрой. Напярэдзе ж — капрызная і плаксівая восень, з надыходам якой у многіх на душы ва ўнісон з парой года без бачнай прычыны становіцца «слотна і маркотна». Рэдкі чалавек, нават самы жыццярадасны і вясёлы, не адчувае восенню прыступаў нуды: з'яўляюцца беспрычынны сум, абыякавае стаўленне да ўсяго, а таксама цяжкае пачуццё віны і імкненне да адзіноты. Гэта штогадовая восеньская незадаволенасць сабой і навакольнай рэчаіснасцю можа быць розная — ад лёгкага адчування неспакою да поўнай беспрасветнасці і нежадання што-небудзь рабіць. Псіхолагі сцвярджаюць: ад восеньскай дэпрэсіі пакутуе кожны пяты жыхар планеты, але калі загадзя падрыхтавацца, то цалкам верагодна, што вам удасца пазбегнуць асабістага з ёю знаёмства.

Восень, па логіцы, — час эмацыйнага спаду. Пасля летніх радасцяў, адпачынку і новых знаёмстваў чалавек эмацыйна знясільваецца, і як вынік — дэпрэсія. Аднак гэта зусім не азначае, што ўсе пагалоўна павінны ўпасці ў такі стан: усё залежыць ад псіхалагічных асаблівасцяў асобы. Акрамя таго, дэпрэсія непасрэдна звязаная са стаўленнем чалавека да рэчаіснасці: чым больш рэальна ён ацэньвае сябе, свае пачуцці, магчымасці, мэты, якія ён перад сабой ставіць, тым меншая верагоднасць таго, што чалавек упадзе ў дэпрэсію. Можна сказаць, што дэпрэсія ўзнікае па прычыне незадавальнення чалавекам сваіх патрэбаў.

Асноўнымі прыкметамі дэпрэсіўных станаў (менавіта іх, бо сама дэпрэсія — гэта сур'ёзнае захворванне, якое суправаджаецца парушэннямі многіх псіхічных і нават цялесных функцый чалавека) з'яўляюцца апатыя, прыгнечаны стан, нуда, адсутнасць апетыту, плаксівасць, бяссонніца або павышаная санлівасць. Прычым, як зазначаюць псіхолагі, змена настрою звычайна суправаджаецца зніжэннем актыўнасці, адчуваннем бяссілля, павышанай стамляльнасцю і няўважлівасцю.

Дэпрэсіўны стан можа назірацца ў любым узросце — і ў дарослых, і ў дзяцей. Заўважана, што больш схільныя да такіх станаў людзі, чыя праца звязаная са зносінамі або абслугоўваннем. У гэтым выпадку адбываецца так званае перанасычэнне зносінамі або «псіхалагічнае выгаранне». Што датычыцца мужчын і жанчын, то тут зноў-такі ўсё індывідуальна. Жанчыны любяць расказваць пра свае праблемы і перажыванні. Мужчыны больш прывыклі ўсё трымаць у сабе, бо з пункту гледжання грамадства яны павінны быць моцнымі, ім нельга скардзіцца. Багатыя ўпадаюць у дэпрэсію таксама, як і бедныя, таму што ніякая колькасць грошай не можа забяспечыць унутранай задаволенасці, якая сама па сабе робіць жыццё радасным і каштоўным. Адзіныя, каго можна аднесці да групы рызыкі, — гэта адзінокія людзі.

Прычыны восеньскай дэпрэсіі вучоныя і медыкі аналізуюць ужо даўно. Адны лічаць, што ў хандры вінаватыя маларухомы лад жыцця і недахоп вітамінаў у арганізме. Другія перакананыя, што мы проста няправільна «выходзім з адпачынку». А некаторыя нават сцвярджаюць, што да дэпрэсіі прыводзяць залішняя сырасць і плесня ў доме. Маўляў, споры ядавітых мікраскапічных грыбкоў, якія з глебы трапляюць у нашы кватэры, паступова накопліваюцца, размнажаюцца ў цёплых і вільготных пакоях. Яны і прыводзяць да алергіі, задышкі, галаўных боляў, захворванняў скуры, вачэй і іншых непрыемнасцяў. Павышаная вільготнасць адмоўна адбіваецца і на якасці сну, выклікае адсутнасць апетыту і прыгнятае маральны стан чалавека. Адсюль — дэпрэсія.

Але ўсе пагаджаюцца: выратаванне тапельцаў — справа рук саміх тапельцаў. Гэта датычыцца і тых, хто «патанае» ў жыццёвых бурах. Псіхолагі сцвярджаюць, што, незалежна ад прычын, якія выклікалі восеньскую хандру, толькі сам чалавек можа дапамагчы сабе ачуняць. Таму перш чым бегчы да доктара і прасіць яго выпісаць заспакаяльнае або іншыя лекі, паспрабуйце самі справіцца з гэтым станам.

- Не стаўцеся да сябе быццам да біямашыны, якую трэба памыць—апрануць—пакарміць і выправіць на службу. Раніцай падымайцеся не ўпрытык, а загадзя, хвілін за 40 да патрэбнага часу. Кубачак кавы або гарбаты ў спакойнай абстаноўцы, прахалодны душ, любімая музыка — такое нармальнае стаўленне да самога сябе дапаможа вам адчуць сябе гаспадаром свайго жыцця.
- Не спрабуйце зняць нуду пры дапамозе алкаголю. Ад апошняга дрэнны настрой стане яшчэ горшым.
- Больш спіце. Сон — лепшае лякарства. Як правіла, людзі, якія знаходзяцца ў дэпрэсіўным стане, пакутуюць ад бяссонніцы, што яшчэ больш ускладняе іх самаадчуванне. Для найбольш карыснага і працяглага сну добра праветрывайце спальню і па магчымасці пакідайце фортку адчыненай. Гэта забяспечыць вам дастатковую колькасць кіслароду, адпаведна, вы даўжэй паспіце і прачняцеся бадзёрым.
- Не заставайцеся ў адзіноце. Баўце вольны час у коле іншых людзей. Старайцеся гаварыць з імі пра рэчы, якія не маюць дачынення да дэпрэсіі. Сустрэньцеся з блізкім сябрам і раскажыце яму, што ў вас у галаве. Калі гутарка пра вашы праблемы выклікае слёзы, не стрымлівайце іх.
- Развейцеся. Ваш дэпрэсіўны стан толькі ўскладніцца, калі вы будзеце сноўдацца па кватэры і хандрыць. Трэба выйсці з хаты. Няважна, чым вы вырашыце заняцца, толькі б чым-небудзь актыўным. Даследаванні паказваюць, што людзі, схільныя да дэпрэсіі, лепш сябе адчуваюць, калі рэгулярна займаюцца фізічнымі практыкаваннямі. Пераадолець маркоту дапамогуць заняткі на свежым паветры (бег трушком, хада, плаванне, веласіпедныя прагулкі). Запішыцеся ў спартзалу або басейн і замест таго, каб праплакаць увесь вечар перад тэлевізарам, гледзячы меладраму і заглушаючы свае перажыванні ласункамі, спаліце калорыі, займаючыся на трэнажорах або плаваючы. У выніку замест распухлых ад слёз вачэй і набору вагі вы палепшыце сваю фігуру, а гэта, пагадзіцеся, не можа не радаваць. Псіхолагі адзначаюць: прагляд тэлевізара не толькі не садзейнічае расслабленню, але, наадварот, шкодзіць самаадчуванню. Таму лепш, напрыклад, прыняць душ або цёплую ванну з пахкай пенай, таму што вада валодае сапраўды ўнікальнымі ўласцівасцямі. Яна нібы змывае адмоўныя эмоцыі. Да таго ж падчас мыцця галавы паляпшаецца кровазабеспячэнне мозгу.
- Жывіце сённяшнім днём. Мінулыя беды бяссільныя, яны ўжо не могуць нашкодзіць вам; забудзьцеся пра крыўды і паразы, не верадзіце раны, не ўспамінайце пра тое, што ўжо не вярнуць.

Не варта палохаць сябе і фантомамі магчымых бедаў. Будучыня толькі адна, а напрыдумляць можна цэлую сотню няшчасцяў, большасць з якіх ніколі не адбудзецца.

- Умацоўвайце імунітэт. Паспрабуйце ўзбадзёрыцца рознымі прыроднымі стымулятарамі: накшталт травяной гарбаты, фітабальзамаў, кітайскага лімонніку, адвару шыпшыны або настойкі элеўтэракоку. І працягвайце есці як мага больш свежай садавіны і агародніны. Не цешце сябе надзеяй, што летам вам удалося забяспечыць арганізм вітамінамі на цэлы год. Ведайце: вітаміны, якія трапілі ў арганізм, не адкладваюцца на запас, а адразу ж засвойваюцца, таму арганізму патрэбна пастаяннае вітаміннае сілкаванне. Для таго, каб пакрыць сутачную патрэбу арганізма ў вітамінах, трэба штодзень з'ядаць па 400 г садавіны і агародніны. Калі ў вас гэта не атрымліваецца, купіце ў аптэцы вітамінны комплекс.
- Абкружыце сябе прыгожымі рэчамі! Пасля разнастайнасці лета і колеравага багацця залатой восені нам будзе не хапаць прыгожага. «Эстэтычны голад» — гэта не пусты гук. Увогуле, яркія колеры прыкметна ўздымаюць настрой. Псіхолагі нават даказалі, што ў непагадзь самы падыходны колер — ярка-чырвоны. Не забывайце пра яркія дэталі ў гардэробе, дазвольце сабе якія-небудзь забаўныя дробязі: вясёленькую шапачку, пальчаткі, шалік. Купіце загарадную куртку якога-небудзь экстрэмальна-яркага колеру, асабліва калі па абавязку службы вы вымушаны насіць цёмную кансерватыўную вопратку.
- Часцей хадзіце ў тэатры і кіно.
- Змяніце інтэр'ер у доме. Навакольны светлавы фон моцна ўплывае на псіхічнае самаадчуванне. Таму пастарайцеся абкружыць сябе светлымі рэчамі, пераклеіць шпалеры і наогул максімальна змяніць абстаноўку, у якой вы знаходзіцеся большую частку сутак, на больш светлую і прасторную.

Дарэчы, восень (пры ўсіх яе недахопах) — цудоўная пара года. Проста трэба ўмець атрымліваць асалоду ад яе. Толькі восенню можна палюбавацца залаціста-барвовым лясным уборам, пахадзіць па апалай лістоце, якая шамаціць пад нагамі, і падыхаць гаючым восеньскім паветрам. Не прапусціце гэты шанц. І памятайце: мы самі гаспадары свайго настрою! Галоўнае — захацець назаўсёды развітацца з дэпрэсіяй і не пускаць яе ў сваё жыццё.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

НЕ ДЗЕЛЯ СЛАВЫ І ЎЗНАГАРОДАЎ

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

ішлі пад кулі салдаты Вялікай Айчыннай. За Радзіму! Абараняючы і вызваляючы Гродна ад фашыстаў, загінулі тысячы воінаў Чырвонай Арміі, падпольшчыкаў і партызанаў, мірных жыхароў. І Радзіма памятае сваіх сыноў і дачок, пра што сведчыць узнагароджанне горада над Нёманам вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны». Такога гонару Указам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ўдастоены 22 населеныя пункты нашай краіны.

На ўрачыстым мітынгу каля брацкай магілы воінаў-вызваліцеляў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Саўчанка ўручыў вымпел «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны» і ганаровую грамату кіраўніку выканаўчай улады абласнога цэнтра Барысу Казялкову. Хвілінай маўчання была ўшанавана памяць загінулых — Юрыя Іўлева, Вольгі Санфіравай, Міхаіла Курбатава і многіх іншых герояў, якія вызвалялі Гродна пад камандаваннем генералаў Аслікоўскага, Брыкеля, Глаголева, Болдзіна, падпольшчыкаў Мікалая Волкава, Васіля Разанава, Вольгі Соламавай...

Імёнамі герояў, якія абаранялі і вызвалялі горад, названы гродзенскія вуліцы, пра мужнасць і стойкасць апавядаюць музейныя экспазіцыі, свяшчэнным напамінам з'яўляюцца магілы і помнікі. Але памяць і ў тым, што старажытны горад упэўнена глядзіць у будучыню, становіцца ўсё больш камфортным для жыцця людзей. Неўзабаве, у прыватнасці, будуць адчынены рэабілітацыйны комплекс пры цэнтральнай гарадской паліклініцы, дзіцячыя садкі ў густанаселеных мікрараёнах «Вішнявец» і «Дзевятоўка», прыме вучняў школа-новабудоўля ў мікрараёне «Фолюш», тысячы гродзенцаў сёлета атрымаюць новыя кватэры.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

НІШТО НЕ ЗАБЫТАЕ

28 жніўня Магілёў атрымаў вымпел «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны», заснаваны Указам Прэзідэнта Беларусі.

Уладзімір Ігнатавіч Кандрацьеў — карэнны магіляўчанін, які пайшоў на вайну ў 16 гадоў. Дайшоў не толькі да Берліна, але прайшоў з пераможнай Савецкай Арміяй і за германскую сталіцу. Яго жонка Валянціна Міхайлаўна — былая партызанка. Сёння яны прыйшлі да Ратушы, каб прыняць удзел ва ўрачыстай цырымоніі.

— Магілёў варты такой высокай узнагароды, — гаворыць Уладзімір Ігнатавіч. — Калі майму гораду не даваць, то тады каму? Магіляўчане заваявалі гонар і славу крывёю і працай. Мы вельмі рады вымпелу, і хоць нам з жонкай ужо за 80 гадоў — але і мы сёння разам з усімі гараджанамі адзначым гэтую падзею.

Фота Ірыны САВОСНАЙ.

На мітынгу каля гарадской Ратушы сабралася шмат магіляўчан. Жыхары горада і ўся краіна ганарацца баявой славай Магілёва. Гераічная абарона на Буйніцкім полі стала сюжэтам для мастацкіх твораў. Горад у самым пачатку Вялікай Айчыннай вайны стаў сапраўднай крэпасцю і стрымліваў наступленне захопнікаў 23 дні.

Апладысментамі натоўп на плошчы вітаў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Іх прасілі прыняць нізкі паклон за тое, што адстаялі Радзіму ў страшную вайну, адбудавалі разбураныя гарады і вёскі, падаравалі нашчадкам жыццё і свабоду.

— Мы ніколі не забудзем подзвіг нашых бацькоў і дзядоў, якія абаранілі нашу зямлю ад карычневай чумы, — прамовіў на мітынгу **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК**. — Мы заўсёды будзем памятаць, цаной якіх неймаверных ахвяраў і пакутаў была здабытая Вялікая Перамога.

Раней вымпел «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны» атрымалі і іншыя гарады Магілёўшчыны: Крычаў, Клічаў і Бабруйск. У Крычаве савецкія войскі на працягу месяца ўтрымлівалі лінію фронту па рацэ Сож. Клічаў стаў цэнтрам адной з самых буйных партызанскіх зонаў. Бабруйскія падпольшчыкі і партызаны ўчынялі значны ўрон акупантам. І нарэшце, магілёўская абарона стала сімвалам мужнасці і стойкасці.

Кіраўніцтва рэгіёна па даручэнні Прэзідэнта павіншавала магіляўчан з высокай узнагародай і заклікала да новых здзяйсненняў на карысць роднага горада і Беларусі.

Ілона ІВАНОВА.

ВЯЛІКІ ПАСАГ МАЛЕНЬКАЙ ГАСПАДАРКІ?

У Баранавіцкім раёне праводзіцца маштабная рэарганізацыя гаспадарак — іх аб'яднанне. Да моцных далучаюць больш слабыя. А птушкафабрыка «Дружба» дала прытулак аж пяці сельгаскааператывам. На сёння ў раёне з 31 гаспадаркі засталіся 22. Працэс аб'яднання працягваецца. Вось і ў клубе СВК «Крошын» сабраўся калектыў, каб вырашыць пытанне аб далучэнні да сельгаскааператыва суседняй гаспадаркі — СВК «Прыгарад».

Уладзімір ШЧАРБАЦЭВІЧ: «Зарплата меншай не будзе!»

За савецкім часам да тагачаснага калгаса «Перамога» ўжо далучалі калгас «Прагрэс», і крошынцам давялося ўзваліць на сябе 4 млн. савецкіх рублёў доўгу. Калі Саюз распаўся, «Прагрэс» аддзяліўся і стаў затым сельгаскааператывам «Падлясейскі край». Але там справы не пайшлі, і ў 2005 годзе гаспадарка зноў вярнулася пад крыло СВК «Крошын». І вось цяпер трэба рататваць яшчэ адзін сельгаскааператыў.

Перад сходам я пагаварыў з кіраўніком мясцовай гаспадаркі Уладзімірам Шчарбацэвічам і першым намеснікам старшыні райвыканкама Міхаілам Палуянам — абодва выказваліся за аб'яднанне. Пазіцыя раёна вядомая — заняпалыя сельгаскааператывы звесці да мінімуму, і аб'яднанне — самы даступны спосаб. А навошта аб'яднанне патрэбнае СВК «Крошын»?

— Калі ўзялі «Падлясейскі край», то не памыліліся — паказчыкі выраслі, і зарплата таксама. Думаю, што і «Прыгарад» эканамічна не падарве нашу гаспадарку, хоць на першым этапе пэўныя цяжкасці могуць быць. А плюс вялікі ў тым, што ў нас дабавіцца зямлі — тэхніка магутная, і ёй патрэбная прастора, — сказаў У. Шчарбацэвіч.

Пазіцыя старшыні, безумоўна, паўплывала і на ход сходу. Але калі прагаласавалі, то выявілася нестыкоўка, бо пэўная колькасць прысутных не падняла руку — не галасавала. Людзям растлумачылі, што па законе, калі яны прыйшлі на сход, то абавязаны галасаваць (не ведаю, ці ёсць такі закон). Давялося галасаваць паўторна, і ў выніку толькі адзін чалавек быў супраць аб'яднання.

Але пры любым раскладзе большасць калектыву падтрымала свайго кіраўніка. У. Шчарбацэвіч паабяцаў з трыбуны, што зарплата ў людзей меншай не будзе. А іх найперш гэта хвалявала.

За СВК «Крошын» можна не турбавацца, гэта гаспадарка вытрымае і «Прыгарад», але з якім пасагам прыйдзе апошні пад дах «Крошына»?

Як у кожнай гаспадарцы, у «Прыгарадзе» ёсць статак буйной рагатай жывёлы, фермы, нейкая тэхніка, зямля, а яшчэ 2,5 млрд. даўгоў ды агромісты жыллёвы фонд — вялікая колькасць дамоў, узведзеных па дзяржаўнай праграме. Падчас сходу спецыялісты з раёна пачала супакойваць людзей. Маўляў, гэтыя дамы вялікім цяжарам на СВК «Крошын» не лягуць, бо людзям будзе дазволена выкупляць іх, і тады гаспадары самі будуць выплачваць крэдыты, але... не па астаткавым кошце, а па поўнай цане. Ясна, што жыллё ніхто не будзе выкупляць. Навошта выплачваць, калі гэта рэгулярна робіць сельгаскааператыў?!

Па ўсіх параметрах «Прыгарад» нельга параўнаць з «Крошынам». У першага ворыва толькі 1,3 тысячы гектараў, а ў другога — каля пяці, і так з пагалоў'ем кароў, наяўнасцю тэхнікі... СВК «Крошын» прыкладна ў чатыры разы магутнейшы за «Прыгарад», але апошні па ўзвядзенні дамоў па дзяржаўнай праграме дасць фору «Крошыну».

У «Прыгарадзе» праблема з абаротнымі грашыма, іншым разам няма саляркі каб заправіць тэхніку, а вось за апошнія два гады тут пабудавалі больш за паўтара дзясятка дамоў. Пры гэтым кошт некаторых з іх падчас будоўлі дасягаў 100 тысяч долараў. Напрыклад, у тым жа СВК «Крошын» няма ніводнага дома па такой цане!

СВК «Прыгарад». Жыллё ўзведзенае за два апошнія гады.

Вёска Лаўрынавічы, цэнтральная сядзіба «Прыгарада», не з'яўляецца аграгарадком, але тут узведзены цэлы пасёлак новых дамоў.

Як магло здарыцца, што ў перспектыўную гаспадарку, якая знаходзіцца ў некалькіх кіламетрах ад Баранавічаў, быў накіраваны такі фінансавы паток? Хіба не было зразумела, што набраныя на будоўлю крэдыты давядзецца выплачваць і што на такую маленькую гаспадарку яны лягуць вялікім цяжарам? І якая была неабходнасць узводзіць двухпавярховыя дамы па 100 тыс. долараў?

У якім сельгаскааператыве і колькі будаваць дамоў, вырашаюць не ў вобласці і сталіцы, а на мясцовым узроўні.

Думаю, калі б тыя, ад каго залежала будаўніцтва дамоў, распараджаліся не дзяржаўнымі грашыма, а сродкамі са сваёй кішэні, то можна не сумнявацца, што дзесяць разоў яны ўзважылі б, каму тыя грошы даць у крэдыт.

У прынцыпе, кіраўніцтва «Прыгарада» выкарыстала магчымасць. Калі «добрыя дзядзькі» раздаюць дзяржаўныя грошы, то чаму б не ўзяць! Дамы ўзвялі, засялілі іх па рашэнні праўлення і адзін дом у 100 тыс. баксаў аддалі кіраўніку гаспадаркі.

Неўзабаве давядзецца за ўзятыя крэдыты разлічвацца, і было б справядліва, калі б гэта рабіў «Прыгарад», але з аб'яднаннем за ўсё заплаціць СВК «Крошын», хоць у гэтай гаспадарцы існуе чарга на жыллё.

Па вялікім рахунку мы сутыкнуліся з застарэлай хваробай — нежаданнем успрымаць дзяржаўнае як сваё. А ў прыватным сектары ўсё сваё.

Лепшая фермерская гаспадарка раёна «Фартуна» таксама пабудавала для сваіх працаўнікоў жыллё. Фермеры Сяргей і Галіна Матусы з 2004 года дамагаліся гэтага і з вялікай цяжкасцю ўзялі ў «Белагрmaпрамбанка» крэдыт на 40 гадоў пад 3%. Узялі не катэджы ў два паверхі, а пяць звычайных трохпакаёвых дамоў. А звязана гэта з тым, што фермеру ніхто на выручку не прыйдзе і крэдыты давядзецца вяртаць. І тут трэба адзначыць яшчэ адзін момант — у «Фартуны» няма прэтэнзій да будаўнікоў, і гэта ў той час, калі на жыллё, узведзенае па дзяржаўнай праграме, даволі часта жыхары скардзяцца. А тут усё проста — гаспадары «Фартуны» ўзводзілі дамы на свае грошы і сачылі за якасцю будаўніцтва.

На адным з прыёмаў старшыні Брэсцкага абласнога гаспадарчага суда супрацоўніца банка паскардзілася, што кіраўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў набралі мільярды рублёў крэдытаў, а вяртаць не збіраюцца.

Жыццё не па сродках — з'ява ў нас звычайная. Толькі нагадаю, што за гэта расплачваецца ўсё грамадства. А ў нашай гісторыі крэдыты «Прыгарада» будзе выплачваць увесь калектыў СВК «Крошын».

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

Камісія была. Пытанні — засталіся?

Я займаюся прыватызацыяй сваёй кватэры і лічу, што многае тут робіцца не так. Прашу патлумачыць, якая плошча (агульная або жылая) дома павінна прымацца ў разлік пры вызначэнні кошту кватэры, якая прыватызуецца, на падставе якіх нормаў ажыццяўляецца індэксацыя чэкаў «Жыллё», што залічваюцца ў лік пагашэння кошту кватэры, і па якой методыцы вызначаецца кошт часткі кватэры, не аплачанай за кошт чэкаў?

М. Ларын, *п. Лясны, Мінскі раён.*

У адпаведнасці з заканадаўствам пры прыватызацыі грамадзянамі жылых памяшканняў перарэгістраваныя чэкі «Жыллё», якія ёсць ва ўдзельнікаў прыватызацыі, залічваюцца ў лік пагашэння кошту жылога памяшкання, які вызначаецца ў цэнах на 31 снежня 1991 г.

Пры гэтым не патрабуецца іх індэксацыя, бо кошт жылых памяшканняў разлічваецца ў цэнах 1991 года, гэта значыць у цэнах, супастаўных з намінальным коштам чэкаў «Жыллё».

Частка жылога памяшкання, якая не аплачана за кошт чэкаў, падлягае выкупу ў цэнах, якія дзейнічалі на дзень падачы заявы аб прыватызацыі жылля. Кошт яго, у адпаведнасці з Палажэннем, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 1992 г. № 710, вызначаецца ў цэнах, што дзейнічалі на дзень падачы заявы аб прыватызацыі жылога памяшкання, за вылікам кошту яго зносу. Згодна з пунктамі 2 і 3 Палажэння, пры вызначэнні кошту кватэры, якая прыватызуецца, у якасці разліковай адзінкі прымяняецца кошт 1 кв. метра яе агульнай плошчы, якая вылічваецца дзяленнем сапраўднага кошту дома на яго агульную плошчу. Агульная плошча дома вызначаецца як сума агульных плошчаў кватэр.

Ацэнка кошту жылых памяшканняў ажыццяўляецца з прымяненнем агульных індэксаў змянення кошту будаўніча-мантажных работ, якія штомесяц зацвярджаюцца ў вызначаным парадку. Ацэначны кошт кватэры вызначаецца шляхам памнажэння яе сапраўднага кошту на каэфіцыенты спажывецкіх якасцяў кватэры і каэфіцыент якасці жылога асяроддзя, які ўстанаўліваецца рашэннем адпаведных мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. У рабоце камісій па ацэнцы кошту жылых памяшканняў маюць права ўдзельнічаць грамадзяне, якія прыватызуюць жылыя памяшканні.

Яны ж, гэтыя грамадзяне, маюць права запатрабаваць ад камісіі падрабязных тлумачэнняў адносна парадку разліку кошту займаемай кватэры з абгрунтаваннем прымянення кожнага каэфіцыента спажывецкіх якасцяў і каэфіцыента якасці жылога асяроддзя.

Спрэчкі, звязаныя з прыватызацыяй жылых памяшканняў, вырашаюцца вышэйшым у парадку падпарадкаванасці органам (у залежнасці ад прыналежнасці жылога дома) або судом.

Віктар САВІЦКІ.

ДАЖДЖЫ СВАЁ ЗАБРАЛІ

Сёлетняе заданне па вытворчасці цыбулі для Гомельскай вобласці складае 25 тысяч тон, паведаміў **генеральны дырэктар Гомельскай абласной асацыяцыі вытворцаў плодаагароднінай прадукцыі Валерый ПАПКОЎ**.

Чакаецца, што гэтая лічба будзе не толькі выканана, але і перакрыта на 5 тысяч тон. Магло б быць і больш, адзначае Валерый Афанасьевіч, але ж з-за сёлетніх неспрыяльных умоў надвор'я вітамінная прадукцыя загінула на 184 гектарах. Аднак вырашчанага аб'ёму цыбулі павінна хапіць не толькі для забеспячэння ўнутраных патрэбаў Гомельскай вобласці, але на 65 % — рэспублікі. Зараз да ўборкі цыбулі прыступілі 6 з 46 спецыялізаваных гаспадарак Гомельшчыны. Папярэдне можна казаць пра тое, што цыбуля будзе не горшай, чым летась, а ўмовы для яе захоўвання ў вобласці ёсць.

6,5 мільёна ўмоўных слоікаў зялёнага гарошку выраблена ў гэтым годзе ў Гомельскай вобласці, паведаміла **начальнік упраўлення КУП харчовай прамысловасці «Гомельаблхарчпрам» Святлана КРУЧЫНІНА**. Гэта менш, чым было запланавана. Умовы надвор'я значна паўплывалі на развіццё гэтай расліны яшчэ ў чэрвені-ліпені. Як вядома, асноўныя аб'ёмы зялёнага гарошку вырошчваюць на Тураўшчыне. Моцныя дажджы не давалі культуры магчымасці выспяваць паступова. Справа ў тым, што гарошак саджаюць на працягу месяца, каб праводзіць уборку і перапрацоўку па меры выспявання. Але ж у чэрвені, калі ішлі дажджы, расліны амаль што не раслі. Калі дажджы нарэшце закончыліся, гарошак выспеў адначасова ўвесь і адразу рэзка пачаў зарастаць пустаселлем. Звычайна сезон уборкі гарошку доўжыцца паўтара месяца, аднак сёлета ён быў менш за месяц. У папярэднія гады пры спрыяльным надвор'і уборка пачыналася ў апошнія дні чэрвеня, сёлета сельгасвытворцы змаглі яе пачаць толькі ў першай дэкадзе ліпеня — два страчаныя з-за дажджоў тыдні значна паўплывалі на канчатковыя вынікі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
Жыхарка вёскі Язна Міёрскага раёна Лілія КАБЯК з ураджаем цыбулі з уласнага падворка.

Што датычыцца перапрацоўкі культуры, то прадпрыемствы Гомельшчыны (а гэта сёлета ААТ «Тураў», ААТ «Ельскі кансервавы завод» і КСУП «Брылёва») працавалі ў звычайным рэжыме. Больш за палову нарыхтовак спецыялісты ацэньваюць як вышэйшы гатунак. Асноўныя формы перапрацоўкі гарошку сёлета, як і летась, — яго закатка і замарозка. Пакупнік аддае перавагу прадукцыі, якую бачыць непасрэдна на свае вочы, менавіта таму вытворцы запакоўваюць гарошак у звычайныя шкляныя слоікі і пад накрыўку «твіст-оф».

На будучыню ў кіраўніцтва КУП харчовай прамысловасці «Гомельаблхарчпрам» ёсць планы выпускаць кансерваваныя сумесі зялёнага гарошку з іншай гароднінай.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Дзе накрыўкі ад калодзежаў на вуліцы Караткевіча?

Або не хадзіце, дзеці, у Білева гуляць!

Білева — гэта новы жылы мікрараён на ўскраіне Віцебска. Будуецца ўжо не першы год. Тысячы шчасліўчыкаў атрымалі тут свае кватэры.

Зразумела, што жыць у новым мікрараёне часта не вельмі зручна. Напрыклад, школу ў Білева ўсё працягваюць будаваць. Верагодна, да пачатку новага навучальнага года адчыніць яе так і не паспеюць. І садок — мара тутэйшых жыхароў...

Але аўтар выправіўся ў гэты мікрараён з зусім іншай мэтай. Пракурорскія работнікі спрабавалі разабрацца, чаму няма накрывак ад люкаў. Прычым тут пракуратура? — адразу з'явілася пытанне.

А тая ж дырэктыва Прэзідэнта «пра беспячасць», ужо забылі? У адкрыты калодзеж правалiцца чалавек — вось вам і выкананне патрабаванняў дырэктывы!

Дарэчы, ужо быў сумны выпадак у мікрараёне: хлопчык праваліўся ў калодзеж. Відаць, абышлося без цяжкіх наступстваў. Інакш звярнуліся б бацькі ў праваахоўныя органы.

З таго часу прайшло нямала месяцаў. Ці зрабілі нешта тыя, хто адказвае за камунікацыі на вуліцах мікрараёна, каб больш ніколі такое не паўтарылася? Як высветлілася, і не вельмі стараліся. У гэтым асабіста я ўпэўніўся, калі пабываў у Білева.

Вуліцы Караткевіча, Генерала Іваноўскага, Багрaмяна. Калодзежы ёсць, а накрыўкі?

— Праблема ўскладняецца тым, што, напэўна, розныя арганізацыі і не задумваліся пра неабходнасць накрываць калодзежы, як гэта патрабуецца, — расказвае **пракурор аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў пракуратуры Віцебскай вобласці Вольга ГРЫЦКЕВІЧ**. — Больш за пяцьдзясят калодзежаў, а пакуль разбярэшся, якой арганізацыі які з іх належыць, часу нямала патраціць трэба. Дрэнажныя калодзежы, ліўневыя, водаправодныя, каналізацыйныя, калодзежы сувязі — многія без накрывак.

І на сустрэчы непасрэдна на месцы запрашалі пракуроры прадстаўнікоў КУП «Капітальнае будаўніцтва горада Віцебска», дзяржбуднагляду, ЖЭУ, ЖРЭТ Першамайскага раёна... Хадзілі між калодзежаў і «вызначалі» які чый.

Фота аўтара.

Некаторыя выказваліся, што, маўляў, не выключаецца, што грамадзяне крадуць накрыўкі. Але ж калі накрыўка добра зафіксаваная, вельмі трэба пастарацца, каб яе зняць. Ды і куды потым здаць? У афіцыйных пунктах прыёму металалому такія накрыўкі ніколі не прымуць. Здаць на «чорным» рынку? На гэта трэба таксама затраціць час. А, напрыклад, «бамжы», няўжо яны могуць пранесці праз горад вялікую накрыўку так, каб іх пры гэтым ніхто не заўважыў?

Некаторыя калодзежы жыльцы самі... накрываюць. Вось «накрыўка» ў выглядзе кратаў. А што зробіш? Можна і днём лёгка не заўважыць калодзеж. А ўвечар не вельмі добра тут асвятляюць вуліцы.

Вось калодзеж ля дзіцячай пляцоўкі. Накрыты нейкай драўлянай канструкцыяй. Дзеці могуць лёгка праваліцца. Месцы вытворчасці будаўнічых работ не агароджаны, як гэта патрабуецца. Няма ніякіх адпаведных знакаў папярэджання.

Здзівілі мяне мясцовыя жыхары.

— Ці скардзіліся вы куды-небудзь на адкрытыя калодзежы? — цікаўлюся.

— Не, — адказвае жанчына. — У мяне ўжо сын дарослы — у восьмы клас ходзіць. Па калодзежах не лазіць.

— А вы? — пытаю яшчэ адну даму (дарэчы, цяжарную).

— Не разумею, пра што пытаеце. Няма ў мяне часу.

Дзяўчаткі, якія праходзілі міма, былі больш адкрытымі да размовы. Высветлілася, што той самы хлопчык, які праваліўся ў калодзеж, — сваяк адной з іх.

— Як былі адкрытымі калодзежы, такімі яны і засталіся, — расказвае дзяўчынка. — Вядома ж, бывае, страшна хадзіць, бо мо і не заўважыш калодзеж...

Няўжо нам насамрэч усё адно? Ці нельга было тутэйшым жыхарам раней, да візіту пракурораў, як кажуць, узняць праблему?

А што, калі вы, я праваліцца? «Не я ж!» — падумае іншы. А раптам ты?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МЭБЛЯ ТРЭБА?

У кватэру да жыхара па вул. Маскоўскай у Брэсце прыйшоў індывідуальны прадпрымальнік з напарнікам.

Яны быццам бы збіраліся вырабіць мэблю для кухні, але, ашукаўшы гаспадыню, завалодалі 740 доларамі і сышлі. Ашуканцаў затрымалі.

АДКУЛЬ ТАВАР?

Міліцыянеры сумесна з памежнікамі зазірнулі да жыхара в. Велікарыта Маларыцкага раёна і знайшлі ў яго 9 баулаў з дублёнкамі і курткамі.

Адкуль узяўся тавар на больш чым паўмільярда рублёў, вызначаецца.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ПАЦЯРПЕЛА ЖАНЧЫНА

У вёсцы Падкраічы Бяразаўскага раёна ўпала жалезабетонная перагародка збожжасховішча. На бяду, побач стаяла жанчына 1978 года нараджэння. З атрыманымі траўмамі пацярпелая дастаўлена ў бальніцу.

НЕЗАЧЫНЕНЫЯ ДЗВЕРЫ — ЗНАХОДКА ДЛЯ ЗЛОДЗЕЯ

Цяпер гэта добра ведае жыхар горада Пінска з вуліцы Студэнцкай. Менавіта ў яго кватэру, дзверы якой былі незамкнёныя, улезлі зладзюжкі і вынеслі тэлевізар, мікрахвалёўку, іншыя рэчы. Гаспадара, які аказаўся дома, зламыснікі пабілі. Па падазрэнні ў гэтым злачынстве затрыманы непрацуючы пінчанін 1977 года нараджэння і яго 19-гадовая памагатая.

Яна СВЕТАВА.

СКУЛЬПТУРА Ў СЦЯНЕ

У музеі гісторыі Магілёўскага аддзялення Беларускай чыгункі захоўваецца незвычайны экспанат савецкіх часоў.

Дом культуры магілёўскіх чыгуначнікаў — гэта «сталінскі» палац, які пачалі будаваць да вайны, у 1939 годзе. Каля яго меркавалі паставіць бронзавую скульптуру Уладзіміра Леніна ў поўны рост. Паводле звестак, скульптуру прывезлі ў Магілёў, але не паспелі ні завяршыць будаўніцтва, ні ўсталяваць Леніна. Пачалася вайна.

У акупацыю немцы вырашылі адправіць на пераплаўку савецкія сімвалы, зробленыя з металаў. Скульптуру Леніна распілавалі на часткі. Але на пагрузцы працавалі мясцовыя жыхары, якія схавалі кавалкі і здолелі таемна замураваць іх у сценах недабудаванага клуба.

У час вайны ў клуб трапіла бомба, таму давялося ў 1950-х гадах капітальна рамантаваць будынак. Рабіла гэта чыгуначнае прадпрыемства — дыстанцыя грамадзянскіх збудаванняў. Рабочыя знайшлі галаву ад скульптуры Леніна і пасля перадалі ў музей.

Бронзавую галаву пафарбавалі ў чорны колер, з дрэва зрабілі плечы, і атрымаўся бюст, які ўсталявалі на невялікі чырвоны пастамент. Новы Ленін заняў месца ў музейнай экспазіцыі, прысвечанай вайне. Іншыя часткі скульптуры і дакументальна, — расказала Тацяна Зямлянская. — Гэту гісторыю мы ведаем толькі са слоў людзей. Шмат гадоў у музеі знаходзілася шыльда, дзе мы прасілі сведак тых падзей прыйсці да нас, але так ніхто і не адгукнуўся.

дасюль, напэўна, захоўваюцца ў сценах будынка Дома культуры, які сёння спалучае сталінскі стыль з сучасным еўрарамонтам.

Калі казаць шчыра, то бюст Леніна ў музеі стварае дзіўнае ўражанне. На чорнай галаве блікуе святло ад люстры. Адкрыты рот правадыра выглядае недарэчна. Але гэта частка скульптуры ў поўны рост, дзе Ленін нібыта прамаўляў з трыбуны.

Тым не менш і за савецкім часам, і цяпер менавіта гэтым экспанатам з яго таямнічай гісторыяй вельмі цікавяцца наведвальнікі музея.

— Людзі, якія хавалі скульптуру Леніна, рызыкавалі сваім жыццём, — нагадвае Тацяна Зямлянская. — Так моцна яны верылі ў правадыра і ўсё савецкае! Каля Леніна мы павесілі літаграфію 1937 года на чырвонай тканіне з выявай і цытатай Іосіфа Сталіна «Ды будзе непераможны сцяг Маркса-Энгельса-Леніна». Нам расказалі, што машыніст паравоза вазіў гэты сцяжок у кабіне: калі б немцы знайшлі — расстрэл! Праўда, чырвоны колер з цягам часу стаў бледна-ружовым...

І няхай сёння не актуальныя для грамадства савецкія сімвалы, але гэта — наша гісторыя, са сваімі героямі і таямніцамі.

Ілона ІВАНОВА.

Купіў насенне канопляў у Галандыі

Як паведамляла «Звязда», у Аршанскім раёне на сваёй дачы 44-гадовы жыхар Оршы вырошчваў каноплі.

Намеснік начальніка спецыяльнага ўпраўлення УУС Віцебскага аблвыканкама Дзмітрый ЯФРЭМЕНКА, супрацоўнікі якога змагаюцца з незаконным распаўсюджваннем наркотыкаў, расказаў, што насенне канопляў мужчына атрымаў... па пошце ў звычайным канверце. З Галандыі. Проста зайшоў на адпаведны сайт і заявіў пра жаданне зрабіць пакупку. Навучыўся таксама ў «сусветным павуцінні» вырошчваць тыя каноплі.

На дачы, якую «раслінавод» купіў некалькі гадоў таму, міліцыянеры знайшлі спецыяльную «лабараторыю» па вырошчванні канопляў — з абагравальнікамі, лямпамі...

Як высветлілася, якасць галандскіх канопляў значна лепшая, чым айчынных. Вырошчваў наш «спецыяліст» каноплі некалькі месяцаў.

Канфіскавана ў яго каля 200 грамаў зелля. Пры збыце беспрацоўны мог атрымаць за гэтае «багацце» да 700—800 долараў.

Вырасціў ён 22 кусты, самыя вялікія — пад два метры вышынёй. За свае дзеянні аматар вырошчвання зелля можа атрымаць да трох гадоў пазбаўлення волі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота прэс-службы УУС Віцебскага аблвыканкама.

ТЫТУЛ «МІС ІНТЭРКАНТЫНЕНТАЛЬ-2009» АТРЫМАЕ СТУДЭНТКА?

Пра што гавораць анкеты кАНТынентальных прыгажунь

Трыццаць дзевяць канкурсантак з 60-ці краін свету, якія будуць удзельнічаць у фінальным шоу «Міс інтэркАНТыненталь-2009», з'яўляюцца студэнткамі ВНУ. Як паведамляюць крыніцы аднаго з самых прэстыжных конкурсаў прыгажосці, толькі невялікая частка сёлетніх канкурсантак «выбіваецца» з агульнага плана. Так, Аўстрыю будзе прэзентаваць мэнеджар па турызме Хэлена Духонава, а Гандурас — журналістка Лэслі Крыстоф. Ёсць сярод канкурсантак бухгалтар — 24-гадовая прыгажуня з Ліберыі, а таксама бізнэсвумен — як напісана ў анкеце 22-гадовай грэчаскай дзяўчыны Андрыяны Хрыстоў. Самыя ўзроставыя сярод канкурсантак стануць дзяўчаты з Егіпта, Латвіі, Панамы і Тайваня, якім ужо споўнілася па 26 гадоў. А самымі маладымі — 18-гадовыя прыгажуні з Аўстраліі, Лівана і Румыніі.

Што цікава, толькі сем канкурсантак з 60-ці — бландзінкі. Калі звярнуцца да мінулагодніх пераможцаў, то стане зразумела, чаму большасць краін на конкурс пасылае брунетак: за 38 гадоў існавання конкурсу толькі аднойчы ў ім перамагла ўладальніца бялявых локанаў — славачка Катарына Манова, якая атрымала тытул «Міс інтэркантыненталь» у 2006 годзе.

Аналізуючы вынікі мінулагодніх конкурсаў «Міс інтэркАНТыненталь», варта адзначыць, што еўрапейскія прыгажуні перамагалі ў гэтым конкурсе толькі восем разоў: тройчы гэта рабіла Германія, адзін раз — Англія, Нідэрланды, Расія, Славакія, Турцыя.

Беларусь у конкурсе ўдзельнічае нерэгулярна. Летась падрыхтоўку нашай прыгажуні ўпершыню курыраваў тэлеканал АНТ, калі ў фінале «Міс інтэркАНТыненталь-2008», які праходзіў у Польшчы, тытул 2-й віцэ-міс, а таксама тытул «Міс Еўропа» атрымала беларуска Любоў Яковіна. А які настрой сёлета?

— Сёлета ў нас вельмі баявы настрой, — гаворыць **генеральны дырэктар тэлеканала АНТ Анжэліна МІКУЛЬСКАЯ**. — У гэтым годзе ў нас вельмі моцная канкурсантка Марыя Есьман. Яна дастаткова прыгожая, разумная, цікавая. І мы ўскладаем вялікія надзеі на яе.

Беларусцы Марыі Есьман **(на фота)** 20 гадоў. Студэнтка, вучыцца на юрыдычным факультэце БДУ. Не бландзінка.

Сваіх каляжанак па конкурсе Марыя ўбачыць ужо 10 верасня, калі ў Мінск пачнуць з'язджацца першыя канкурсанткі. Фінал «Міс інтэркАНТыненталь-2009» запланаваны на 27 верасня. Ён пройдзе ў Футбольным манежы.

Ілья ЛАПАТО.

ЗВЯЗДА Рэгіёны Расіі — у Беларусі

Сумесны беларуска-расійскі інфармацыйна-інтэграцыйны праект Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь і рэдакцыі газеты «Звязда»

Алтайскі край

Барыс ЧАСНАКОЎ:

«ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ НАШАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА БУДЗЕ ТОЛЬКІ РАСЦІ»

Адной з асноўных задач Алтайскай гандлёва-прамысловай палаты з'яўляецца наладжванне і развіццё сувязяў з замежнымі партнёрскімі арганізацыямі і дзелавымі коламі, а таксама з міжнароднымі арганізацыямі бізнэсу. Як выконваецца гэта задача ў адносінах з партнёрскімі арганізацыямі Рэспублікі Беларусь? На гэта і шэраг іншых пытанняў карэспандэнт «Звязды» папрасіў адказаць прэзідэнта Алтайскай ГПП Барыса ЧАСНАКОВА.

— Нашы ўзаемаадносіны з Рэспублікай Беларусь маюць даўнія традыцыі і прадыктаваныя, у першую чаргу, эканамічнай логікай і наяўнымі кааперацыйнымі сувязямі, — адзначыў Барыс Анатольевіч. — І было б зусім неапраўдана, калі б мы не выкарыстоўвалі гэты патэнцыял і не пераводзілі яго ў рэчышча сучасных патрабаванняў з пункту гледжання пашырэння гэтых сувязяў, садзейнічання стварэнню сумесных прадпрыемстваў, сумеснай працы па ўкараненні новых тэхналогій. Алтайскі край адносіцца да тых рэгіёнаў, дзе супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі ва ўсіх галінах сацыяльнага і эканамічнага жыцця лічыцца адным з прыярытэтных кірункаў развіцця знешніх сувязяў. Прадпрыемствы краю надзвычай зацікаўленыя ў шчыльных гандлёва-эканамічных стасунках з прадпрыемствамі Беларусі. Невыпадкова яшчэ ў 1998 годзе падчас афіцыйнага візіту нашай дэлегацыі ў Мінск было падпісана Пагадненне аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве паміж Адміністрацыяй Алтайскага края Расійскай Федэрацыі і Міністэрствам знешніх эканамічных сувязяў Рэспублікі Беларусь. А ў 2005 годзе мы падпісалі Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Мінскім аддзяленнем Беларускай гандлёва-прамысловай палаты і Алтайскай гандлёва-прамысловай палатай для ўмацавання эканамічных сувязяў паміж прадпрымальнікамі нашых краін.

— Якія ж кірункі сумеснай дзейнасці найбольш перспектыўныя сёння?

— Эканамічныя сувязі паміж прадпрыемствамі края і рэспублікі значна актывізаваліся пасля ўзаемных візітаў губернатара Алтайскага края А.Б. Карліна і прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь С.С. Сідорскага ў 2006 годзе. Улічваючы спецыфіку нашага рэгіёна, які, у першую чаргу, прадстаўляе аграпрамысловы сектар, найбольшую цікавасць, безумоўна, выклікае супрацоўніцтва ў галіне машынабудавання, вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі. Напрыклад, добра зарэкамендавалі сябе на алтайскіх палях трактары «Беларусь» і ўборачныя комплексы КЗР-10 «Палессе-Ротар». У першым квартале гэтага года тавараабарот Алтайскага края з Рэспублікай Беларусь склаў 6,9 мільёна доларaў, а па выніках пяці месяцаў — 11,2 мільёна доларaў. Мы часцей за ўсё гаворым пра такі механізм супрацоўніцтва, як арганізацыя вытворчасцяў па зборцы канчатковай прадукцыі ў месцы яе выкарыстання. Так, на працягу апошніх некалькіх гадоў вяліся перамовы па арганізацыі сумеснага расійска-беларускага прадпрыемства па зборцы трактароў на базе Рубцоўскага «РЗЗ». І вось, нарэшце, гэты праект блізкі да ажыццяўлення. У адпаведнасці з падпісаным пратаколам дамоўленасці паміж адміністрацыяй Рубцоўска і беларускімі прадпрыемствамі ў ЗАТ «РЗЗ» ужо падрыхтаваныя вытворчыя плошчы для зборкі трактароў МТЗ-82. Пасля атрымання з Рэспублікі Беларусь першых камплектаў трактароў сумесна з беларускімі спецыялістамі на «РЗЗ» правядуць зборку. Наступным этапам павінна стаць тэхнічная сертыфікацыя прадукцыі. Асабліва прыемна адзначыць, што ля вытокаў гэтай ідэі стаяла Алтайская ГПП.

З 2005 года ў сферы вытворчасці сельгастэхнікі супрацоўнічае з беларускімі партнёрамі таксама ТАА «Аграспецмашына» — даччынае прадпрыемства акцыянернага таварыства ХК «Барнаульскі станкабудаўнічы завод». На чарзе — арганізацыя сумеснай вытворчасці па зборцы ў Барнауле беларускіх тралейбусаў. Для эканомікі Алтайскага края гэта — рашэнне праблемы загрузкі вытворчых магутнасцяў многіх машынабудаўнічых прадпрыемстваў, а значыць, і рашэнне сацыяльных пытанняў, напаўненне бюджэту. Не меншую цікавасць выклікае ў нас і ўзаемадзеянне ў галіне біяфармацэўтычнай дзейнасці, лёгкай прамысловасці, сельскай гаспадаркі, энергетыкі, дарожнага будаўніцтва, жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Напрыклад, сёння значная частка шматпавярховых жылых дамоў Барнаула ўжо аснашчана магілёўскімі ліфтамі.

— Эфектыўным інструментам узмацнення супрацоўніцтва рэгіянальных бізнэс-структур Беларусі і Расіі з'яўляецца выставачна-кірмашовая дзейнасць. Якія канкрэтныя сумесныя праекты ў гэтай сувязі магла б прапанаваць прадстаўнікам беларускай бізнэс-супольнасці Алтайская ГПП?

— Безумоўна, гэта, у першую чаргу, узаемны ўдзел у прамысловых выставах разнастайных кірункаў. Для гэтага мы пастаянна абмяньваемся інфармацыяй з беларускімі калегамі і інфармуем прадпрымальнікаў края аб магчымасці прэзентаваць свой тавар у Рэспубліцы Беларусь. Практычна штогод алтайскія вытворцы бяруць удзел у міжнародных выставах, якія праходзяць на беларускай зямлі: «Металаапрацоўка», «Аўтаматызацыя. Электроніка», «Электратэх», «Будэкспа», «Элком», «Лічбавы дом», «Белпрамэкспа», «Белагра», «Экспасвятло». У сваю чаргу, беларускія прадпрымальнікі з'яўляюцца пастаяннымі гасцямі нашых традыцыйных выстаў «Аграніва», якая праходзіць у кастрычніку, і «Алтайская ніва. Алтайагратэх».

Мы заўсёды гатовыя разглядзець і па магчымасці ўвасобіць у жыццё прапановы абодвух бакоў і па іншых кірунках узаемадзеяння. Магчымае, напрыклад, супрацоўніцтва ў сферы дзелавога турызму, арганізацыі культурна-экскурсійных праграм, выстаў сельгастэхнікі, якія, наколькі мне вядома, увогуле з'яўляюцца традыцыйнымі для Беларусі. Таксама ў нас ёсць пэўныя дамоўленасці ў плане абмену інфармацыяй аб турысцка-экскурсійных і санаторна-курортных паслугах у Алтайскім краі і Рэспубліцы Беларусь і развіцці прамых сувязяў паміж арганізацыямі ў галіне культуры і адукацыі, навукі і інавацый.

Спадзяюся, надалей эфектыўнасць нашага супрацоўніцтва будзе толькі расці. І год ад года колькасць дзелавых партнёраў на Алтаі і ў Беларусі будзе толькі павялічвацца.

Гутарыў Барыс ЗАЛЕСКІ.

ООО ТД «МАЛИНОВОЕ ОЗЕРО»
Алтайский край, г. Барнаул,
пр-т Строителей, 16, офис 401.
Тел./ф.: (3852) 61 90 33, (38570) 25 4 80
РЕАЛИЗАЦИЯ ХИМИЧЕСКИХ РЕАКТИВОВ, СОЛИ МАГНИЯ, НАТРИЯ, МЕДИ, ЖЕЛЕЗА, КАЛИЯ, ФАРМ. СУБСТАНЦИИ (МАГНИЙ КАРБОНАТ ОСНОВНОЙ «ФК», НАТРИЙ ХЛОРИСТЫЙ «ФК»).
Система скидок.
Индивидуальный подход к каждому клиенту.
Будем рады сотрудничеству.

ЗВЫШПРЫБЫТКІ ЛЖЭПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

Ілжэпрадпрымальнікі ў Баранавічах зарабілі на незаконных валютных аперацыях Br4,8 млрд. Пра гэта паведамілі ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Беларусі.

З мая 2007 года па снежань 2008-га гэтыя грамадзяне, не будучы зарэгістраванымі ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, з выкарыстаннем рэквізітаў ілжэпрадпрымальніцкіх структур ажыццяўлялі незаконныя аперацыі па абмене наяўных доларaў ЗША ў безнаяўныя беларускія рублі, атрымаўшы прыбытак у асабліва буйным памеры на суму Br4,8 млрд.

Кар. БЕЛТА.

БЕЛИНВЕСТБАНК

ЗАВЕРЕНО
Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 31.07.2009 г.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ ОАО «БЕЛИНВЕСТБАНК» СЕМНАДЦАТОГО, ВОСЕМНАДЦАТОГО И ДЕВЯТНАДЦАТОГО ВЫПУСКОВ

1. Полное и сокращенное наименование эмитента.
Полное – Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», сокращенное – ОАО «Белинвестбанк».

2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).
Место нахождения: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Машерова, 29, телефон (017) 289 35 89, факс (017) 289 36 70, e-mail: belbb@belinvestbank.by.

3. Сумма зарегистрированного уставного фонда.
Размер зарегистрированного уставного фонда Банка составляет 382 089 577 580 (триста восемьдесят два миллиарда восемьдесят девять миллионов пятьсот семьдесят семь тысяч пятьсот восемьдесят) белорусских рублей.

4. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента и сроки ее публикации.
Публикация годового отчета Банка в составе, определенном законодательством, осуществляется в периодическом печатном издании «Звязда» – не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.
Бухгалтерская отчетность Банка за 2008 год в составе, определенном законодательством, опубликована 31.03.2009 г. в газете «Звязда».

5. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение.
Решение о семнадцатом, восемнадцатом и девятнадцатом выпусках облигаций ОАО «Белинвестбанк» принято Наблюдательным Советом ОАО «Белинвестбанк» 24.06.2009 (протокол № 36).

6. Дата и номер государственной регистрации облигаций.
Облигации семнадцатого выпуска зарегистрированы в Государственном реестре ценных бумаг Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь «31» июля 2009 г., номер государственной регистрации 5-200-02-0322.
Облигации восемнадцатого выпуска зарегистрированы в Государственном реестре ценных бумаг Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь «31» июля 2009 г., номер государственной регистрации 5-200-02-0323.
Облигации девятнадцатого выпуска зарегистрированы в Государственном реестре ценных бумаг Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь «31» июля 2009 г., номер государственной регистрации 5-200-02-0324.

7. Вид, форма выпускаемых облигаций, объем эмиссии, количество облигаций.
Вид, форма выпускаемых облигаций – процентные, на предъявителя, в документарной форме (в виде отпечатанных на бумаге бланков).
Объем эмиссии облигаций семнадцатого выпуска составляет 1 000 000 (один миллион) долларов США. К открытой продаже предлагаются 10 000 (десять тысяч) облигаций номинальной стоимостью 100 (сто) долларов США каждая. Облигациям присвоена серия «ОП В17», номера «000001–010000».
Объем эмиссии облигаций восемнадцатого выпуска составляет 2 000 000 (два миллиона) долларов США. К открытой продаже предлагаются 4 000 (четыре тысячи) облигаций номинальной стоимостью 500 (пятьсот) долларов США каждая. Облигациям присвоена серия «ОП В18», номера «000001–004000».
Объем эмиссии облигаций девятнадцатого выпуска составляет 1 500 000 (один миллион пятьсот тысяч) евро. К открытой продаже предлагаются 7 500 (семь тысяч пятьсот) облигаций номинальной стоимостью 200 (Двести) евро каждая. Облигациям присвоена серия «ОП В19», номера «000001–007500».

8. Информация об обеспечении облигаций.
Облигации выпускаются в соответствии с п.п. 1.8 п. 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».
Общий размер обязательств по облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка.
Нормативный капитал Банка по состоянию на 01.06.2009 г. составляет 635 021,6 млн. белорусских рублей.

9. Номинальная стоимость облигаций.
Номинальная стоимость облигаций семнадцатого выпуска – 100 (сто) долларов США.
Номинальная стоимость облигаций восемнадцатого выпуска – 500 (пятьсот) долларов США.
Номинальная стоимость облигаций девятнадцатого выпуска – 200 (двести) Евро.

10. Цель выпуска облигаций.
Целью выпуска облигаций является привлечение временно свободных денежных средств физических лиц для финансирования долгосрочных инвестиционных проектов и строительства жилья.
Владельцами облигаций могут быть только физические лица – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь.

11. Период проведения открытой продажи облигаций.
Открытая продажа облигаций семнадцатого выпуска осуществляется с 01 октября 2009 г. по 31 марта 2011 г. включительно.
Открытая продажа облигаций восемнадцатого выпуска осуществляется с 01 октября 2009 г. по 30 сентября 2011 г. включительно.
Открытая продажа облигаций девятнадцатого выпуска осуществляется с 01 октября 2009 г. по 31 марта 2011 г. включительно.

12. Цена продажи облигаций.
Облигации продаются по номинальной стоимости за денежные средства в долларах США – семнадцатый, восемнадцатый выпуски, за денежные средства в евро – девятнадцатый выпуск, в наличном либо безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

13. Место и время проведения открытой продажи облигаций.
Открытая продажа облигаций семнадцатого, восемнадцатого, девятнадцатого выпусков осуществляется в Главном операционном управлении Банка, филиалах (отделениях), структурных подразделениях Банка (филиала), расположенных вне места его нахождения и не имеющих самостоятельного баланса (далее – филиалы), в течение их рабочего времени.

14. Срок обращения облигаций.
Срок обращения облигаций семнадцатого и девятнадцатого выпусков – 730 дней, с 01 октября 2009 г. по 1 октября 2011 г. включительно.
Срок обращения облигаций восемнадцатого выпуска – 1096 дней, с 01 октября 2009 г. по 1 октября 2012 г. включительно.
При расчете срока обращения облигаций день начала размещения и день начала погашения облигаций считаются одним днем.

15. Размер и порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты, период начисления процентного дохода по облигациям.
Процентный доход по облигациям семнадцатого и девятнадцатого выпусков установлен в размере 9,5 (девять целых пять десятых) процента годовых, по облигациям восемнадцатого выпуска – 10 (десять) процентов годовых.
Период начисления процентного дохода: начисление процентного дохода по облигациям семнадцатого и девятнадцатого выпусков осуществляется со дня продажи облигации по 30 сентября 2011 г. включительно, по облигациям восемнадцатого выпуска – по 30 сентября 2012.
Расчет дохода по облигациям семнадцатого и девятнадцатого выпусков производится по следующей формуле:

$$Д = \frac{Нп \times Пд \times Т}{100 \times 365}.$$

Расчет дохода по облигациям восемнадцатого выпуска производится по следующей формуле:

$$Д = \frac{Нп \times Пд}{100} \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right),$$

где:
Д – процентный доход, выплачиваемый единовременно при погашении облигации;
Нп – номинальная стоимость облигации;
Пд – процентная ставка в размере 9,5 (девять целых пять десятых) процента годовых по облигациям семнадцатого и девятнадцатого выпусков, 10 (десять) процентов годовых – по облигациям восемнадцатого выпуска;
Т365 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Округление дохода осуществляется в соответствии с Правилами начисления процентов в банках Республики Беларусь, утвержденными постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 29 декабря 2000 г. № 31.3г, и в соответствии с локальным нормативным правовым актом Банка, определяющим методику начисления доходов и расходов в ОАО «Белинвестбанк».
При выплате процентного дохода по облигации наличной иностранной валютой филиал Банка покупает у владельца облигации часть иностранной валюты, подлежащей выплате, в сумме менее минимального номинала банкноты соответствующей иностранной валюты, по обменному курсу приобретения наличной иностранной валюты, установленному филиалом Банка.

16. Дата начала погашения облигаций и порядок их погашения.
Дата начала погашения облигаций семнадцатого и девятнадцатого выпусков – 01 октября 2011 г., облигаций восемнадцатого выпуска – 01 октября 2012 г.
Погашение облигаций производится в филиалах Банка при условии предъявления физическим лицом оригинала облигации, документа, удостоверяющего его личность в случае, предусмотренном п.2.14. Проспекта эмиссии облигаций семнадцатого, восемнадцатого, девятнадцатого выпусков. При погашении владельцу выплачивается номинальная стоимость облигации и начисленный доход по ней в наличном либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

17. Условия и порядок досрочного погашения облигаций.
Досрочное погашение облигаций осуществляется Банком по истечении 180 дней со дня продажи облигации: выплачивается номинальная стоимость и накопленный процентный доход, начисленный за полностью истекшие месяцы на день предъявления требования о досрочном погашении облигации. Процентный доход не начисляется и не выплачивается за количество дней месяца, в течение которого облигация предъявлена к досрочному погашению.

18. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь или отказе эмитента от выпуска облигаций.
При отказе от выпуска облигаций, запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь денежные средства, внесенные в их оплату, возвращаются владельцам облигаций (инвесторам) не позднее 30 дней со дня принятия соответствующего решения с уплатой процентов за фактический срок пользования денежными средствами по облигациям семнадцатого и девятнадцатого выпусков по процентной ставке, равной 9,5 (девять целых пять десятых) процента годовых, по облигациям восемнадцатого выпуска – по процентной ставке, равной 10 (десять) процентов годовых в наличном либо безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

19. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций ОАО «Белинвестбанк» семнадцатого, восемнадцатого и девятнадцатого выпусков.
С проспектом эмиссии облигаций можно ознакомиться на сайте ОАО «Белинвестбанк» www.belinvestbank.by, а также в течение рабочего времени в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск, пр. Машерова, 29), тел. 146 (бесплатная справка), его филиалах по месту их нахождения, в том числе:
г. Минск, пр. Машерова, 29, тел. (017) 289-28-15
г. Минск, ул. Немига, 40, тел.: (017) 200-62-02, 222-48-75
г. Минск, ул. Гинтовта, 30, тел. (017) 286-62-25
г. Минск, пл. Свободы, 17, тел. (017) 222-46-19
г. Минск, ул. Филатова, 12, тел. (017) 296-30-52
г. Минск, ул. Одинцова, 69, тел. (017) 259-46-44
г. Минск, ул. Интернациональная, 25, тел.: (017) 289-13-50, 289-13-62
г. Минск, ул. Маяковского, 16-а, тел. (017) 223-07-30
г. Минск, пр. Независимости, 77, тел. (017) 292-05-05
г. Минск, ул. Ленина, 16, тел. (017) 227-83-79
г. Минск, пр. Партизанский, 6-а, тел. (017) 298-33-17
г. Минск, ул. Коржа, 11-а, тел.: (017) 201-22-44, 208-27-63
г. Минск, ул. Могилевская, 5, тел. (017) 229-14-05
г. Минск, ул. Одоевского, 6-а, тел.: (017) 228-25-16, 228-25-20, 250-59-43
г. Минск, ул. Коллекторная, 11, тел.: (017) 217-30-00, 217-31-20
г. Минск, ул. Мельникайте, 2, тел.: (017) 239-15-00, 239-15-01
г. Молодечно, пер. Партизанский, 1, тел.: (01773) 7-02-91, 7-77-75
г. Борисов, ул. Орджоникидзе, 55, тел.: (0177) 76-23-23, 73-45-11
г. Брест, ул. Советская, 50, тел. (0162) 23-08-36
г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, тел.: (0212) 29-75-02, 29-75-01
г. Гомель, ул. Советская, 7, тел. (0232) 79-10-04
г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, тел. (0152) 79-02-00
г. Могилев, ул. Первомайская, 29-а, тел. (0222) 29-42-04

Председатель Правления ОАО «Белинвестбанк» **А.Е. Рутковский**
И.о главного бухгалтера ОАО «Белинвестбанк» **Н.И. Каргина**

Специальное разрешение (лицензия) Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/0385555, действительно до 16.03.2014 г. Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 3 от 27.10.2006 г. Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», УНП 807000028.

Выпрабавана на сабе

Па слядах вясковых «гастралёраў»

Карэспандэнт «Звязды» паўтарыў шлях бандытаў, якія абрабавалі вясковую краму ў беларускай глыбінцы. Яго спрабавалі затрымаць міліцыянеры, але адразу не здолелі. Уцякаў хутка.

Калі б насамрэч я самастойна зрабіў тое, што адбывалася пад кантролем міліцыянераў, гадоў 15 пазбаўлення волі мог бы атрымаць. Пры ўсім тым, што «ўзялі б» з таварышамі пры гэтым (падчас учынення злачынства) толькі... 15 тысяч рублёў. Выходзіць, за кожную тысячу год!

Я маю на ўвазе, напэўна, самае неразумнае ў крымінальнай гісторыі краіны рабаўніцтва ў Аршанскім раёне. Нагадаю: тры бандыты абрабавалі краму ў вёсцы Засеклі.

Калегі з беларускага тэлебачання, каб «зрабіць» «карцінку», папрасілі мяне і майго таварыша з гарадской газеты Мікалая Бегунова сыграць ролі гангстараў. Сядзім у машыне. Чакаем. Не паспеў і закурыць, грыміць сірэна, прыязджае міліцэйскае аўто. Мы па камандзе людзей з тэлебачання пабеглі. Колю, як больш маладога, затрымалі, рукі за спіну. Мяне ж пашкадавалі. Маўляў, ты той, які збег. А трэцяга «героя» ў лесе для здымак мы не знайшлі. Ці пабачылі вы той сюжэт па цэнтральным тэлебачанні? А паказваць яго збіраліся ў розных праграмах.

Цяпер пра храналогію сапраўдных падзей. А сёмай гадзіне вечара тры гастралёры са Смалявічаў Мінскай вобласці пад'ехалі на «Волзе», якая належыць аднаму з іх, да звычайнай вясковай крамы.

Чаму выбралі менавіта яе для рабаўніцтва? Як растлумачылі міліцыянеры ў Аршанскім РАУС, другія варыянты (а агледзелі перад рабаваннем зладзеі некалькі крамаў), верагодна, бандытаў не задаволілі, бо пакупнікоў там больш.

— Бандыты былі ў масках, зробленых з панчох чорнага колеру, — расказвае гандлярка той самай крамы Іна Карпенка **(на фота)**. — Той, які да прылаўка падышоў, загадаў мне не крычаць. А я ж, безумоўна, вельмі спужалася. У краме была адна. З пісталетам у руцэ загадаў кінуць грошы ў пакет. А я, быццам бы «на аўтамаце», пачала кідаць розны тавар. Як потым падлічыла — усяго на суму 15 тысяч рублёў. А, дарэчы, на той час выручка ў касе крамы была на суму больш за 2 мільёны рублёў. Вельмі баялася, што самі яны грошы з касы забяруць. Перадала пакет. Трывожнай кнопкі ў нас у краме няма. Сігналізацыя ўключаецца толькі на ноч. Вядома ж, са страху можна ўсё аддаць. Ды, відаць, вельмі спужалася. Пасля патэлефанавала ў міліцыю.

Далейшыя падзеі — добрая канкурэнцыя амерыканскаму касаваму фільму. Уявіце сабе наступнае. Хутка прыехалі міліцыянеры. З раённага цэнтра адправіўся нарад ДАІ. Выкарыстоўвалі і грамадскі транспарт. Машынай дапамог кіраўнік мясцовай сельскагаспадарчай арганізацыі.

Хвілін праз сорак «Волгу» знайшлі ў лесе.

Яе, між іншым, зладзеі спрабавалі схаваць — галлём закідалі. Міліцыянеры пры затрыманні бандытаў стралялі. Праўда, у паветра. Аднаго злодзея адразу затрымалі. Яшчэ два збеглі.

Больш за дзесяць міліцэйскіх машын былі ў гэтым раёне. Міліцыянеры са службовымі сабакамі шукалі бандытаў. Вельмі дапамагло тое, што ў салоне аўтамабіля злачынцаў міліцыянеры знайшлі два мабільныя тэлефоны. Вызначыць, чые яны, не было складанасці.

Калі стала вядома, што рабаўнікі са Смалявічаў, чакалі іх з'яўлення ў тым кірунку. І не памыліліся. Ужо на наступны дзень пасля абрабавання крамы а восьмай гадзіне раніцы затрымалі другога злодзея, прыкладна праз гадзіну і трэцяга — ля дарогі Орша — Лепель.

Высветлілася, што толькі адзін з іх раней неаднаразова судзімы. Астатнія толькі мелі праблемы па лініі ДАІ. Хлопцы ўсе маладыя — ва ўзросце да 22 гадоў. Двое цяпер у следчым ізалятары, трэці даў падпіску аб нявыездзе. Пісталет быў цацачным. Зброю ў зладзеяў так і не знайшлі.

Навошта пайшлі на злачынства? Няўжо так есці хацелася?

Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.

Аршанскі раён.

ТЭЛЕВІЗАР ДЛЯ МАШКІ І МІКАЛАЯ НІКІФАРАВІЧА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мо, яно і да лепшага, што не атрымалася, падумалі мы, зазірнуўшы на хвілінку на канферэнцыю педагогаў — да афіцыйна-дзелавога фармату сустрэчы наўрад ці пасавала асобнае камернае свята. Таму гэта свята варта было даставіць непасрэдна дадому, і наш дэсант узяў курс на Міхейкі.

— О, а мы вас чакаем! Заходзьце, пакаштуйце яблычкаў! — гасцінна запрасілі гаспадары да місы з антонаўкамі. Вартавы сабака, гаўкнуўшы некалькі разоў для парадку, прызнаў наведнікаў за сваіх і саступіў дарогу, а вось улюбёнка Ганчарэвічаў котка Машка адразу ўпэўнена накіравалася да скрыні з тэлевізарам, аглядаць абноўку. «Вось ужо старому падарунак будзе, — замілавана пляснула рукамі жонка Валянціна Данілаўна. — А я ўсё не верыла, што пашанцуе, гаварыла яму — колькі гадоў тую «Звязду» выпісваеш, людзям штосьці выпадае, а табе ніколі ўдачы не было, кідай дурное! Не, кажа, не расстануся са «Звяздой», прывык ужо...».

Мікалай Нікіфаравіч не расстаецца з газетай ужо больш за 20 гадоў. Раней працаваў трактарыстам, потым у ваенным гарадку слесарам, незадоўга да пенсіі — укамплектоўшчыкам. Выгадаваў траіх дзяцей, мае шэсць унукаў і шэсць праўнукаў. Цяпер вось на прысядзібным участку збольшага робіць усё сам, хоць здароўе ўжо не тое, і з гаспадаркі засталіся толькі котка, сабака ды пяць курэй. Але цікавасць да жыцця ў старога — не кожны малады столькі мае. Газеты чытае ад першай старонкі да апошняй: «Усё запар люблю: і пра палітыку, і пра сельскую гаспадарку, і эканамічныя пытанні — бо цікава ж, што ў свеце адбываецца». Ды і выйграны тэлевізар лішнім не будзе — вельмі любіць гаспадар падоўгу за ім заседжвацца. Каб не перашкаджаць жонцы, глядзіць апошнія навіны ў навушніках у кампаніі Машкі, якая таксама пільна сочыць за карцінкамі на экране. Мы пажадалі гаспадарам, каб «звяздоўскі» прыз служыў доўга і паказваў усё больш добрыя навіны. «От, цяпер будзем і суседзяў агітаваць», — заўсміхаліся Ганчарэвічы.

Развітаўшыся са слуцкімі знаёмцамі, накіроўваемся ў Ганцавічы, дзе ўжо чакае сустрэчы наш чарговы прызёр **Ніна КАЗАК** (яна выйграла фірмавы гадзіннік). «Я выпісвала раней іншае выданне, але потым вырашыла перайсці на «Звязду», — расказала Ніна Міхайлаўна, — і не шкадую, вельмі падабаецца. Хоць сама размаўляю па-беларуску не надта ўпэўнена, мова ў нас больш мяшаная з рускай, але чытаю з задавальненнем — і рубрыку «Абзац», і «Краіну здароўя», і гаспадарчыя парады. Няма таго дня, каб газету не паглядзела, і мужа таксама прывучыла...». Гледзячы на зграбную постаць гэтай абаяльнай жанчыны, цяжка паверыць, што яна — прафесійны кухар, без нечага 30 гадоў працуе ў дзіцячым садку. А яшчэ ў яе вельмі лёгкая рука, і ў разнастайных розыгрышах ды латарэях пастаянна шанцуе — няхай і не з буйнымі прызамі, але тэндэнцыя прыемная.

У Клецку «звяздоўскі» дэсант перадаў выйграны электрапрас паштальёну АПС Шчэпічы **Таццяне НЕСЦЕР** — з нашымі найлепшымі пажаданнямі. І з удзячнасцю, бо дзякуючы рабоце Таццяны Уладзіміраўны, на яе ўчастку да пастаянных падпісчыкаў «Звязды» дабавіліся новыя. «Чым пераконваю людзей? Даводжу, што газета добрая, звяртаю ўвагу на тое, што шмат карыснай інфармацыі для пенсіянераў, узгадваю, што яна на беларускай мове — для многіх людзей гэта важна», — пералічвае Таццяна Несцер. Ёй, дарэчы, у розыгрышах прызоў сярод супрацоўнікаў пошты таксама шанцуе — жартуе, што так паступова і «ўкамплектуецца» ўсёй тэхнікай, неабходнай для жыцця. А мы, калі што, з задавальненнем прывязём чарговыя прызы.

Зазірнулі мы і ў **Ляхавічы**, дзе яшчэ адзін электрапрас таксама знайшоў сваю гаспадыню — паштальёна АПС Ліпск **Таццяну НЕВЯРОЎСКУЮ.** Таццяна Канстанцінаўна мае свой падыход да падпісчыкаў — у цяжкі фінансавы час прапануе падпісацца на месяц, а там — як пойдзе. Звычайна атрымліваецца, што «ідзе» і далей — яшчэ на месяц, і яшчэ... «Але хапае і такіх верных падпісчыкаў, хто са «Звяздой» трымае сяброўства не адзін дзясятак гадоў, — адзначае Таццяна Канстанцінаўна. — І як бы складана ні было з грашыма, не адмаўляюцца ад падпіскі — кажуць, без «Звязды» неяк пуста ў хаце, чагосьці не хапае... Я і сама пастаянна яе выпісваю, чытаем з мужам, з дзецьмі па чарзе».

Ну як тут не прыгадаць фразу з кінафільма «Несусветная мітусня»: «Кажуць: добра там, дзе нас няма... Атрымліваецца ўсё-такі, што добра там, дзе мы ёсць». Асабліва калі «там» цябе любяць і чакаюць. Сустрэнемся — на старонках «Звязды» і ў чарговых вандроўках!

Вікторыя ЗАХАРАВА, Уладзімір ЗДАНОВІЧ (фота).

Мінск — Узда — Слуцк — Ганцавічы — Клецк — Ляхавічы — Баранавічы — Мінск.

Хто каго?

«Каб у дзеўках не застацца, дзеўкам трэба падабацца...»

За што купіў, за тое і прадам, хоць гэта цяпер і не модна: кажуць, камбайнер адзін на працы затрымаўся (у чарговы раз) і да цёмнага... А ўжо стаміўся, — ледзь дадому прыпоўз: абмыцца яшчэ сілы хапіла і нешта з'есці — па драбязе... А больш... На жонку паглядзеў ды і пытаецца: «А можна я свае сужэнцкія абавязкі грашыма сёння аддам?». Тая — не дзіўна было б, каб згадзілася! Дзіўна, што — ніколі не паверыце — грошай не ўзяла!

Бо... усё зразумела — бітва (за ўраджай...), пярэдні край — не да любошчаў. Як продкі мовілі, не да пацераў, калі хата гарыць.

Вось і чытачам (мяркуючы па нашай пошце) не да гуляў цяпер, не да забавак ды вершыкаў нейкіх: справай трэба займацца.

Але ж конкурс (па меркаванні Валерыя Гаўрыша з Пастаўшчыны) — таксама справа. І досыць сур'ёзная, бо, па-першае, упрыгожвае сабой найстарэйшую беларускую газету, па-другое, не дае «заржавець» мазгам чытачоў, па-трэцяе, абуджае таленты і, адпаведна, не дае ім загінуць, уздымае многа вострых праблем, паляпшае настрой...

Калі гэта і насамрэч так, то здымак ну, згадзіцеся, без подпісу ніколі не будзе!

Мы ў гэтым ужо пераканаліся. Цяпер прапануем вам. І пачнём з назірання, з адкрыцця, якое зрабіў Мікола Старых з Гомеля:

Між жывёлін сама болей
Песень складзена пра коней:
«Лятуць коні», што з «Пагоні»,
Адзін «Конь гуляў па волі»,
«Ехаў Ясь на кані»,
Ёсць і «Конік без нагі»...
Калі-небудзь нехта звонка
Прапяе пра амазонку?

Ну, безумоўна ж!.. І нават... зараз: яна, па меркаванні Уладзіміра Сітніка з вёскі Палажэвічы Старадарожскага раёна, спецыяльна для гэтага марафет наводзіць і ўсім выглядам сваім папярэджвае:

Пачакай... Да трэніроўкі
Я падмажу вусны, броўкі...
І царыцаю над пляцам
Буду сёння ўзвышацца...
Як пабачыць трэнер строгі —
Так і брыкнецца пад ногі...
Я ж, магчыма, пашкадую:
Падыму і... пацалую.

Спадар Сітнік гэта абяцае (за дзяўчыну) і не піша, што будзе далей.

Можа, і правільна робіць, бо ўсё ж і так зразумела, і так... напісана. Дзе? Спадарыня Лабажэвіч з Клецка мяркуе, што на «твары»... у каня:

Вось — паверыў гэтай цёці, —
Апынуўся ў аброці.
Калі клёпак не хапае,
Так і з хлопцамі бывае.

З таго ж канверта і сумнае:

Шмат пабачыў гэты конь —
Быў калісьці, як агонь...
А цяпер — прыціх, абмяк...
У аброці з кожным так.

Няволя ёсць няволя — дакладнае назіранне. І крыўднае, бо...

Стаў рахманы, паслухмяны,
Бо даверыўся падману:
Расчасана яго грыва,
Але выгляд — не шчаслівы.

Прычыны? «Аброць» — гэта раз. Але ж бачаць чытачы і многае іншае. Ну лічыце:

Конь буланы працаваў —
Сваіх сіл не шкадаваў.
Толькі... Скончыўся давер,
Ён, як я, — пенсіянер:
Зняць на картку яшчэ могуць,
А рублём — ці дапамогуць?

Наўрад...

Але ж мы не пра тое. Працягам тэмы ў Любові Міхайлаўны Чыгрынавай з вёскі Забалацце Вілейскага раёна — яна думкі гэтага каня падслухала:

Во часы насталі —
Ні сена, ні аўсу...
Баюся — не загналі б
Цяпер на каўбасу.

Не зразумела, праўда, прычым тут дзеўка... Але ж у Анатоля Гарачова з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна ёсць радкі і пра яе:

Знайшоўшы вольную гадзінку,
Брунетка сталася бландзінкай.
Далей, за гаспадыняй следам,
Буланка стала ўжо гнедай.
А зараз — крыўда... Аж да болю,
Бо не прайсці ім фэйс-кантролю.

Адпаведна — нікуды не выехаць (за мяжу). А запрашалі ж! Уладзімір Ільіч Барысёнак з вёскі Пліна Ушацкага раёна піша, што

Паступіла SMS
Завітаць хутчэй на фэст...
Але як тут быць дзяўчыне?
Хто ж яе туды падкіне?
Хіба сесці на кабылу?..
Хоць павольна, ды без дыму.

І гэта — правільна! Бо трэба ж берагчы навакольнае асяроддзе. Да таго ж дзяўчына на кані — гэта амазонка. Нават гучыць прыгожа! А ўжо глядзецца будзе!.. Ды тая студэнтка, камсамолка, спартсменка і прыгажуня з «Каўказскай палонніцы» проста адпачывае.

Адкуль і верш:

На Нарачы яна марачка,
У Ратамцы яна казачка,
Грызе як семкі тыя тэсты
І... нічыя пакуль нявеста.
Могуць скрасці за мяжу...
Таму хлопцам я скажу:
До гарэлку-піва піць —
Час яе запаланіць.

Раіць гэта Валерый Гаўрыш з вёскі Навасёлкі Пастаўскага раёна, раіць хлопцам, ведаючы, што дзеўкі зусім не супраць палону. Каб трапіць у яго, чаго яны толькі не робяць! І ў прыватнасці (па меркаванні сужэнцаў Астроўскіх з Мінска):

І зімой і цёплым летам
Адзін клопат у кабетаў:
Што б яшчэ падмаляваць,
Каб прыгожа выглядаць?

Хоць знешнасць, як кажуць людзі дасведчаныя, і не самае галоўнае (а тым больш на спаборніцтвах, што да гэтай канкрэтнай дзеўкі (са здымка) і спрабуе давесці спадар Гарачоў з Іўеўшчыны. Ён піша:

Яшчэ раз кажу табе,
Хоць і не шматслоўны я,
Што ў спартыўнай барацьбе
Твар твой — не галоўнае.

Мо пра яго, пра самае галоўнае, піша Ала Тарасік з Мінска?

Так, паэты праўду кажуць:
Можам мы каня спыніць...
Потым — твар сабе падмазаць...
Пакуль хата не гарыць.

Тут хтосьці можа папракнуць — наконт паэ**таў**. Ён, Мікалай Някрасаў, маўляў, адзін быў, пісаў без сааўтараў. У тым ліку і крылатае (пра жанчыну):

...В игре её конный
не словит,
В беде не сробеет —
спасёт:
Коня на скаку
остановит,
В горящую избу войдёт!

Але ж вядомыя многім і іншыя радкі — Навума Каржавіна (прыводжу па памяці):

Столетья промчались, и снова,
Как в тот незапамятный год:
«Коня на скаку остановит,
В горящую избу войдет»...
Ей жить бы хотелось иначе —
Надеть подвенечный наряд,
Но кони всё скачут и скачут,
А избы горят и горят».

Іншымі словамі —

«Полжизни выживаешь,
Полжизни — доживаешь»,

Успамінаючы потым, што:

У маладосці дні бывалі —
Усе навыперадкі рвалі!..
Дзе ж цяпер азарт гарачы?..

Дзеўкі — бабы, коні — клячы, — канстатуе спадар Гарачоў з Іўеўшчыны.

Але ж завяршаць чарговы конкурсны агляд на гэтакай сумнай ноце мы не будзем. Будзем, як заўжды, на аптымістычнай. Мінчанка Тарасік у якасці подпісу да здымка прапануе жыццесцвярджальнае:

Каб у дзеўках не застацца,
Дзеўкам трэба падабацца —
Хоць каму...
Ды хоць каню.

Праўда, з гэтым канём (са здымка) «нумар», мусіць, не прайшоў? І невядома, ці пройдзе? Нейкі ён (ну, гляньце!) — затуханы, загнаны.

Але ж

Як каму падняць імпэт,
Для жанчыны не сакрэт, —

сцвярджае Уладзімір Дземчанка з вёскі Машканы Сенненскага раёна. А значыць, мо і ў камбайнера таго (што хацеў ад жонкі адкупіцца) не ўсё яшчэ страчана?..

Зрэшты, пра жанчын і мужчын, нашы асаблівасці і ўзаемаадносіны ў рубрыцы «Хто каго?» мы пісалі — не раз. Прынамсі, на мінулым здымку, калі памятаеце, рэчачка была. І ў ёй мужык пялёскаўся, нешта мыў. Па меркаванні вялікага чытацкага журы, найпрыгажэйшыя радкі пра яго напісалі спадарыні Лабажэвіч з Клецка і Чыгрынава з Вілейшчыны, спадары Сітнік са Старадарожчыны, Дубовік з Бярэзіншчыны і Федарака... Яго радкі

Некалі Алёны
мылі ручнікі,
А цяпер пра гэта
дбаюць мужыкі:
Лета, надвячорак,
беражок Усы...

Мые дзядзька Зосім жончыны трусы лепшымі прызнала і журы рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на «Звязду» на чацвёрты квартал гэтага года накіроўваецца ў Скідзель. Хочаце, каб да вас, — пішыце! Здымак, як заўжды, дадаецца. Умовы ранейшыя — сцісла (не больш за 8 радкоў), трапна і, пажадана, разборліва.

Валянціна ДОЎНАР.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ХТО НЕ ЗВАЛЬНЯЕ, ТОЙ МАЕ

У Беларусі будуць дзейнічаць дадатковыя стымулы для найманых работнікаў, якія захоўваюць працоўныя месцы для інвалідаў — аб гэтым паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай Коханаў.

Праблема захавання працоўных месцаў абвастрылася сёлета — у сувязі з пагаршэннем эканамічнага стану часткі прадпрыемстваў. У сувязі з гэтым, адзначыў Мікалай Коханаў, з'явілася неабходнасць падтрымаць наймальнікаў, якія не скарачаюць работнікаў з абмежаванымі магчымасцямі. Так, плануецца, што прадпрыемствы грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў змогуць карыстацца фінансавай падтрымкай на набыццё новага абсталявання — гэта павялічыць іх канкурэнтаздольнасць і дазволіць захаваць працоўныя калектывы.

Сяргей ГРЫБ.

КЫРГЫЗСТАН ПРАПАНОЎВАЕ БЕЛАРУСІ СВАЕ ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

Пра гэта заявіла Ішэнкуль Балджурава, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кыргызскай Рэспублікі ў Беларусі.

Па словах спадарыні Балджуравай, Урад Кыргызстана ўжо накіраваў лісты ва Урад Беларусі з запрашэннем да ўдзелу ў будаўніцтве гідраэлектрастанцый на рэках краіны.

— Мы намячаем будаўніцтва на Нарыне шэрагу гідраэлектрастанцый, у тым ліку і «Камбарата-1», «Камбарата-2», якія былі запланаваныя яшчэ ў савецкі час, — кажа пасол Кыргызстана, — У будаўніцтве аднаго з «Камбаратаў» актыўна бярэ ўдзел расійскі бізнэс. Хацелі б таксама паўдзельнічаць і кітайцы. У нас цесныя стасункі з краінамі СНД, таму мы запрашаем іх, у тым ліку і Беларусь. Нагадаю, што адна з самых танных відаў энергіі — энергія вады. Гэта вельмі прыбытковая справа, яна хутка акупляецца. Мы можам прадаваць лішак у Кітай, Пакістан і Індыю. Мы прапаноўваем Беларусі паўдзельнічаць не толькі ў будаўніцтве буйных электрастанцый, але і ў будаўніцтве малых гідраэлектрастанцый на невялікіх рэках.

Напрыканцы чэрвеня Кыргызстан наведала беларуская група дырэктараў мяса-малочных заводаў. Ёсць планы стварыць сумесныя прадпрыемствы па выпуску дзіцячага харчавання і мясных кансерваў. Беларусь пастаўляе ў Кыргызстан свае тралейбусы, ліфты і камунальную тэхніку. Вялікім попытам, па словах спадарыні Балджуравай, карыстаецца беларуская мэбля. У Кыргызстане існуе беларускі цэх па зборцы трактароў «Беларусь», а таксама свой гандлёвы дом.

Настасся ЗАНЬКО.

ПАРСЮК, КАЗА І ВЫВАДАК ІНДЫКОЎ

З поля каля вёскі Забіяка пад Гомелем раптам знікла каза, якая там звычайна пасвілася. Жывёліну прыгледзеў, а потым звёў непрацуючы, раней судзімы грамадзянін вёскі Чырвонае. Казу забралі, а вось злодзея шукаюць. Некалькі раней у вёсцы Маложын Брагінскага раёна невядомы праз незачыненыя дзверы вывеў з хлява індычку разам з вывадкам індычанят. А ў вёсцы Данілавічы Веткаўскага раёна здабычай злодзея стаў... парсюк. Яго выкралі зноў жа з незачыненага хлява глыбокай ноччу. І ні табе «рох-рох»...

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ТАК ХАЦЕЛАСЯ БУЛЬБЫ, ШТО КАПАЛІ РУКАМІ

30 жніўня каля 3 гадзін ночы каля вёскі Вейна служба аховы аграгандлёвай фірмы затрымала дзве фурманкі з мяхамі бульбы. Выявілася, што кампанія мужчын і жанчын розных узростаў — ад 20 да 50 гадоў, але адной скіравансці — з 6 чалавек два асуджаныя і 5 нідзе не працуюць, спрабавалі скрасці каля тоны бульбы. Яны капалі яе ўначы на полі фірмы «Вейна» прама рукамі, без рыдлёвак, больш за дзве гадзіны. Аднак крадзеж не ўдаўся: 890 кілаграмаў на суму 370 тысяч рублёў служба аховы і міліцыя вярнулі гаспадарцы.

Алена КАЗЛОВА.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся на «Звязду» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 1 верасня па 12 кастрычніка 2009 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда».

2. Арганізатар Гульні — Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» « (далей — Арганізатар), зарэгістраваная рашэннем Мінскага гарвыканкама ад 02.08.2001 № 1010 у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў за № 100155376, УНП 100155376, месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» сфарміраваны за кошт чыстага прыбытку арганізатара гульні — установы «Рэдакцыя газеты «Звязда» і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ (руб.)	Усяго з ПДВ (руб.)
1	Электрачайнік Adler AD 122 (краіна ўвозу — Польшча)	7	40657	284 598
2	Блэндар FF-5280 (краіна ўвозу — Кітай)	7	65419	457 934
3	Тэлевізар «Віцязь» 54ctv720-3, г.Віцебск	7	305 000	2 135 000
4	Пыласос Samsung VCC 4023 S3B/XEV (краіна ўвозу — Латвія)	1	152 320	152 320
5	Халадзільнік «Атлант» МХМ 2835-90, РБ	1	928 556	928 556

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» складае 3 958 408 (Тры мільёны дзевяцьсот пяцьдзесят восем тысяч чатырыста восем) беларускіх рублёў.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ. ПАРАДАК АДБОРУ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ

4. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які афарміў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на другое паўгоддзе або чацвёрты квартал 2009 года.

5. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Рэдакцыі ў перыяд падпіснай кампаніі на другое паўгоддзе або чацвёрты квартал 2009 года выразаная з газеты запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая друкуецца да двух разоў на тыдзень у перыяд з 1 па 30 верасня 2009 года ўключна ў газеце «Звязда».

6. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

7. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або якія паступілі ў рэдакцыю пасля 6 кастрычніка 2009 года па паштовым штэмпелі атрымання да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. КАМІСІЯ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

8. Для правядзення Гульні Арганізатар стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» (далей — Камісія) з тэрмінам паўнамоцтваў з 1 верасня па 12 кастрычніка 2009 года ў складзе пяці чалавек.

9. На пасяджэнне Камісіі ў якасці назіральнікаў без права галасавання могуць запрашацца падпісчыкі газеты або прадстаўнікі незалежных арганізацый.

10. Пасяджэнні Камісіі з'яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці з яе зарэгістраванага складу.

11. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з'яўляецца вырашальным.

12. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

13. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 8 кастрычніка 2009 года ў 12 гадзін у памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

14. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

15. Спачатку разыгрываюцца асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска па адным электрачайніку, блэндары і тэлевізары «Віцязь».

У сувязі з тым, што Мінская вобласць стабільна забяспечвае найбольшую колькасць падпісчыкаў, для гэтага рэгіёна дадаткова разыгрываецца адзін пыласос.

16. Выйграўшым прыз лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне наўздагад са скрыні хто-небудзь з падпісчыкаў або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. У кожную такую картку ўдзельніка ўпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

17. Для розыгрышу халадзільніка ўсе астатнія карткі ўдзельнікаў, па якіх не былі выйграны прызы, змяшчаюцца ў адну скрыню і старанна перамешваюцца.

Вызначэнне ўдзельніка, які выйграў, адбываецца ў парадку, вызначаным пунктам 16 гэтых Правілаў.

18. Удзельнікам, якія выйгралі прыз, Арганізатар да 18 кастрычніка 2009 года дасылае паведамленне пра гэта заказным лістом з указаннем тэрміну атрымання прыза.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

19. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца падача ўдзельнікам, які выйграў прыз, пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другое паўгоддзе або чацвёрты квартал 2009 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка ўдзельніка Гульні ён павінен падаць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другое паўгоддзе або чацвёрты квартал 2009 года.

20. Выдача прызоў (акрамя тэлевізараў і халадзільніка) ажыццяўляецца ў тэрмін па 25 снежня 2009 года ў памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён.

21. Дастаўка і ўручэнне тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляецца Арганізатарам Гульні ў тэрмін па 25 снежня 2009 года ўключна з паведамленнем аб канкрэтнай даце дастаўкі праз публікацыі ў сродках масавай інфармацыі.

Астатнія прызы могуць быць дастаўлены грамадзянам, якія іх выйгралі, па ўзгодненні з Арганізатарам і пры ўмове іх пражывання ў мясцовасці, блізка размешчанай ад мясцовасці пражывання грамадзян, якія выйгралі тэлевізар або халадзільнік.

22. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

23. Пасля 25 снежня 2009 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

24. Удзельнік Гульні, які выйграў прыз, нясе адказнасць за падачу падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

25. Удзельнікі Гульні, якія выйгралі прызы, і іх свайкі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Арганізатарам Гульні ў любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Арганізатару Гульні.

26. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», склад камісіі па яе правядзенні, памер і склад прызавога фонду да пачатку рэкламнай гульні апублікоўваюцца сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў сродках масавай інфармацыі.

27. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца па 18 кастрычніка 2009 года ўключна ў газеце «Звязда».

28. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 19 68.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі Правілаў правядзення рэкламнай гульні № 1518 ад 26.08.2009 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

1. ЗДАНОВІЧ Уладзімір Аляксандравіч
намеснік галоўнага рэдактара газеты «Звязда»
2. ДОЎНАР Валянціна Аркадзьеўна
загадчык аддзела пісьмаў газеты «Звязда»
3. ПРУС Таццяна Віктараўна
вядучы рэдактар тэхнічны газеты «Звязда»
4. ДАБРАВОЛЬСКІ Анатоль Васільевіч
вядучы рэдактар тэхнічны газеты «Звязда»
5. ДЗЕВОЙНА Алена Уладзіміраўна
рэдактар юрыдычнага аддзела газеты «Звязда»

Тэрмін паўнамоцтваў Камісіі з 1 верасня па 12 кастрычніка 2009 года.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2009 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 6 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць электрачайнікі, блэндары, пыласос, тэлевізары «Віцязь» і халадзільнік «Атлант». Розыгрыш прызоў адбудзецца **8 кастрычніка 2009 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 18 кастрычніка 2009 г.**

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **па 25 снежня 2009 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2009 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 25 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Тэрмін правядзення гульні — з 01.09.09 па 12.10.09.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1518 ад 26.08.09, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

1 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2009 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на IV кв. або 2-е паўг. 2009 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЬЮ»

(індэкс выдання) _____
Колькасць камплектаў _____
на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)
_____ (адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месяца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету _____
(індэкс выдання)
ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЬЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб.; пераадрасоўкі _____ руб.
Колькасць камплектаў _____
на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)
_____ (адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

МІНЧАНЕ Ў ГРАМАДСКІМ ТРАНСПАРЦЕ ЧАСЦЕЙ ЗА ЎСЁ ГУБЛЯЮЦЬ ПАРАСОНЫ І КАШАЛЬКІ

Пакідаюць таксама сумкі з кнігамі, цацкамі, будаўнічымі матэрыяламі і нават папкі з навуковымі працамі.

Як паведамілі ў службе арганізацыі руху дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», згубы ў асноўным носяць сезонны характар. Восенню гараджане часцей за ўсё забываюць парасоны, зімой — пальчаткі, шапкі, а летам — дамскія сумачкі. Нямала і кур'ёзных выпадкаў. Так, аднойчы мужчына пакінуў у аўтобусе сабаку, прывязанага да сядзення. Жывёла каталася, пакуль забыўлівы гаспадар не спахапіўся і не вярнуўся па гадаванца. Яшчэ адзін мінчанін нядаўна забыўся ў салоне акварыум з рыбкамі, які вёз у падарунак каханай дзяўчыне.

Забытыя рэчы вадзіцелі перадаюць на дыспетчарскія станцыі або ў аўтобусныя паркі, адкуль грамадзяне могуць іх забраць. Усе згубленыя ў наземным транспарце рэчы захоўваюцца на спецыяльных складах.

Андрэй ШМЫГІН, «Мінск—Навіны».

КІНУЛА СУЖЫЦЕЛЯ

Жыхарка Баранавічаў была ноччу ў свайго сужыцеля, а калі ўбачыла, што ён заснуў з непатушанай цыгарэтай, ад якой загараўся матрац, пакінула дом.

За тое, што ж

УзДАХ для аматараў мастацкіх тусовак

«Мастацтва паглынае сваіх сыноў і дачок» — гэты лозунг быў першым, што кінулася ў вочы на адкрыцці міжнароднага мастацкага фестывалю «Дах».

Задыхнуцца было сапраўды проста: колькасць наведнікаў у Палацы мастацтваў зашкальвала. І пакуль наступіла хвіліна адкрыцця, я пачала разумець, чаму для гэтага абраны праект «Ахвяры мастацтва» Зміцера Юркевіча і Алеся Родзіна. Бо тэарэтычна магла меркаваць, колькі ў сталіцы Беларусі аматараў сучаснага мастацтва, якія чакаюць у ім нейкага адкрыцця (такога, каб сапраўды з'ехаў дах), магла ўявіць і тых людзей, якія шукаюць новыя ідэі ў мастацкім свеце горада. Але практыка была пераканаўчай: колькасць асобаў, якім патрэбныя гучныя, незвычайныя, ашаламляльныя творчыя акцыі, у нас даволі вялікая, мала таго, яны шукаюць месцаў, дзе вось так можна сустрэцца, абмеркаваць убачанае, ды проста паглядзець на сабе падобных. Гэта бадай галоўнае, дзеля чаго патрэбныя такія акцыі.

Ну і яшчэ дзеля адкрытасці — усё-такі ёсць магчымасць параўнаць узровень творчых ідэй нашых аўтараў з тым, што ствараюць сучасныя мастакі Аўстрыі, Германіі, Італіі, Японіі ды іншых краін. Арганізатары з беларускага боку, да якіх далучыўся Беларускі саюз мастакоў, рабілі гэты праект пры падтрымцы берлінскага мастацкага цэнтра «Тахелес».

Амаль што за месяц (фестываль праходзіць да 20 верасня) можна будзе ўбачыць самыя розныя віды і формы сучаснага мастацтва — жывапіс, скульптуру, інсталяцыі, фота, перформанс. Нават літаратура і музыка далучаюцца і спалучаюцца з мастацкімі вобразамі ў гэтай акцыі, а некаторыя літаратары самі бяруцца за пэндзаль — напрыклад, Змісер Вішнёў і Браць Барысевіч.

Кожны тыдзень экспазіцыю збіраюцца абнаўляць, дапаўняць тое, што ёсць, новымі творчымі праектамі — канцэртамі, спектаклямі, выступленнем носьбітаў мастацтва слова (паэтаў) і прэзентацыяй кніг, паказам відэаролікаў, нават майстар-класамі.

Апошняе — абсалютна не лішняе. Бо сёння творцам сучаснага мастацтва ў прынцыпе можа стаць кожны, хто мае нейкую цікавую ідэю, якая здольная ўразіць іншых.

Што да першых уражанняў... То ўзняўшыся па прыступках на другі паверх Палаца мастацтваў, усе адразу беглі глядзець на чорную шахматную каралеву сярод чорна-белых клетак шахматнага поля. Ці разгадаў хто гэтую мастацкую шараду? Але амаль голая дзяўчына, пафарбаваная з ног да галавы чорным, відавочна вярэдзіла ўяўленне. Каралева, зразумела, ходзіць як хоча і ў чым хоча...

Але сапраўдным подзвігам дзеля мастацтва, мне падалося, было іншае дзеянне: дзяўчыну, якая сядзела ў клетцы, высунуўшы наверх галаву, гвалтоўна галіў нагала мужчына, вельмі падобны на інквізітара. Вось яна, рэальная ахвяра мастацтва...

У рэшце рэшт, кожны з нас — трошкі ахвяра мастацтва. Я не пра тых, хто прыйшоў на гэтую выставу і спрабаваў разгадаць яе шарады. Я пра тых, хто не разумее, навошта яно патрэбна. Дзеля гэтага важна мець падобныя акцыі і час ад часу на іх хадзіць. Бо сапраўды занадта шмат ахвяраў салоннага мастацтва. «Калі талент марнаваць на кіч нізкай пробы — дэградацыя чакае творчую асобу». Не толькі яе.

Ларыса ЦІМОШЫК.
Фота Пятра ФАМІНА.

«КАРАЛІ МУАЙ ТАЙ» У МІНСКУ

Упершыню ў Еўропе ў адной прафесійнай васьмёрцы сустрэнуцца лепшыя прафесійныя байцы шасці частак свету. У мінскім Палацы спорту 12 верасня пройдзе міжнародны турнір па тайландскім боксе «Каралі Муай Тай».

Па сваіх маштабах і ўзроўні байцоў турнір з'яўляецца беспрэцэдэнтным. Заваяваць за тытул караля будуць інтэркантынентальны чэмпіён з Вялікабрытаніі Майкл Дзікс, чэмпіён Паўночнай Амерыкі і чэмпіён свету ММА Вільям Рамэра, інтэркантынентальны чэмпіён з Туніса Ахмед Саадзі, двухразовы чэмпіён з Тайланда Наапарат, чэмпіён Аўстраліі і чэмпіён свету Курт Фіналсан, лепшы паўднёваамерыканскі баец Леанарда Мантэйра, чэмпіён свету і Еўропы, лепшы баец чэмпіянату Еўропы 2009 года расіянін Ігар Пятроў. Сярод удзельнікаў — беларускі баец муай тай, 14-разовы чэмпіён свету Андрэй Кулебін.

Міжнародны турнір «Каралі Муай Тай» праводзяць Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, Мінгарвыканкам, Нацыянальны алімпійскі камітэт, Беларуская федэрацыя кікбоксінга і тайландскага бокса сумесна з Міжнародным прафесійным клубам адзінаборстваў «Адзіная Русь» і Міжнароднай прафесійнай федэрацыяй WKN пры падтрымцы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.

СВЯТА БУЛАЧКІ

Шмат розных святаў ладзіцца ў Гродне, але ўпершыню яго галоўнай «дзейнай асобай» стала... булачка.

На Савецкай плошчы проста выдатны асартымент кулінарных, хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў. Іх прапанавалі жыхарам і гасцям горада над Нёманам «Гроднахлебпрам», гандлёвыя прадпрыемствы «Брэст», «Ліможж», «Купалінка» і іншыя. А па выніках «булачных» конкурсаў — адпаведныя прызы. Мажліва, свята булачкі стане ў Гродне традыцыйным. Ці, можа, адбудзецца свята дранікаў?

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II ПАЎГОДДЗЕ АБО IV КВАРТАЛ 2009 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ
ВЫСПЕРАМ ЧАРНОБЫЛЮ
МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
СВАЯ СПРАВА
ЖЫРАНДОЛЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ
Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	10 600 рублёў на месяц 63 600 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	9 990 рублёў на месяц 59 940 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	17 050 рублёў на месяц 102 300 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	15 550 рублёў на месяц 93 300 рублёў на паўгоддзе
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёск Мінгарсаюздруку)		
ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8 410 рублёў на месяц 50 460 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	7 830 рублёў на месяц 46 980 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	11 086 рублёў на месяц 66 516 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	10 525 рублёў на месяц 63 150 рублёў на паўгоддзе

Тэлесеткі

Беларусаў запрашаюць... у Каралеўскі Альберт-Хол

Менавіта тут па традыцыі адбываецца адна з найбольш значных музычных падзей года — канцэрт класічнай музыкі «The Last Night of the Proms». Ён з'яўляецца заключнай часткай штогадовага музычнага фестывалю BBC Proms, папулярнага не толькі ў Вялікабрытаніі, але і ва ўсім свеце.

Знакамітая карпарацыя BBC з'яўляецца яго арганізатарам з 1927 года, а заснаваны фестываль быў яшчэ раней, у 1895-м. Маштабны музычны форум доўжыцца цэлых восем тыдняў і складаецца з серыі так званых «праменадных канцэртаў», на якія акрамя білетаў на звычайныя сядзячыя месцы прадаецца яшчэ мноства танных стаячых месцаў. Уласна, з гэтым і звязана назва «праменадны» — канцэрт, які можна слухаць падчас прагулкі. Першыя падобныя мерапрыемствы праходзілі ў лонданскіх парках, дзе публіка сумяшчала прыемнае з карысным — дыхала свежым паветрам і слухала выступленні аркестраў. Цяпер жа праграма «BBC Proms» дзякуючы супрацоўніцтву з Еўрапейскім вяшчальным саюзам транслюецца ў дзясятках краін і збірае шматмільённую аўдыторыю, а сам фестываль лічыцца самым вялікім у свеце і самым дэмакратычным.

Сёлета да ліку «наведнікаў» фестывалю далучацца і беларусы. 20 верасня Першы канал пакажа заключны канцэрт сезона «The Last Night of the Proms», які, паводле задумкі арганізатараў, найлепш адлюструе дух фэсту: у канцэрце з двух аддзяленняў бяруць удзел лепшыя музыкі свету, а праграма аб'ядноўвае самыя папулярныя і новыя класічныя творы. Сёлета, напрыклад, у закрыцці сезона бяруць удзел галоўнае дзейнае сапрана Вялікабрытаніі Сара Коналі і Элісан Болсам, якая атрымала сусветнае прызнанне дзякуючы сваёй віртуознай ігры на трубе. У суправаджэнні вядучага брытанскага сімфанічнага аркестра і хору BBC артысткі выканаюць творы Гайдна, Гендаля, Кнусена, Персела і іншых кампазітараў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота прадстаўлена Першым каналам.

Лічба, якой не варта саромецца, нават калі ты — жанчына. Гэтыя словы мы адрасуем сёння **Валянціне Мікалаеўне ДАЙНЭКА**, якая 1 верасня, але трыццаць гадоў таму прыйшла ў «Звязду» і апынулася адналюбам: спачатку ў гарачым выдавецкім цэху, а зараз — за маніторам камп'ютара яна шчыруе над газетнымі палосамі, завяршаючы нашу супольную працу на шляху газеты чытача. Здароўя і ўдачы Вам, паважаная Валянціна Мікалаеўна! А яшчэ — Веры, Надзеі і Любові. Хоць апошняя ў Вас ужо ёсць — зусім нядаўна наша звяздоўская сям'я віншавала Вас з нараджэннем унучкі Любашы. Будзьце шчаслівыя!



ЗВЯЗДОЎЦЫ.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ТВОРЫ ЧЫТАЧОЎ

В. Жук, В. Тупік (Брэсцкая вобл.)



Белыя: Крс4, Лf6, Ка5, п. b4 (4).

Чорныя: Крb2, Сс8, п. е2 (3). Выйгрыш.

В. Жук, В. Тупік (Брэсцкая вобл.)



ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

Белыя: Крe2, Лg6, Kf3, п. b3 (4).

Чорныя: Крс7, Се6, Ке4, пп. b2, b5 (5).

Нічыя.

Прапануем чытачам паспрабаваць разабрацца ў тонкасцях гэтых эцюдаў. Ці могуць чорныя знайсці паратунак? Такое асноўнае пытанне ў аналізе гэтых твораў.

Чакаем вашых адказаў!

СА СТАРЫХ ПАРТЫЙ

Цікава пазнаёміцца з міні-партыямі. Кароткія партыі — не частая з'ява ў практыцы гросмайстраў і майстроў. Вось адзін з рэкордаў кароткасці шахматнай творчасці.

Мінгрэліен—Дураў (Кіеў, 1896 г.)

1. e4 d6. 2. Cc4 Kd7. 3. Kf3 g6. 4. Kg5 Kh6? 5. C:f7+! K:f7 6. Ke6. Чорныя здаліся.

А вось партыя Рэці—Дункельблюм (Вена, 1918 г.). Яна працягвалася 8 хадоў. 1. e4 e5. 2. Kf3 Kc6 3. Kc3 Cc5?! 4. K:e5! K:e5 5. d4 C:d4? 6. Ф:d4 Фf6 7. Kb5! Kpd8 8. Фc5! Чорныя здаліся.

А партыя Пільсберы—Фернандэс (Гановер, 1900 г.) працягвалася роўна на адзін ход больш. 1. e4 e5 2. Kc3 Kc6 3. f4 d6 4. Kf3 a6 5. Cc4 Cg4 6. fe K:e5? 7. K:e5 C:d1 8. C:f7+Kpe7 9. Kd5x.

Але ўжо здаўна вядома, што сапраўдным творам можа быць нават партыя без грубейшага промаху. Для прыкладу разгледзім партыю Шпільман—Флямберг (Мангейм, 1914 г.). 1. e4 e5 2. Kc3 Kf6. 3. f4 d5 4. fe K:e4 5. Kf3 Cg4 6. Фe2 Kc5 7. d4! C:f3 8. Ф:f3 Фh4+ 9. g3 Ф:d4 10. Ce3 Ф:e5 11. 0-0-0 c6 12. K:d5 cd 13. Л:d5 Фe6 14. Cc4 Фe4 15. C:c5! Чорныя здаліся.

І нарэшце яшчэ адзін выдатны ўзор шахматнай творчасці. Рэджыо—Тараш (Монтэ-Карла, 1902 г.)

1. e4 c5. 2. Kc3 Kc6 3. Kf3 e6 4. d4 cd 5. K:d4 Kf6 6. Kdb5 Cb4 7. Cf4 K:e4 8. Kc7+Kpf8 9. K:a8? Фf6 10. Фf3 K:c3 11. Cd2 Kd4! 12. Фd3 Фe5+ 13. Ce3 Ka4+ 14. c3 K:b2! і белыя здаліся.

ВЯСЁЛЫЯ РАДКІ

На адным з турніраў 1940 года састарэлы венгерскі майстар Штэрк заснуў за шахматнай дошкай. Штэрку прысніўся прыемны сон: ён прымае віншаванні з выпадку перамогі. Прачнуўся ў той момант, калі праціўнік зрабіў чарговы ход. Штэрк апрануўся і накіраваўся да выхаду. Здзіўленаму партнёру ён сказаў: «Хопіць, здалі партыю, значыць, усё кончана».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.18	20.00	13.42
Віцебск —	6.05	19.52	13.47
Магілёў —	6.08	19.50	13.42
Гомель —	6.07	19.44	13.37
Брэст —	6.34	20.15	13.41
Гродна —	6.37	20.13	13.36

Месяц

Поўня 4 верасня.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Андрэя, Мікалая, Цімафея.*
К. *Браніслава.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

НАДВОР'Е на заўтра



Неспрыяльныя дні і гадзіны ў верасні

1, аўторак, 0.00—2.30
3, чацвер, 4.30—15.00
5, субота, 16.00—23.00
6, нядзеля, 0.00—2.00
8, аўторак, 0.00—9.00
10, чацвер, 6.00—15.00
12, субота, 10.30—19.30
14, панядзелак, 13.00—21.30
16, серада, 15.00—23.00
19, субота, 0.00—1.00
20, нядзеля, 18.00—24.00
21, панядзелак, 0.00—4.00
23, серада, 2.30—10.30
25, пятніца, 13.00—21.30
28, панядзелак, 2.30—10.00
30, серада, 10.30—22.30

Дзве даты

1 верасня

Дзень Руху недалучэння. 1—6 верасня 1961 года ў Бялградзе адбылася першая канферэнцыя кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў краін, якія не ўваходзілі ні ў якія ваенна-палітычныя блокі і арганізацыі. У 1998 годзе Беларусь стала 114-м удзельнікам Руху недалучэння.

1939 год — з нападу фашысцкай Германіі на Польшчу пачалася Другая сусветная вайна.

1900 год — у вёсцы Рудкава на Уздзеншчыне нарадзіўся Сымон Баранавых, вядомы беларускі пісьменнік. Аўтар зборніка прозы «Злосць», рамана «Калі ўзыходзіла сонца», а таксама аповесцяў для дзяцей. Асноўная тэма творчасці — класавая барацьба ў беларускай вёсцы ў першыя гады савецкай улады, калектывізацыя. У 1936 годзе быў арыштаваны і асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Памёр у 1942 годзе. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1954-м.

Цытата дня:

«У любым становішчы заўсёды знойдзецца што-небудзь суцяшальнае. Калі добра пашукаць».
Даніэль Дэфо (1660-1731), англійскі пісьменнік, палітычны дзеяч.

ЖАРАЎ

СВЕТ І СУСВЕТ ЧАЛАВЕКА

У апошнія дні жніўня, у пачатку верасня назіралі за паводзінамі жораваў: «Калі жоравы паляцяць, то ў сярэдзіне кастрычніка мароз пачнецца, а калі не — то зіма позна прыйдзе».

● Жораў ва ўсім свеце з'яўляецца сімвалам стасункаў з боствамі. У культуры ўсходніх славян гэту прыгожую птушку заўсёды лічылі свяшчэннай, вестуном усяго добрага, станоўчага. Па ўяўленні нашых продкаў, увосень жоравы пакідаюць наш край, адлятаюць на зімоўку і нясуць з сабой прэч грэшныя душы, а рана ўвесну вяртаюцца з выраю (ірыю), каб прынесці з сабой душы будучых дзяцей, якія народзяцца ў гэты год. Сувязь жораваў з тым, іншым светам, светам продкаў, недвухсэнсоўна адлюстравалася ў культуры ўсходніх славян: калодзежы з доўгім шастом, пры дапамозе якога бралі ваду з глыбіні, таксама атрымалі назву «жораў».

● У час адлёту жоравы падаюць даволі гучны доўгі крык. Выхадзячы з народнай этымалогіі, чалавеку, які сумаваў, менавіта таму казалі: «Не журыся!».

● Жораў заўсёды быў годнай, незалежнай, недасягальнай для чалавека птушкай. Калі ў жыцці чалавека ствараліся сітуацыі, у якіх неабходна было зрабіць выбар, у народзе казалі: «Лепш сініца ў руках, чым жораў (журавель) у небе». Аб чымсьці вельмі жаданым, але недасягальным, казалі: «Што жораў у небе».

● Забіць жорава значыла назаўсёды развітацца з асабістым шчасцем: ніва будзе бясплоднай, гаспадарка прыйдзе ў заняпад, у сям'і пачнуцца сваркі і хваробы.

● Шматлікія рытуальныя дзеянні і прыкметы, звязаныя з жоравам, супадалі з дзеяннямі ў дачыненні да бусла. Так, на Палессі ранняй вясной, калі вы бачылі першага жорава, неабходна было «пакачацца» па полі, каб на працягу года не было болю ў спіне.

● Лічылі, што на тым полі, куды села шмат жораваў, будзе добры ўраджай.

● Па палёце жораваў прадказвалі надвор'е:
— жоравы ляцяць высока — да дажджу;
— жораў заляцеў у вёску — чакай непагадзі, буры;
— калі жоравы ў час адлёту на поўдзень ляцяць высока, не спяшаючыся, «перагаворваюцца», — будзе ціхая добрая восень.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Крымінальная хроніка свету жывёл.

Учора з Паўднёвага ўзбярэжжа Ціхага акіяна ў наш лес прыехала група чарапах і са сваімі пытаннямі «Скажыце, колькі нам засталося жыць?» пачала тэрарызаваць зязюль.

☺

Самы страшны кашмар: зрабіць бутэрброды, наліць чай, прынесці ўсё гэта ў ложак, загарнуцца ў коўдру і забыцца пульт ад тэлевізара...

☺

— Жонка-а-а, прыязджай — сэксам на працоўным стале зоймемся...

— У цябе ж там сакратарка!

— А што — можна?!

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 4736. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12